# СЛУЖБОЎНІК

# СЛУЖБОЎНІК

Менск
2004

По благославенні царкоўных уладаў

# ЧЫН СЬВЯТОЙ І БОСКАЙ ЛІТУРГІІ

## Пачатковыя малітвы і апрананьне

Увайшоўшы ў царкву і стаўшы перад райскімі дзьвярамі, сьвятар і дыякан робяць тры паклоны.

Дыякан: Блаславі, ойча.

Сьвятар: Блаславёны Бог наш на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Дыякан: Амін. Слава Табе, Божа наш, слава Табе.

Уладару нябесны, Суцяшальніку, Духу праўды, Ты ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра і жыцьця Падаўча, прыйдзі і пасяліся ў нас, і ачысьці нас ад усяго благога, і збаў, Добры, душы нашы.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, зжалься над намі. (Тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Усесьвятая Тройца, зжалься над намі: Госпадзе, ачысьці грахі нашы; Уладару, даруй бясчынствы нашы; Сьвяты, наведай і аздараві немачы нашы дзеля Твайго імя.

Госпадзе, зьмілуйся. (Тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

Сьвятар: Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Дыякан: Амін.

Разам кажуць наступныя малітвы:

Зжалься над намі, Госпадзе, зжалься над намі: ня могучы даць ніякага адказу, мы, грэшныя, вось гэтую малітву Табе, Уладару нашаму, прыносім: зжалься над намі.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Госпадзе, зжалься над намі, бо на Цябе спадзяемся: Ня гневайся на нас вельмі і ня будзь памятлівы нашых бясчынстваў, але глянь ласкава на нас і выбаў нас ад ворагаў нашых, бо Ты Бог наш, і мы, людзі Твае і творы рук Тваіх, імя Тваё клічам.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Зьмілаваньня дзьверы адчыні нам, блаславёная Багародзіца: хай мы, якія спадзяемся на Цябе, ня згінем, але выбавімся Табою ад бедаў, бо Ты – збаўленьне роду хрысьціянскага.

Падыходзяць да іконы Хрыста і, схіліўшы галовы, кажуць:

Усячыстаму вобразу Твайму пакланяемся, Добры, просячы даравання правінаў нашых, Хрысьце Божа, бо Ты захацеў дабравольна целам узысьці на крыж, каб вызваліць стварэньні Твае з варожае няволі. Дзеля гэтага мы з удзячнасьцю ўсклікаем Табе: Ты напоўніў радасьцю ўсё, Збавіцелю наш, прыйшоўшы збавіць сьвет.

Цалуюць ікону Хрыста. У падобны спосаб падыходзяць да іконы Багародзіцы, кажучы:

Крыніца міласэрнасьці, Багародзіца, зрабі нас годнымі спагады Твае: глянь міласьціва на людзей, што зграшылі, і пакажы, як заўсёды, сілу Тваю, бо мы, на цябе спадзеючыся, “Радуйся!” усклікаем Табе, як некалі Габрыэль, анёлаў начальнік.

Стаўшы перад райскімі дзьвярамі са схіленай галавой, сьвятар кажа:

Госпадзе, працягні руку Тваю з вышыні сьвятога жыльля Твайго і ўмацуй мяне на Тваю службу, што мае неўзабаве пачацца, каб я мог без асуджэньня стаць перад Тваім страшным пасадам і прынесьці бяскроўную ахвяру. Бо Твая ёсьць сіла і слава на вякі вякоў. Амін.

Уваходзяць у алтар, кажучы:

Увайду ў дом Твой, пакланюся сьвятыні Тваёй у страху перад Табою.

Госпадзе, у справядлівасьці Тваёй будзь мне правадыром, насуперак ворагам маім выраўняй шлях перада мною.

Бо ў вуснах іх няма шчырасьці, сэрцы іх пустыя, горлы іх – магілы адкрытыя, языкі іх ліслівыя.

Судзі іх, Божа, хай абернуцца ў нішто намеры іх, дзеля безьлічы брасчынстваў іх адкінь іх, бо яны паўсталі супраць Цябе.

Хай узрадуюцца ўсе, што спадзяюцца на Цябе, хай цешацца давеку; ахоўвай іх.

І хай цешацца з Табою тыя, што любяць імя Тваё.

Бо Ты, Госпадзе, бласлаўляеш праведніка: быццам шчытом, пакрываеш яго. (Пс 5: 8-13)

Стаўшы перад ахвярнікам, робяць тры паклоны і цалуюць Евангельле, ахвярнік і настольны крыж. Пасьля, адышоўшы, пачынаюць апранацца.

Узяўшы ў левую руку кожны стыхар свой, робяць тры паклоны на ўсход, кажучы за кожным разам:

Божа, будзь спагадлівы мне, грэшнаму.

Дыякан падыходзіць да сьвятара, кажучы:

Блаславі, ойча, стыхар і арар.

Сьвятар бласлаўляе:

Блаславёны Бог наш на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на векі вякоў. Амін.

Дыякан накладае стыхар, молячыся:

Душа мая радуецца ў Госпадзе, бо Ён апрануў мяне ў вопратку справядлівасьці і адзеньнем радасьці ахінуў мяне: быццам на жаніха, усклаў на мяне вянец і, быццам нявесту, упрыгожыў мяне красою. (Іс 61: 10)

Таксама ўскладае арар, пацалаваўшы яго. Калі надзявае нарукаўнік на правую руку, кажа:

Правая рука Твая, Госпадзе, уславілася сілаю; правая рука Твая, Госпадзе, перамагла ворагаў, і веліччу славы Тваёй Ты зьнішчыў праціўнікаў. (Вых 15: 6-7)

Надзяваючы нарукаўнік на левую руку, кажа:

Рукі Твае стварылі мяне і далі мне выгляд: дай мне разуменьне, каб я мог навучацца Тваіх запаветаў. (Пс 118: 73)

Апрануўшыся, адыходзіць да прыгатавальніка і рыхтуе ўсё патрэбнае да праскаміды.

Сьвятар у міжчасе, благаславіўшы свой стыхар, як вышэй, і пацалаваўшы, надзявае яго, кажучы:

Душа мая радуецца ў Госпадзе, бо Ён апрануў мяне ў вопратку справядлівасьці і адзеньнем радасьці ахінуў мяне; быццам на жаніха, усклаў на мяне вянец і, быццам нявесту, упрыгожыў мяне красою. (Іс 61: 10)

Бярэ па парадку часткі сьвятой вопраткі, бласлаўляе кожную з іх і надзявае, гаворачы адпаведную малітву.
Надзяваючы эпітрахіль, кажа:

Благаславёны Бог, які ўзьлівае на сьвятароў ласку сваю, быццам алей духмяны, што, узьліты на

галаву Аарона, сплывае па барадзе аж да краёў вопраткі яго. (Пс 132: 2)

Апярэзваецца поясам, молячыся:

Благаславёны Бог, які апярэзвае мяне сілаю і робіць шлях мой беззаганным і ногі мае моцнымі, быццам ногі аленя, і на вышынях умацоўвае мяне. (Пс 17: 33-34)

Надзявае нарукаўнік на правую руку, кажучы:

Правая рука Твая, Госпадзе, уславілася сілаю; правая рука Твая, Госпадзе, перамагла ворагаў, і веліччу славы Тваёй Ты зьнішчыў праціўнікаў. (Вых 15: 6-7)

Надзявае нарукаўнік на левую руку, кажучы:

Рукі Твае стварылі мяне і далі мне выгляд: дай мне разуменьне, каб я мог навучацца Тваіх запаветаў. (Пс 118: 73)

Калі мае права насіць набедранік, надзявае яго, молячыся:

У прыгажосьці і дабрыні Тваёй, Магутны, прывяжы меч Твой да сьцягна Твайго, нацягні лук Твой і ідзі наперад пераможна дзеля праўды, набожнасьці і справядлівасьці, і дзіўныя рэчы зьдзейсьніць правая рука Твая цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін. (Пс 44: 4-5)

Апранае фелон, кажучы:

Сьвятары Твае апрануцца ў справядлівасьць, і сьвятыя Твае ў радасьці жыць будуць праз усе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін. (Пс 131: 9)

Апрануўшыся, сьвятар мые рукі, кажучы:

Памыю ў нявіннасьці рукі мае і абыду кругом ахвярнік Твой, голасна абвяшчаючы хвалу Тваю і расказваючы пра ўсе цуды Твае. Госпадзе, я палюбіў дом Твой і месца славы Тваёй. Не загубі душы маёй разам з грэшнікамі, і жыцьця майго з людзьмі крыві, у чыіх руках злачынствы, і чыя правая рука поўная хабару. Я ж жыву ў чысьціні, дык збаў мяне і зьмілуйся нада мною. Нага мая стаіць на справядлівым шляху. На зборах людзей буду славіць Госпада. (Пс 25: 6-12)

## Абрад прыгатаваньня (праскамідыя)

Сьвятар і дыякан, стаўшы перад прыгатавальнікам, робяць тры паклоны, кажучы за кожным разам:

Божа, будзь спагадлівы мне, грэшнаму, і зьмілуйся нада мною.

І далей:

Ты выкупіў мяне ад праклёну законнага Тваёй пачэснай крывёю; даўшы сябе прыбіць да крыжа і кап'ём пракалоць, Ты стаўся крыніцаю несьмяротнасьці для людзей. Збавіцелю наш, слава Табе.

Дыякан: Блаславі, ойча.

Сьвятар: Блаславёны Бог наш на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Дыякан: Амін.

Сьвятар бярэ ў левую руку хлеб, а ў правую – кап'ё і, робячы тройчы кап'ём знак крыжа над хлебам, гаворыць за кожным разам:

На ўспамін Госпада, Бога і Збавіцеля нашага Ісуса Хрыста.

І пачынае прыгатаўляць Сьвяты Агнец. Рэжа па правым баку пячаці, кажучы:

Быццам авечку на зарэз, вядуць Яго. (Іс 53: 7)

Тады па левым баку, кажучы:

І як бязьвіннае ягнё, нямое перад тым, хто стрыжэ яго, так і Ён не адчыняе вуснаў сваіх. (Іс 53: 7)

Рэжучы згары пячаць, кажа:

У паніжэньні Ягоным суд над Ім адбыўся. (Іс 53: 8)

Рэжучы зьнізу, кажа:

Хто назаве род Ягоны. (Іс 53: 8)

Дыякан за кожным разам кажа:

Госпаду памолімся.

Калі сьвятар скончыць выразаць Сьвяты Агнец:

Вазьмі, ойча.

Сьвятар вымае Агнец, кладзе яго на дыскас пячацьцю ўніз і кажа:

Жыцьцё ягонае было ўзятае ад зямлі. (Іс 53: 8)

Дыякан: Прынясі ахвяру, ойча.

Сьвятар разразае накрыж Агнец, кажучы:

Агнец Божы, які ўзяў на Сябе грахі сьвету, прыносіцца ў ахвяру за жыцьцё і збаўленьне сьвету.

Дыякан: Пракалі, ойча.

Сьвятар паварочвае Сьвяты Агнец пячацьцю ўгору і пракалвае кап'ём правы бок, кажучы:

Адзін з жаўнераў прабіў Яму кап'ём бок, і адразу пацякла кроў і вада. І той, хто бачыў, Адзін з жаўнераў прабіў Яму кап'ём бок, і адразу пацякла кроў і вада. І той, хто бачыў, пасьведчыў, і сьведчаньне яго праўдзівае. (Ян 19: 34)

Дыякан бярэ віно і ваду, кажучы:

Благаславі, ойча, сьвятое зьяднаньне.

Атрымаўшы блаславеньне, улівае віно і ваду ў чашу. Калі няма дыякана, сьвятар робіць гэта сам.

Сьвятар бярэ другі хлеб, выразае з яго частку ў выглядзе трохкутніка і кажа:

У гонар і на памяць найблаславёнае Ўладаркі нашае Багародзіцы і заўсёды Дзевы Марыі; малітвамі Яе прымі, Госпадзе, гэтую ахвяру на Твой нябесны ахвярнік.

Кладзе частку з правага боку Агнца, кажучы:

Па правай руцэ стала каралева, у пазалочаную вопратку апранутая, упрыгожаная. (Пс 44: 10)






Бярэ трэці хлеб, выразае з яго часткі і кладзе іх з левага боку, робячы за кожным разам адпаведны ўспамін:

1. У гонар і на памяць вялікіх анёльскіх начальнікаў Міхала і Габрыэля, і ўсіх нябесных бесьцялесных сілаў.

2. Сьвятога слаўнага прарока, Прадвесьніка і Хрысьціцеля Яна; сьвятых слаўных прарокаў Майсея і Аарона, Ільлі і Елісея, Давіда і Ясея, сьвятых трох юнакоў і Данілы прарока, і ўсіх сьвятых прарокаў.

3. Сьвятых слаўных і годных пахвалы апосталаў Пятра і Паўла, і ўсіх сьвятых апосталаў.

4. Між сьвятымі айцоў нашых вялікіх сьвятаначальнікаў і сусьветных настаўнікаў Базыля Вялікага, Рыгора Багаслова, Яна Залатавуснага, Апанаса і Кірылы Александрыйскіх, Міколы Мірлікійскага, настаўнікаў славянскіх Кірылы і Мятода, Кірылы Тураўскага і ўсіх сьвятых сьвятаначальнікаў.

5. Сьвятога апостала, першага мучаніка і дыякана Сьцяпана; сьвятых вялікіх мучанікаў Зьмітра, Юра, Тодара Тырона, Мяркура Смаленскага і ўсіх сьвятых мучанікаў.

6. Сьвятых і баганосных айцоў нашых Антона, Аўхіма, Савы, Анупрэя, Антона і Хвядоса Кіевапячэрскіх, Аўрама Смаленскага, Мартына Тураўскага і ўсіх сьвятых айцоў; і сьвятое маці нашае Еўфрасіньні Полацкае і ўсіх сьвятых жанчынаў.

7. Сьвятых бескарысных лекараў і цудатворцаў Кузьмы і Дзям’яна, Кіра і Яна, Панцеляймона і Ермалая, і ўсіх сьвятых бескарысных лекараў.

8. Сьвятых і праведных богаайцоў Якіма і Ганны, сьвятога (сьвятой)… (імя сьвятога патрона царквы); сьвятога (сьвятой)… (імя сьвятога або сьвятой, памяць якіх сьвяткуецца ў гэты дзень); і ўсіх сьвятых, малітвамі якіх наведай нас, Божа.

9. Між сьвятых айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага.

Або, калі Літургія сьв. Базыля: Між сьвятых айца нашага Базыля Вялікага, арцыбіскупа Кесарыі Кападакійскай.

Бярэ чацьвёрты хлеб, выразае з яго часткі і кладзе іх у рад пад Агнцам, успамінаючы жывых. Выразаючы першую частку, кажа:

Успомні, чалавекалюбны Ўладару, Сьвятога Айца нашага сусьветнага Біскупа… (імя) Папу Рымскага; дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага… (імя) і ўсіх прававерных біскупаў, пачэсных сьвятароў, дыяканаў у Хрысьце і ўсё духавенства; і братоў нашых сьвятароў і дыяканаў, якія служаць тут з намі; і ўсіх братоў нашых, якіх Ты, усядобры Ўладару, у вялікай міласэрнасьці Тваёй паклікаў да еднасьці з Табою.

Пасьля ўспамінае па імю жывых, каго хоча, кладучы за кожным разам частку хлеба і кажучы:

Успомні, Госпадзе… (імя таго, каго ўспамінае)

Скончыўшы ўспамінаць жывых, сьвятар бярэ пяты хлеб, выразае з яго частку і кладзе яе ўніз, пачынаючы новы рад і кажучы:

На ўспамін і адпушчэньне грахоў годных памяці заснавальнікаў гэтай сьвятой царквы.

Пасьля выразае іншыя часткі і кладзе іх у рад, успамінаючы біскупа, ад якога атрымаў сьвятарства, а таксама іншых памерлых, каго хоча, паіменна, кажучы за кожным разам:

Успомні, Госпадзе… (імя таго, каго ўспамінае)

Апошнюю частку кладзе, кажучы:

І ўсіх, у надзеі ўваскрасеньня, жыцьця вечнага і еднасьці з Табою заснулых, айцоў, братоў і сёстраў нашых, Чалавекалюбны Уладару.

У канцы выразае адну частку для сябе і кладзе, кажучы:

Успомні, Госпадзе, і маю недастойнасьць, і прабач мне мае правіны вольныя і міжвольныя.

Дыякан бярэ кадзіла і кажа:

Блаславі, ойча, кадзіла. Госпаду памолімся.

Сьвятар (у адсутнасьці дыякана, бярэ кадзіла сам і блаславяе):

Кадзіла Табе прыносім, Хрысьце Божа, як адмысловую духмянасьць духоўную; Ты ж, прыняўшы яго на Твой нябесны ахвярнік, пашлі нам узамен ласку Твайго Сьвятога Духа.

Дыякан: Госпаду памолімся.

Сьвятар бярэ зорку і, пакадзіўшы яе, ставіць паверх дыскаса, кажучы:

І зорка, прыйшоўшы, стала ўгары над месцам, дзе было Дзіцятка. (Мц 2: 9)

Дыякан: Госпаду памолімся.

Сьвятар бярэ першы пакравец, кадзіць яго і пакрывае ім дыскас, кажучы:

Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу; апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся. Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца. Пасад Твой непахісны ад пачатку сьвету, Ты ж вечна існуеш. Узьнімаюцца рэкі, Госпадзе, узьнімаюць рэкі голас свой; узьнімаюць рэкі голас грамавы; Госпад на вышынях мацнейшы за рокат водаў вялікіх, больш магутны за хвалі марскія. Сьведчаньні Твае праўдзівыя, Госпадзе: дому Твайму належыцца сьвятасьць праз усе дні. (Пс 92)

Бярэ другі пакравец і, пакадзіўшы, пакрывае чашу:

Дабрыня Твая, Госпадзе, пакрыла нябёсы, і зямля поўная хвалы Тваёй.

Дыякан: Госпаду памолімся.

Сьвятар бярэ вялікі пакравец (г. зв. паветра), кадзіць, пакрывае дыскас і чашу разам, кажучы:

Пакрый нас покрывам крылаў Тваіх, адгані ад нас усякага ворага і непрыяцеля, зрабі спакойным наша жыцьцё; Госпадзе, зьлітуйся над намі і збаў душы нашы, бо Ты добры і Чалавекалюбец.

Кадзіць ахвяраваныя дары, кажучы тройчы:

Благаславёны Ты, Божа наш, што такая была Твая добрая воля; славе Табе.

Дыякан за кожным разам адказвае:

На ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Пасьля:

За прынесеныя пачэсныя дары Госпаду намолімся.

Сьвятар: Божа, Божа наш, Ты, што паслаў Хлеб нябесны, спажыву ўсяму сьвету, Госпада і Бога нашага Ісуса Хрыста, Адкупіцеля, Збаўцу і Дабрачынца нашага, які бласлаўляе і асьвячае нас: блаславі гэтыя прынесеныя дары (бласлаўляе) і прымі іх на Твой нябесны ахвярнік. Успомні, як Добры і Чалавекалюбны, тых, што іх прынеслі і за каго яны прыносяцца; і нас захавай бездакорнымі ў выкананьні Тваіх Боскіх тайнаў. Бо Тваё пачэснае і велічнае імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, поўнае сьвятасьці і славы цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Слава Табе, Хрысьце Божа наш, надзея наша, слава Табе.

Дыякан: Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін. Госпадзе зьмілуйся; Госпадзе зьмілуйся; Госпадзе зьмілуйся. Ойча, блаславі.

Сьвятар: Хрыстос, праўдзівы Бог наш (у нядзелю: што ўваскрос з мёртвых), малітвамі Найчыстае свае Маці, між сьвятымі Айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага (або: Базыля Вялікага, арцыбіскупа Кесарыі Кападакійскай) і ўсіх сьвятых хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

Дыякан: Амін.

Бярэ кадзільніцу і кадзіць прынесеныя дары, ахвярнік і ўсю царкву, молячыся ціха:

У магіле целам, у пекле з душою як Бог, у раі з разбойнікам, і на пасадзе разам з Айцом і Духам Ты быў, Хрысьце: Ты ўсё напаўняеш, Неабдымны.

Таксама Псалом 50:

Зьмілуйся нада мною, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці і паводле мноства дабротаў Тваіх адымі беззаконьне маё. Асабліва абмый мяне з віны маёй і ад грахоў маіх ачысьці мяне. Бо беззаконьне маё я знаю, і грэх мой заўжды перада мною. Табе адзінаму я зграшыў і зло перад Табою ўчыніў. Ты ж справядлівы ў Тваім прыгаворы і правы ў судзе Тваім. Вось я быў зачаты ў беззаконьні, і ў граху нарадзіла мяне маці мая. Але Ты, які любіш шчырасьць сэрца, паказаў мне глыбіню і тайны мудрасьці Тваёй. Акрапі мяне гісопам, і ачышчуся, абмый мяне, і стану бялейшым за сьнег. Дай мне пачуць голас радасьці і вясельля: хай узрадуюцца ўпакораныя косьці. Адвярні твар Твой ад маіх бясчынстваў і ачысьці мяне ад усіх грахоў маіх. Сэрца чыстае ствары ўва мне, Божа, і дух праўды абнаві ў нутры маім. Не адкінь мяне ад Твайго аблічча і Духа Твайго Сьвятога не адымі ад мяне. Вярні мне радасьць Твайго збаўленьня і ўмацуй ува мне дух ахвярнасьці. Буду навучаць грэшнікаў шляхоў Тваіх, і грэшнікі зноў вернуцца да Цябе. Вызвалі мяне ад крыві (пралітай), Божа, Божа майго збаўленьня, хай язык мой у радасьці славіць Тваю справядлівасьць. Адчыні мае

вусны, Госпадзе, і вусны мае пачнуць абвяшчаць хвалу Тваю. Калі б Ты захацеў ахвяры, я даў бы яе: на цэлапаленьні, аднак, Ты не глядзіш прыхільна. Ахвяра Богу – дух скрушлівы: сэрцам пакорным і поўным скрухі Ты, Божа, не пагардзіш. Пакажы, Госпадзе, з ласкі Тваёй спагаду Сыёну: хай муры Ерусаліму будуць зноў узьнесеныя. Тады глянеш прыхільна на правыя ахвяры, дары і цэлапаленьні, тады ўскладуць цялят на Твой ахвярнік.

Сьвятар і дыякан, калі скончыцца каджэньне, стаўшы перад ахвярнікам, кажуць:

Уладару нябесны, Суцяшальніку, Духу праўды, Ты ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра і жыцьця Падаўча, прыйдзі і пасяліся ў нас, і ачысьці нас ад усяго благога, і збаў, Добры, душы нашы.

Слава на вышынях Богу, супакой на зямлі, добрая воля сярод людзей. (Двойчы з паклонамі)

Госпадзе, адчыні мае вусны, і мае вусны пачнуць абвяшчаць хвалу Тваю. (Аднойчы з паклонам)

Сьвятар цалуе Евангельле і ахвярнік, дыякан – ахвярнік.

Пасьля дыякан, схіліўшы галаву ў бок сьвятара і трымаючы арар трыма пальцамі правай рукі, кажа:

Ужо час пачаць службу Госпаду. Ойча, благаславі.

Сьвятар: Блаславёны Бог наш на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Дыякан: Памаліся за мяне, ойча сьвяты.

Сьвятар: Хай Госпад кіруе крокамі тваімі.

Дыякан: Успомні мяне, ойча сьвяты.

Сьвятар: Хай успомніць цябе Госпад Бог у валадарстве сваім на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. (Бласлаўляе дыякана)

Дыякан: Амін.

Выходзіць паўночнымі дзьвярыма і, стаўшы на звычайным месцы, робіць тры паклоны, кажучы ціха за кожным разам:

Госпадзе, адчыні мае вусны, і мае вусны пачнуць абвяшчаць хвалу Тваю.

Тады, узьняўшы правай рукой канец арара, пачынае:

Блаславі, ойча…

# БОСКАЯ ЛІТУРГІЯ МІЖ СЬВЯТЫМІ АЙЦА НАШАГА ЯНА ЗАЛАТАВУСНАГА

Дыякан: Блаславі, ойча.

Сьвятар робіць Евангельлем знак крыжа над ахвярнікам і кажа:

Блаславёнае валадарства Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: У супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: За супакой з вышыняў і збаўленьне душ нашых Госпаду памолімся.

За супакой на ўсім сьвеце, добры стан сьвятых Божых цэркваў і зьяднаньне ўсіх Госпаду памолімся.

За гэтую сьвятую царкву і тых, што з вераю, пашанаю і страхам Божым уваходзяць у яе, Госпаду памолімся.

За Сьвятога Айца нашага Сусьветнага біскупа … (імя) Папу Рымскага, дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага … (імя), пачэсных сьвятароў, дыяканаў у Хрысьце, усё духавенства і людзей Госпаду памолімся.

За яго (яе) міласьць … (імя галавы дзяржавы), за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны, Госпаду памолімся.

За Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас Госпаду памолімся.

За гэты горад (гэтую вёску), за ўсе гарады і краіны, і за верных людзей, што жывуць у іх, Госпаду памолімся.

За добрае надвор'е, багаты ўраджай пладоў зямных і за часы спакойныя Госпаду памолімся.

За падарожнікаў па моры, зямлі і ў паветры, за нядужых, тых што церпяць, за зьняволеных і збаўленьне іх Госпаду памолімся.

---

Калі ёсьць успамінаньне памерлых, на гэтым месцы можна дадаць адмысловыя прашэньні:

Калі служба агульная за памерлых:

За душы ўсіх адвеку ў праўдзівай веры, надзеі ўваскрасеньня і жыцьця вечнага памерлых айцоў, братоў і сёстраў нашых, за заснавальнікаў і дабрачынцаў гэтай сьвятой царквы, за бацькоў і родных, што тут і на кожным іншым месцы спачываюць, і за іх вечны супакой, Госпаду памолімся.

Каб ім стаць без асуджэньня на страшным судзе Хрыстовым, і каб душы іх знайшлі прытулак у сьвеце жывых, дзе ўсе сьвятыя спачываюць, Госпаду памолімся.

Калі служба за менаваных асобаў:

За слугу Божага (Божую, або слугаў Божых)… (імя або імёны), за блаславёны супакой яго (яе, іх), і каб яму (ёй, ім) былі прабачаныя ўсе правіны вольныя і міжвольныя, Госпаду памолімся.

Каб яму (ёй, ім) стаць без асуджэньня на страшным судзе Хрыстовым, і каб душа яго (яе, душы іх) знайшла (знайшлі) прытулак у сьвеце жывых,

у месцы сьветлым і радасным, дзе ўсе сьвятыя спачываюць, Госпаду памолімся.

---

Каб нам выбавіцца ад усякага гневу, суму і недастатку Госпаду памолімся.

Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (моліцца ціха): Госпадзе Божа наш, моц Твая невыказная, слава Твая невымерная, міласэрнасьць Твая бязьмежная, чалавекалюбства Тваё невымоўнае: у дабрыні Тваёй глянь, Уладару, на нас і на гэтую сьвятую царкву і даруй нам і тым, што моляцца разам з намі, багацьце Тваёй ласкі і спагады.

Уголас: Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

І сьпяваюць першы антыфан, які мяняецца ў залежнасьці ад дня і сьвята.

---

У нядзелі сьпяваецца наступны (Вялікодны) антыфан (Пс 65):

Чытальнік: Сьпявайце Госпаду, уся зямля! Слаўце ў песьнях імя Яго, аддайце хвалу велічы Яго.

Людзі: Малітвамі Багародзіцы, Збавіцелю, збаў нас. (Так пасьля наступных вершаў)

Скажыце Госпаду: якія цудоўныя творы Твае! Дзеля велічы магутнасьці Тваёй дрыжаць перад Табою ворагі Твае.

Уся зямля хай пакланяецца Табе і пяе Табе, хай славіць у песьнях імя Тваё, Усявышні!

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Дзе ёсьць звычай, у нядзелю, а таксама ў суботу і на вялікія сьвяты (апрача сьвятаў Гасподніх) сьпяваюцца наступныя радкі з Пс 102:

Блаславі, душа мая, Госпада: благаславёны Ты, Госпадзе. Блаславі, душа мая, Госпада, і ўсё нутро маё хай славіць імя сьвятое Яго. Блаславі, душа мая, Госпада і не забывай усіх дабрадзействаў Яго. Ён ачышчае ўсе бясчынствы Твае і аздараўляе ўсе немачы твае. Шчодры Бог і міласэрны, доўгацярплівы і багаты на ласку. Блаславі, душа мая, Госпада, і ўсё нутро маё хай славіць імя сьвятое Яго. Блаславёны Ты, Госпадзе.

У буднія дні сьпяваецца наступны антыфан (Пс 91):

Чытальнік: Добра ёсьць славіць Госпада і пяяць хвалу імю Твайму, Усявышні.

Людзі: Малітвамі Багародзіцы, Збавіцелю, збаў нас. (Так пасьля наступных вершаў)

Абвяшчаць раніцай міласэрнасьць Тваю і праўду Тваю ўночы.

Бо Госпад Бог наш справядлівы, і няма няправеднасьці ў Ім.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

---

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Божа наш, збаў людзей Тваіх і блаславі набытак Твой, захавай у цэласьці Царкву Тваю, асьвяці тых, што любяць красу дому Твайго: Ты іх услаў Тваёю Боскаю сілаю і не пакінь нас, якія спадзяемся на Цябе.

Уголас: Бо Твая ёсьць дзяржава і Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

## І сьпяваюць другі антыфан.

---

У нядзелі (Пс 66):

Чытальнік: Божа, будзь ласкавы да нас і блаславі нас: прасьвятлі нас зьзяньнем твару Твайго і зьмілуйся над намі.

Людзі: Сыне Божы, што ўваскрос з мёртвых, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя. (Так пасьля наступных вершаў)

Каб мы маглі пазнаць на зямлі шлях Твой, сярод людзей усіх збаўленьне Тваё.

Хай славяць Цябе, Божа, усе народы, хай славяць Цябе ўсе людзі.

Людзі: Сыне Божы...

Слава… цяпер… Адзінародны Сыне… (Гл. ніжэй)

Іншы антыфан нядзельны і сьвяточны (Пс 145):

Хвалі, душа мая, Госпада. Праз усё жыцьцё маё буду хваліць Госпада, буду ў песьнях славіць Бога майго, пакуль буду жыць.

Слава… цяпер… Адзінародны Сыне… (Гл. ніжэй)

Антыфан у буднія дні (Пс 92):

Чытальнік: Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу, апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся.

Людзі: Малітвамі сьвятых Тваіх, Збавіцелю, збаў нас. (Так пасьля наступных вершаў)

Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца.

Сьведчаньні Твае праўдзівыя; сьвятасьць належыцца дому Твайму, Госпадзе, праз усе дні.

Людзі: Малітвамі сьвятых Тваіх…

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Адзінародны Сыне і Слова Бога, Ты, Несьмяротны, дзеля нашага збаўленьня захацеў прыняць цела ад сьвятое Багародзіцы і заўсёды Дзевы Марыі і, не зазнаўшы зьмены, стаўся чалавекам; Ты быў укрыжаваны, Хрысьце Божа, сьмерцю зьнішчыўшы сьмерць. Будучы адным з Сьвятой Тройцы, роўным славаю Айцу і Сьвятому Духу, збаў нас.

---

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Уладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Божа, які даў нам ласку прыносіць Табе ў еднасьці гэтыя супольныя малітвы і які абяцаў выканаць просьбы двух ці трох, што сабраліся ў Тваё імя, выканай просьбы слугаў Тваіх для нашага дабра, даючы нам у гэтым веку пазнаньне Тваёй праўды, а ў будучым даруючы жыцьцё вечнае.

Уголас: Бо Ты добры і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

І сьпяваюць трэці антыфан.

Антыфан нядзельны і штодзённы (Пс 94):

Чытальнік: Прыйдзіце, будзем радасна славіць Госпада, будзем пяяць Богу Збавіцелю нашаму.

Людзі:

У нядзелі: Сыне Божы, што ўваскрос з мёртвых, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Або нядзельны трапар належнага тону

У іншыя дні: Сыне Божы, дзіўны ў сьвятых Тваіх, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Чытальнік: Станем з удзячнасьцю перад абліччам Ягоным, у песьнях уславім Яго.

Госпад – Бог вялікі і Ўладар магутны над усёй зямлёй.

У руках Ягоных усе канцы зямлі і вышыні гор належаць Яму.

Ягонае мора – Ён стварыў яго, і сушы рукі Ягоныя далі выгляд.

Людзі: Сыне Божы…

Іншы антыфан сьвяточны і нядзельны (Мц 5:3-12):

У валадарстве Тваім успомні нас, Госпадзе.

Шчасьлівыя ўбогія духам, бо іх ёсьць валадарства нябеснае.

Шчасьлівыя тыя, што тужаць, бо яны суцешацца.

Шчасьлівыя ціхія, бо яны атрымаюць у спадчыну зямлю.

Шчасьлівыя тыя, што маюць голад і смагу справядлівасьці, бо яны насыцяцца.

Шчасьлівыя міласэрныя, бо яны зьведаюць міласьць.

Шчасьлівыя чыстыя сэрцам, бо яны ўбачаць Бога.

Шчасьлівыя міратворцы, бо яны будуць звацца сынамі Божымі.

Шчасьлівыя тыя, каго прасьледуюць за праўду, бо іх ёсьць валадарства нябеснае.

Шчасьлівыя вы, калі вас крыўдзяць і прасьледуюць, і кажуць усякую няпраўду на вас дзеля мяне: радуйцеся і цешцеся, бо ўзнагарода ваша ў небе вялікая.

---

Падчас сьпеву трэцяга антыфану сьвятар і дыякан робяць тры паклоны. Сьвятар дае дыякану Евангельле (або, калі няма дыякана, сам бярэ яго), і

яны разам выходзяць паўночнымі дзьвярамі з алтара. Стаўшы перад райскімі дзьвярамі, яны ціха кажуць:

Дыякан: Госпаду памолімся.

Сьвятар: Усяўладны Божа наш, які ўстанавіў у небе чыны і хоры анёлаў і арханёлаў дзеля служэньня Тваёй славе, зрабі, каб гэты наш уваход быў таксама ўваходам сьвятых анёлаў, і каб яны разам з намі служылі Табе і славілі Тваю дабрыню. Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Дыякан: Блаславі, ойча, сьвяты ўваход.

Сьвятар (блаславуляе): Блаславёны ўваход сьвятых Тваіх на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Дыякан: Амін.

Узьняўшы ўгору Евангельле, кажа голасна:

Мудрасьць, устаньце!

Сьвятар з дыяканам уваходзяць у алтар, а людзі пяюць уваходны верш:

Прыйдзіце, паклонімся і прыпадзем да Хрыста.

У нядзелі: Сыне Божы, што ўваскрос з мёртвых, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя

У іншыя дні тыдня: Сыне Божы, дзіўны ў сьвятых Тваіх, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

І адразу пяюць трапары і кандакі, г.зн. песьні ў гонар сьвята, сьвятога дня, патронаў царквы і г.д. Звычайна сьпеў заканчваецца кандаком у гонар Багародзіцы. Найчасьцей пяецца наступны кандак:

(Тон 6) Апякунка хрысьціян бездакорная, Хадайніца да Тварца незаменная, не пагардзі маленьнямі грэшнікаў, але, як добрая, сьпешна прыйдзі на падмогу нам, якія клічам Цябе даверліва. Пачуй хутка малітвы, адгукніся на просьбы, Багародзіца, надзейная Заступніца тых, што шануюць Цябе.

Сьвятар (у міжчасе моліцца ціха): Сьвяты Божа, які спачываеш сярод сьвятых, якога тройчы сьвятымі галасамі хваляць сэрафімы і славяць хэрувімы, якому пакланяюцца ўсе нябесныя сілы: Ты прывёў усё з нябыту да

быцьця, стварыў чалавека на Тваё падабенства і ўпрыгожыў яго ўсякімі Тваімі дарамі; Ты даеш таму, хто просіць, мудрасьць і розум, і не пагарджаеш грэшнікам, але ўстанаўляеш пакуту для збаўленьня; Ты ўдастоіў нас, Тваіх пакорных і нягодных слугаў, у гэтую хвіліну стаць перад славаю Твайго ахвярніка і прыносіць належнае Табе пакланеньне і ўсхваленьне. Прымі, Уладару, з нашых грэшных вуснаў тройчы сьвятую песьню і глянь на нас ласкава; даруй нам нашы правіны, сьвядомыя і несьвядомыя, асьвяці нашы душы і целы і дай, каб мы маглі набожна служыць Табе праз усе дні жыцьця нашага, дзякуючы малітвам сьвятое Багародзіцы і ўсіх сьвятых, якія ад пачатку сьвету Табе дагадзілі.

Дыякан: Блаславі, ойча, час трысьвятога.

Сьвятар (уголас): Бо Ты сьвяты, Божа наш, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды.

Дыякан (павярнуўшыся да людзей) : І на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

І сьпяваюць “Трысьвятое”:

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, зжалься над намі. (Тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Сьвяты Несьмяротны, зжалься над намі.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, зжалься над намі.

У некаторыя Гасподнія сьвяты замест “Трысьвятога” сьпяваюцца іншыя песьні.

Сьвятар і дыякан гавораць “Трысьвятое” разам з людзьмі. Пад канец дыякан кажа:

Загадай, ойча.

Сьвятар: Бласлаўлёны Той, хто прыходзіць у імя Гасподняе.

Дыякан: Блаславі, ойча, горнае месца.

Сьвятар (бласлаўляе): Блаславёны Ты на пасадзе валадарства Твайго, што сядзіш на хэрувімах, спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Ідзе на горнае месца, затрымаўшыся збоку ад яго. Калі сканчаюць пяяць “Трысьвятое”, дыякан кажа ўголас:

Будзьма ўважлівыя.

Сьвятар: Мір усім! (Бласлаўляе людзей)

Чытальнік: І твайму духу.

Дыякан: Мудрасьць.

Чытальнік чытае пракімен (выбраныя вершы з псалмаў).

Дыякан: Мудрасьць.

Чытальнік: Чытаньне… (Аб’яўляе назву Апостальскага чытаньня)

Дыякан: Слухайма ўважліва.

Чытальнік чытае прызначаны на гэты дзень Апостал. Калі скончыць, сьвятар кажа:

Мір табе, чытальнік.

Чытальнік: І твайму духу. Алілуя, алілуя, алілуя.

Чытае выбраныя вершы з псалмаў, пасьля кожнага з якіх людзі пяюць “Алілуя”.

У міжчасе дыякан, узяўшы кадзіла і папрасіўшы блаславеньня ў сьвятара, кадзіць алтар, царкву і людзей, а сьвятар моліцца ціха:

Запалі ў сэрцах нашых, чалавекалюбны Ўладару, нязгаснае сьвятло Твайго богапазнаньня, і адчыні вочы нашага розуму, каб нам зразумець Тваё евангельскае прапаведаваньне. Укладзі ў сэрцы нашы страх Тваіх блаславёных прыказаньняў, каб мы, перамогшы ўсе цялесныя пажаданьні, маглі жыць духоўным жыцьцём, думаючы і робячы ўсё, што прыемна Табе. Бо Ты – сьветласьць душ і целаў нашых, Хрысьце Божа, і Табе славу аддаем разам з Тваім адвечным Айцом і з усесьвятым, добрым і жыватворчым Тваім Духам, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Дыякан, скончыўшы кадзіць, падыходзіць да сьвятара і, паказваючы на кнігу Евангельля, кажа:

Блаславі, ойча, дабравесьніка сьвятога апостала і евангеліста… (імя евангеліста)

Сьвятар (бласлаўляе): Бог малітвамі сьвятога, слаўнага і ўсяхвальнага апостала і евангеліста… (імя) хай дасьць табе слова дабравесьціць сілаю вялікаю, для спаўненьня Евангельля любага Сына свайго, Госпада нашага Ісуса Хрыста.

І дае кнігу Евангельля дыякану.

Дыякан: Амін.

Зрабіўшы паклон, дыякан прымае з рук сьвятара Евангельле і, выйшаўшы райскімі дзьвярыма, прыходзіць на назначанае месца. Сьвятар ля ахвярніка, павярнуўшыся да народу, кажа:

Мудрасьць, устаньце, будзем слухаць Сьвятое Евангельле. Мір усім. (Бласлаўляе людзей)

Людзі: І твайму духу.

Дыякан: Чытаньне Сьвятога Евангельля паводле… (імя)

Людзі: Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

Сьвятар: Слухайма ўважліва.

Дыякан чытае Евангельле. Калі скончыць, людзі пяюць:

Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

Дыякан падносіць Евангельле да сьвятара, які бласлаўляе яго, кажучы:

Мір табе, дабравесьнік.

Тады бярэ Евангельле і адносіць на ахвярнік. Дыякан, стаўшы на сваім месцы, пачынае літанію.

Дыякан: Скажам усе разам ад усяе душы і ад усяе думкі нашае скажам.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Госпадзе ўсемагутны, Божа айцоў нашых, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Зьмілуйся над намі, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Яшчэ молімся за Сьвятога Айца нашага, Сусьветнага біскупа... (імя) Папу Рымскага, дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага... (імя) і ўсіх у Хрысьце братоў нашых.

Яшчэ молімся за яго (яе) міласьць... (імя галавы дзяржавы), за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны.

Яшчэ молімся за Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас.

Яшчэ молімся за братоў нашых сьвятароў, дыяканаў і манахаў, і ўсіх братоў і сёстраў нашых у Хрысьце.

Яшчэ молімся за годных памяці заснавальнікаў гэтай сьвятой царквы і за ўсіх раней адышоўшых айцоў і братоў нашых, якія тут і на кожным іншым месцы спачываюць.

На гэтым месцы можна дадаць адмысловыя прашэньні.

---

За хворага:

Лекару душ і целаў, з любоўю і скрушлівым сэрцам прыходзім да Цябе і просім: аздараві хворасьці, вылеч немачы душы і цела слугі Тайго (Тваёй)… (імя) , прабач яму (ёй) ўсе правіны, вольныя і міжвольныя, і хутка ўзьнімі яго (яе) з ложа хваробы, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

Ты, што не жадаеш сьмерці грэшніка, але хочаш, каб ён навярнуўся і жыў, пашкадуй слугу Твайго (Тваю)… (імя) і зьмілуйся над ім (ёю), адхіні ад яго (яе) хваробу, адгані ўсякае цярпеньне і слабасьць і, працягнуўшы моцную руку Тваю, як некалі дачцы Яіра, узьнімі з ложа хваробы і вярні яму (ёй) здароўе, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

За тых, што зьбіраюцца ў дарогу:

Ты, Госпадзе, што кіруеш крокамі людзкімі, глянь міласьціва на слугу Твайго (Тваю)… (імя), што зьбіраецца ў дарогу, прабач яму (ёй) ўсе правіны вольныя і міжвольныя, благаславі добры намер ягона-

га (ейнага) розуму і будзь яму (ёй) спадарожнікам ад пачатку да канца, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

Ты, што спадарожнічаў Луцэ і Кляопу ў Эмаус, і даў ім вярнуцца ў Ерусалім узбагачанымі радаснаю весткаю, дай, каб ласка Твая і благаславеньне спадарожнічалі слузе Твайму (Тваёй)… (імя), які (якая) перад дарогаю тут шчыра моліцца Табе. Захавай яго (яе) ў добрым здароўі і дабрадзейнасьці, настаўляючы на ўсякую добрую справу, каб Тваё імя праслаўлялася ў ім (ёй). І дай яму (ёй) бясьпечна вярнуцца ў свой час, молім Цябе, нашага шчодрага Дабрадзея, Ты ж пачуй нас і зьмілуйся.

Прашэньне агульнае:

Яшчэ молімся Табе, Госпаду Богу нашаму, каб Ты пачуў голас маленьняў нашых і зьмілаваўся над слугой Тваім (Тваёю)… (імя), напоўніў яго (яе) ласкаю Тваёю і даў спаўненьне ўсіх ягоных (ейных) просьбаў і добрых намераў. Прабач яму (ёй) ўсе правіны вольныя і міжвольныя і дай, каб ягоныя (ейныя) малітвы былі прыемнымі перад пасадам славы Тваёй; захавай яго (яе) ад усякага няшчасьця, бяды і напасьцяў, даруй яму (ёй) здароўе і доўгае жыцьцё, просім Цябе, пачуй нас і зьмілуйся.

Глянь, чалавекалюбны Ўладару, міласэрным вокам Тваім на слугу Твайго (Тваю)… (імя) і пачуй нашыя малітвы; бо Ты ж сам сказаў: усё, што просіце ў малітве, верце і атрымаеце; таксама: прасіце, і будзе вам дадзена. Дзеля гэтага і мы, нягодныя, спадзеючыся на міласэрнасьць Тваю, просім зьмілавацца над

слугой Тваім (Тваёю)... (імя), споўніць усе ягоныя (ейныя) добрыя жаданьні і захаваць яго (яе) ў супакоі, здароўі і даўгалецьці: хутка пачуй нас і зьмілуйся.

Іншае прашэньне агульнае:

Яшчэ молімся за слугу Божага (Божую)... (імя), каб добры і міласэрны Бог наведаў яго (яе) і дараваў яму (ёй) спакойнае жыцьцё, здароўе, посьпех у кожнай добрай справе, і каб адпусьціў яму (ёй) ўсе ягоныя (ейныя) правіны вольныя і міжвольныя.

Удзячная малітва:

Мы, нягодныя слугі Твае, прыходзім да Тваёй спагадлівасьці, Збавіцелю, Уладару і Госпадзе, дзякуючы са страхам і трапятаньнем за ўсе дабрадзействы, якімі Ты нас шчодра абдарыў; і, прыпаўшы, славім Цябе як Бога і пакорліва просім: вызваль нас ад бедаў і, як заўсёды, міласьціва споўні ўсе нашыя жаданьні, горача молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

Ты, Госпадзе, сёньня пачуў ласкава малітвы слугаў Тваіх і паказаў ім Тваю вялікую міласэрнасьць і спагадлівасьць. Не пагардзі намі і ў будучыні, але выканай усе добрыя жаданьні нашыя, і пакажы ўсім нам бязьмежную веліч Тваёй дабрыні, не зважаючы на нашыя правіны, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

---

Яшчэ молімся за дабрачынцаў гэтай сьвятой царквы, за тых, што прыносяць да-

ры, працуюць і сьпяваюць у ёй, і за ўсіх тут прысутных людзей, якія чакаюць ад Цябе багацьця Твайго зьмілаваньня.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Божа наш, прымі шчырыя малітвы слугаў Тваіх і зьмілуйся над намі паводле велічы Тваёй міласэрнасьці; пашлі даброты Твае на нас і на ўсіх людзей Тваіх, якія чакаюць ад Цябе багацьця Твайго зьмілаваньня.

Уголас: Бо Ты міласьцівы і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

На гэтым месцы можна браць літанію за памерлых.

---

Дыякан: Зьмілуйся над намі, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Яшчэ молімся за супакой душы заснулага слугі Божага (заснулай слугі Божай, або: заснулых слуг Божых)… (імя або імёны), і каб яму (ёй, ім) былі дараваныя ягоныя (ейныя, іхнія) правіны вольныя і міжвольныя.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Каб Госпад Бог пасяліў душу ягоную (ейную; душы іхнія), дзе праведнікі спачываюць.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Зьмілаваньня Божага, валадарства нябеснага і адпушчэньня грахоў яго (яе, іх) у Хрыста, несьмяротнага Ўладара і Бога нашага просім.

Людзі: Дай яму (ёй, ім), Госпадзе.

Дыякан: Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (ціха): Божа духаў і ўсякага цялеснага стварэньня, што зваяваў сьмерць і д’ябла перамог, і дараваў сусьвету Твайму жыцьцё, супакой душу заснулага слугі Твайго (заснулай слугі Тваёй; заснулых слугаў Тваіх)… (імя або імёны) у месцы сьвет-

лым, месцы радасным, месцы спакойным, дзе няма ні болю, ні суму, ні плачу; усякую правіну, зробленую ім (ёй, імі) словам, учынкам і думкаю, Ты, як добры і чалавекалюбны Бог, прабач яму (ёй, ім). Бо няма жывога чалавека – і ніколі ня будзе – які б не зграшыў: Ты адзіны толькі без граху, справядлівасьць Твая – справядлівасьць навекі, і слова Тваё – праўда.

Уголас: Бо Ты – уваскрасеньне, жыцьцё і супакой заснулага слугі Твайго (заснулай слугі Тваёй; заснулых слугаў Тваіх)… (імя або імёны), Хрысьце Божа наш, і мы Табе славу аддаем, разам з адвечным Тваім Айцом і з усесьвятым, добрым і жыватворчым Тваім Духам, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

---

Літанія за пакліканых (г. зн. тых, што рыхтуюцца да сьвятога хросту).

Дыякан: Памаліцеся, пакліканыя, Госпаду.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Верныя, памолімся за пакліканых, каб Госпад зьмілаваўся над імі.

Каб Ён прасьвятліў іх словам праўды.

Каб даў ім зразумець дабравешчаньне праведнасьці.

Каб зьяднаў іх са сьвятой сваёй, паўсюднай і апостальскай Царквой.

Пакліканыя, галовы вашы Госпаду схіліце.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Божа наш, які жывеш на вышынях і глядзіш спагадліва на пакорных; які паслаў збаўленьне роду людзкому, адзінароднага Сына Твайго і Бога нашага Ісуса Хрыста: глянь на слуг Тваіх, што рыхтуюцца да хросту і якія схілілі галовы свае перад Табою; і зрабі, каб у свой час яны сталіся дастойнымі вады адраджэньня, адпушчэньня грахоў і вопраткі несьмяротнасьці, зьяднай іх з Тваёй сьвятой, паўсюднай і апостальскай Царквой і далучы іх да Твайго выбранага статку.

Уголас: Каб яны разам з намі славілі Тваё пачэснае і велічнае імя, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: Усе пакліканыя, выходзьце; пакліканыя, выходзьце; усе пакліканыя, выходзьце; хай ніхто з пакліканых не застанецца тут!

Сьвятар разгортвае антымінс.

Дыякан: Усе верныя, яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (ціха): Дзякуем Табе, Госпадзе Божа сіл, што Ты дазволіў нам стаць у гэтую хвіліну перад Тваім сьвятым ахвярнікам і прыпасьці да Тваёй міласэрнасьці, молячыся за людзкія правіны. Прымі, Божа, нашы маленьні і зрабі нас дастойнымі прыносіць Табе малітвы, просьбы і ахвяры бяскроўныя за ўсіх людзей; сілаю Сьвятога Твайго Духа дай, каб мы, якіх Ты паклікаў на гэтую Тваю службу, маглі без асуджэньня і бездакорна,

з чыстым сьведчаньнем нашага сумленьня, клікаць Цябе ў кожную хвіліну і на кожным месцы. Ты ж, выслухаўшы нас, будзь спагадлівы да нас дзеля Тваёй бязьмежнай дабрыні.

Дыякан: Мудрасьць!

Сьвятар (уголас): Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (ціха): Яшчэ і шматразова прыходзім да Цябе і молімся Табе, добры Чалавекалюбча, каб Ты, выслухаўшы ласкава нашы просьбы, ачысьціў нашы ду-

шы і целы ад усякай нячыстасьці цялеснай і душэўнай, і даў нам без асуджэньня стаць перад Тваім сьвятым ахвярнікам. Дай, Божа, і тым, што моляцца разам з намі, посьпех у жыцьці і веры, і ў разуменьні духоўных рэчаў; дай ім, якія са страхам і любоўю служаць Табе, прыняць без віны і асуджэньня сьвятыя Твае Тайны і быць дастойнымі Твайго нябеснага валадарства.

Дыякан: Мудрасьць.

Сьвятар (уголас): Каб мы, будучы заўсёды пад аховаю Тваёй магутнай улады, Табе славу аддавалі, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

І сьпяваюць Хэрувімскую песьню:

Мы, што ў тайны спосаб прадстаўляем хэрувімаў і Жыватворчай Тройцы тройчы сьвятую песьню пяём, адложым цяпер усе жыцьцёвыя клопаты.

Дыякан уваходзіць у алтар, бярэ кадзіла і кадзіць ахвярнік, царкву і ўсіх людзей, гаворачы ціха Псалом 50 (калі няма дыякана, кадзіць сьвятар). У міжчасе сьвятар ціха чытае малітву:

Ніхто, зьвязаны цялеснымі пажаданьнямі і ўцехамі, не дастойны прыбліжацца да Цябе і служыць Табе, Уладару славы; бо служыць Табе – нешта вялікае і страшнае нават для саміх анёльскіх сілаў. Нягледзячы, аднак, на гэта, дзеля невыказнага і бязьмежнага Твайго чалавекалюбства, Ты, не зазнаўшы ніякай зьмены ці парушэньня Тваёй Боскай прыроды, стаў чалавекам і быў нам Найвышэйшым Сьвятаром і, будучы Ўладаром усіх, даручыў нам сьвятарскае выкананьне гэтай службы і бяскроўнай ахвяры. Ты адзін, Госпадзе, валодаеш усім на небе і на зямлі; Цябе, Уладара сэрафімаў і Цара Ізраільскага, носяць на хэрувімскім пасадзе. Ты адзіны сьвяты і сярод сьвятых спачываеш. Табе малюся, адзінаму добраму і заўсёды гатоваму ласкава выслухаць мяне: глянь на мяне, грэшнага і нягоднага слугу Твайго, і ачысьці маю душу і сэрца ад благога сумленьня; сілаю Сьвятога Твайго Духа – паколькі я апрануты ў ласку сьвятарства, – зрабі мяне дастойным стаць перад Тваім сьвятым ахвярнікам і прыносіць Тваё сьвятое і ўсячыстае Цела і пачэсную Кроў. Да Цябе прыходжу, схіліўшы голаў, і малюся Табе: не адвярні Твару Твайго сьвятога ад мяне і не адлучы мяне ад дзяцей

Тваіх, але дазволь, каб я, Твой грэшны і нягодны слуга, прынёс Табе гэтыя дары. Бо Ты сам Той, хто ахвяруе і каго ахвяруюць, і хто прымае і каго раздаюць, Хрысьце Божа наш, і Табе славу аддаем, разам з адвечным Тваім Айцом і з усесьвятым, добрым і жыватворчым Тваім Духам, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Дыякан, скончыўшы кадзіць, стае побач са сьвятаром. Сьвятар, узьняўшы рукі, кажа:

Мы, што ў тайны спосаб прадстаўляем хэрувімаў і Жыватворчай Тройцы тройчы сьвятую песьню пяём, адложым цяпер усе жыцьцёвыя клопаты.

Дыякан: Каб нам прыняць Уладара ўсіх, якога нябачна суправаджаюць анёльскія сілы. Алілуя, алілуя, алілуя.

Абодва робяць паклон. Гэта паўтараюць тройчы. Тады, пацалаваўшы ахвярнік і пакланіўшыся ў бок людзей, адыходзяць да прыгатавальніка, кажучы:

Божа, ачысьці мяне, грэшнага, і зьмілуйся нада мною.

Сьвятар кадзіць прынесеныя дары, дае пакравец і дыскас дыякану, а сам бярэ чашу, кажучы:

Узьніміце рукі вашыя да сьвятых рэчаў і блаславіце Госпада.

Абодва выходзяць паўночнымі дзьвярамі.

Дыякан: Усіх вас, прававерных хрысьціянаў, хай успомніць Госпад Бог у валадарстве сваім на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Сьвятар: Сьвятога Айца нашага Сусьветнага біскупа... (імя) Папу Рымскага, дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага ... (імя), пачэсных сьвятароў, дыяканаў у Хрысьце і ўсё духавенства; яго (яе) міласьць ... (імя галавы дзяржавы), урад і належныя ўлады гэтай краіны; Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ; заснавальнікаў і дабрачынцаў гэтай сьвятой царквы; вас і ўсіх прававерных хрысьціянаў хай успомніць Госпад Бог у сваім валадарстве на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін. Каб нам прыняць Уладара ўсіх, якога нябачна суправаджаюць анёльскія сілы. Алілуя, алілуя, алілуя.

Сьвятар і дыякан уваходзяць у алтар. Дыякан кажа ціха:

Хай Госпад Бог успомніць сьвятарства тваё ў сваім валадарстве.

Сьвятар кажа дыякану:

Хай Госпад Бог успомніць сьвятадыяканства тваё ў сваім валадарстве, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Сьвятар ставіць на ахвярнік чашу, а таксама дыскас, узяўшы яго ад дыякана, здымае з іх малыя пакраўцы і пакрывае абодва вялікім пакраўцом, кадзіць і моліцца:

Высакародны Язэп, зьняўшы з дрэва Тваё ўсячыстае цела, спавіўшы яго ў чыстае палатно з духмянасьцямі, у магіле новай паклаў.

Пакажы, Госпадзе, з ласкі Тваёй спагаду Сыёну: хай муры Ерусаліму будуць зноў узьнесеныя. Тады глянеш прыхільна на правыя ахвяры, дары і цэлапаленьні, тады ўскладуць цялят на Твой ахвярнік.

Тады зьвяртаецца да дыякана:

Успомні мяне, браце і спаўслужыцелю.

Дыякан: Няхай успомніць Госпад Бог сьвятарства тваё ў валадарстве сваім.

Сьвятар: Памаліся за мяне, спаўслужыцелю мой.

Дыякан: Дух Сьвяты зыйдзе на цябе і сіла Ўсявышняга ацяніць цябе.

Сьвятар: Той самы Дух хай садзейнічае нам праз усе дні жыцьця нашага.

Дыякан: Успомні мяне, ойча сьвяты.

Сьвятар: Няхай успомніць цябе Госпад Бог у валадарстве сваім, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Баслаўляе дыякана, які выходзіць з алтара паўночнымі дзьвярамі і, стаўшы на сваім месцы, пачынае літанію:

Дыякан: Дапоўнім малітву нашу Госпаду.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: За прынесеныя пачэсныя дары Госпаду памолімся.

За гэтую сьвятую царкву і ўсіх, што з вераю, пашанаю і страхам Божым уваходзяць у яе, Госпаду памолімся.

Каб нам выбавіцца ад усякага гневу, суму і недастатку, Госпаду памолімся.

Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Каб увесь гэты дзень быў дасканалы, сьвяты, мірны і бязгрэшны, у Госпада просім.

Людзі: Дай нам, Госпадзе. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Анёла спакою, вернага настаўніка, апекуна душ і целаў нашых у Госпада просім.

Прабачэньня і адпушчэньня грахоў і правінаў нашых у Госпада просім.

Усяго, што добрае і карыснае для душ нашых, і супакою для сьвету у Госпада просім.

Каб далейшы цяг жыцьця нашага ў супакоі і пакаяньні правесьці, у Госпада просім.

Хрысьціянскага канца жыцьця нашага, бязбольнага, бездакорнага, спакойнага і добрага адказу на страшным судзе Хрыстовым просім.

Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Усемагутны Госпадзе Божа, адзіны сьвяты, які прымаеш ахвяру малітвы ад тых, што ад усяго сэрца клічуць Цябе: прымі малітвы і нас грэшных, занясі іх да Твайго сьвятога ахвярніка і зрабі нас здольнымі прыносіць Табе дары і ахвяры духоўныя за нашы грахі і людзкія правіны. Дай нам знайсьці ласку перад Табою, каб гэтая наша ахвяра была прыемная Табе, і каб добры Дух Тваёй ласкі спачыў на нас, на гэтых вось дарах і на ўсіх людзях Тваіх.

Уголас: Міласэрнасьцю адзінароднага Сына Твайго, з якім блаславёны Ты і Твой усесьвяты, добры і жыватворчы Дух, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Мір усім! (Бласлаўляе людзей)

Людзі: І твайму духу.

Дыякан: Будзем любіць адзін аднаго, каб нам аднадушна вызнаваць.

Людзі: Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, Тройцу адзінасутную і неразьдзельную.

Сьвятар робіць тры паклоны, кажучы за кожным разам:

Буду любіць Цябе, Госпадзе, сіла мая, умацаваньне маё і прытулак мой.

Потым цалуе вялікі пакравец над дыскасам і чашаю, а таксама край ахвярніка, бярэ пакравец ў рукі і зьлёгку патрасае ім над дарамі.

Дыякан: Дзьверы, дзьверы! У мудрасьці будзьма ўважлівыя!

Людзі: Веру ў адзінага Бога Айца, усемагутнага, Творцу неба і зямлі, бачнага ўсяго і нябачнага. І ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, адзінароднага, ад Айца народжанага перад усімі вякамі; Сьвятло ад Сьвятла, праўдзівага Бога ад праўдзівага Бога, народжанага, нястворанага, адзінасутнага з Айцом, праз якога ўсё стала быць. Ён дзеля нас людзей і дзеля нашага збаўленьня зышоў з неба, прыняў цела ад Духа Сьвятога і Марыі Дзевы і стаўся чалавекам. Быў укрыжаваны за нас пры Понцкім Пілаце, цярпеў і быў пахаваны. І на трэці дзень уваскрос згодна з Пісаньнямі; і ўзышоў на неба, і сядзіць па правай руцэ Айца; і зноў прыйдзе ў славе судзіць жывых і мёртвых, і Яго валадарству ня будзе канца. Веру ў Духа Сьвятога, Госпада жыватворчага, які ад Айца паходзіць; якому належыцца пакланеньне і слава разам з Айцом і Сынам; які гаварыў праз пракокаў. У адзіную, сьвятую, паўсюдную і апостальскую Царкву. Вызнаю адзіны хрост для адпушчэньня грахоў. Чакаю ўваскрасеньня мёртвых і жыцьця будучага веку. Амін.

Сьвятар гаворыць Вызнаньне веры разам з людзьмі, пасьля цалуе пакравец і адкладае яго, кажучы:

Ласка Госпада.

Дыякан: Станем добра, станем са страхам, уважліва сьвятое ахвяраваньне ў міры прыносіць.

Дыякан ідзе ў алтар і, стаўшы з правага боку сьвятара, бярэ рыпіду і павявае ёю лёгка над дарамі. Калі няма рыпіды, робіць тое самае малым пакраўцом (складзеным).

Людзі: Дар міру, ахвяру хвалы.

Сьвятар: Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста, любоў Бога Айца і супольнасьць Сьвятога Духа хай будуць з усімі вамі. (Бласлаўляе людзей)

Людзі: І з духам тваім.

Сьвятар: Узьнімем угору сэрцы нашыя.

Людзі: Мы ўзьнялі іх да Госпада.

Сьвятар: Падзякуем Госпаду.

Людзі: Годна і справядліва ёсьць пакланяцца Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, Тройцы адзінасутнай і неразьдзельнай.

Сьвятар (ціха): Годна і справядліва Цябе ўсхваляць, Цябе бласлаўляць, Цябе славіць, Табе дзякаваць на кожным месцы Твайго валадарства: бо Ты Бог невыказны, неспасьцігальны, нябачны, недаступны, які заўсёды існуеш і застаешся той самы, Ты, і адзінародны Твой Сын, і Дух Твой Сьвяты. Ты прывёў нас з нябыту да быцьця і, калі мы ўпалі, зноў падняў і не пераставаў рабіць усё, каб узьвесьці нас на неба і дараваць нам Тваё будучае валадарства. Дзеля гэтага дзякуем Табе, і Твайму адзінароднаму Сыну, і Духу Твайму Сьвятому, дзякуем за ўсе дабрадзействы вядомыя і невядомыя, яўныя і тайныя, якімі Ты нас абдарыў. Дзякуем Табе і за гэтую службу, якую Ты захацеў ласкава прыняць з нашых рук, хоць перад Табою стаяць вялікія мноствы архanёлаў, безьліч анёлаў, хэрувімы і сэрафімы, шасьцікрылыя, шматвокія, якія, узьняўшыся высока на крылах,

Уголас: Пераможную песьню пяюць, усклікаючы, прыпяваючы і кажучы.

Дыякан, адклаўшы рыпіду, бярэ з дыскаса зорку, стукае ёю накрыж аб дыскас і адкладае ўбок.

Людзі: Сьвяты, сьвяты, сьвяты Госпад сіл. Неба і зямля поўныя хвалы Тваёй. Га-

санна на вышынях. Благаславёны Той, хто прыходзіць у імя Гасподняе. Гасанна на вышынях.

Сьвятар (ціха): З гэтымі благаславёнымі сіламі, чалавекалюбны Ўладару, і мы ўсклікаем, кажучы: сьвяты і ўсесьвяты Ты, і адзінародны Твой Сын, і Дух Твой Сьвяты; сьвяты і ўсесьвяты Ты, і вялікая хвала Твая: Ты так палюбіў Твой сьвет, што Сына Твайго адзінароднага паслаў, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыцьцё вечнае. Ён, прыйшоўшы і споўніўшы ўвесь провід дзеля нас, у ноч, у якую Яго выдалі – або хутчэй, калі Ён Сам аддаў Сябе за жыцьцё сьвету, – узяў хлеб у Свае сьвятыя, усячыстыя і бязьвінныя рукі і, аддаўшы падзяку, паблаславіўшы (благаслаўляе хлеб), асьвяціўшы і разламаўшы яго, даў сьвятым сваім вучням і апосталам, кажучы:

Дыякан, схіліўшыся і трымаючы трыма пальцамі правай рукі арар, паказвае на хлеб моўчкі. Сьвятар паказвае правай рукой на хлеб і кажа ўголас:

БЯРЫЦЕ, ЕШЦЕ, ГЭТА ЦЕЛА МАЁ, ШТО ЗА ВАС ЛОМІЦЦА ДЛЯ АДПУШЧЭНЬНЯ ГРАХОЎ.

Людзі: Амін.

Сьвятар і дыякан робяць глыбокі паклон. Пасьля сьвятар кажа ціха:

Таксама чашу (бласлаўляе чашу) пасьля вячэры кажучы:

Дыякан, схіліўшыся, паказвае на чашу моўчкі. Сьвятар паказвае на чашу і кажа ўголас:

ПІЦЕ З ЯЕ ЎСЕ, ГЭТА КРОЎ МАЯ НОВАГА ЗАПАВЕТУ, ШТО ЗА ВАС І ЗА МНОГІХ ПРАЛІВАЕЦЦА ДЛЯ АДПУШЧЭНЬНЯ ГРАХОЎ.

Людзі: Амін.

Сьвятар і дыякан робяць глыбокі паклон.

Сьвятар (ціха): Мы ж, памятаючы гэты збавенны запавет і ўсё, што дзеля нас здарылася – Крыж, пахаваньне, уваскрасеньне на трэці дзень, узыход на неба, сядзеньне па правай руцэ, другое і слаўнае прыйсьце,

Дыякан, склаўшы накрыж рукі, бярэ дыскас і чашу і падымае іх, а сьвятар кажа:

Прыносім Табе Твае ад Тваіх дзеля ўсіх і за ўсё.

Людзі: Цябе хвалім, Цябе бласлаўляем, Табе дзякуем, Госпадзе, і молімся Табе, Божа наш.

Дыякан ставіць чашу і дыскас на месца, а сьвятар моліцца ціха:

Яшчэ прыносім Табе гэтую духоўную і бяскроўную службу і клічам, і просім, і молім Цябе: зышлі Духа Твайго Сьвятога на нас і на гэтыя прынесеныя дары.

Сьвятар і дыякан робяць тры паклоны.

---

Дзе ёсьць звычай, можна гаварыць:

Сьвятар: Госпадзе, што ў трэцюю гадзіну паслаў Тваім апосталам Духа Твайго Сьвятога, не адымі Яго, Добры, і ад нас, але аднаві нас, якія молімся Табе.

Дыякан: Сэрца чыстае створы ўва мне, Божа, і дух правы абнаві ў нутры маім. (Робяць паклон)

Сьвятар: Госпадзе, што ў трэцюю гадзіну… (Робяць паклон)

Дыякан: Не адкінь мяне ад аблічча Твайго, і Духа Твайго Сьвятога не адымі ад мяне. (Паклон)

Сьвятар: Госпадзе, што ў трэцюю гадзіну… (Паклон)

---

Дыякан, паказваючы арарам на сьвяты хлеб:

Блаславі, ойча, сьвяты хлеб.

Сьвятар (благаслаўляе): І зрабі гэты хлеб сьвятым Целам Хрыста Твайго.

Дыякан: Амін. Блаславі, ойча, сьвятую чашу.

Сьвятар (благаслаўляе): А тое, што ў гэтай чашы, сьвятой Крывёю Хрыста Твайго.

Дыякан: Амін. Блаславі, ойча, абое.

Сьвятар (благаслаўляе абое): Перамяніўшы іх Духам Тваім Сьвятым.

Дыякан: Амін, амін, амін.

Робяць зямны паклон.

Сьвятар: Каб гэтыя дары былі тым, што іх прымаюць, для цьвярозасьці душы, для адпушчэньня грахоў, для ўдзелу ў суполь-

насьці Сьвятога Духа, для зьдзяйсьненьня валадарства нябеснага, для сьмеласьці прыбліжацца да Цябе, а не на суд ці на асуджэньне.

Таксама прыносім Табе гэтую бяскроўную ахвяру за спачылых у веры праайцоў, айцоў, патрыярхаў, прарокаў, апосталаў, прапаведнікаў, мучанікаў, вызнаўцаў, посьнікаў і за ўсякую праведную душу, у веры памерлую;

Узяўшы кадзіла, кадзіць сьвятыя дары, кажучы ўголас:

Асабліва за найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і заўсёды Дзеву Марыю.

Дыякан, узяўшы кадзіла ад сьвятара, кадзіць вакол ахвярніка.

Людзі сьпяваюць песьню ў гонар Багародзіцы. Звычайна, апрача сьвятаў Гасподніх і Багародзіцы, сьпяваецца наступная песьня:

Дастойна ёсьць сапраўды называць шчасьліваю Цябе, Багародзіцу, вечна блаславёную і беззаганную Маці Бога нашага. Больш годную пашаны за хэрувімаў і без параўнаньня больш слаўную за сэрафімаў,

што, захаваўшы дзявоцтва, радзіла Бога-Слова, існую Багародзіцу, Цябе мы ўзьвялічваем.

Сьвятар (ціха): За сьвятога Яна, прарока, Прадвесьніка і Хрысьціцеля; за сьвятых, слаўных і годных пахвалы апосталаў; за святога (сьвятую) … (імя сьвятога) , чыю памяць сёньня адзначаем; і ўсіх сьвятых, малітвамі якіх наведай нас, Божа.

Успомні таксама ўсіх памерлых у надзеі ўваскрасеньня і жыцьця вечнага.

Успамінае пайменна памерлых, каго хоча, або за каго ахвяруецца Сьвятая Літургія.

І супакой іх, дзе зьзяе сьвятло твару Твайго.

Яшчэ молімся Табе, Госпадзе, успомні ўсіх прававерных біскупаў, якія праўдзіва навучаюць нас словам Тваёй праўды; пачэсных сьвятароў, дыяканаў у Хрысьце і ўсё духавенства.

Таксама прыносім Табе гэтую духоўную службу за ўвесь сьвет; за сьвятую, паўсюдную і апостальскую Царкву; за тых,

што вядуць чыстае і бездакорнае жыцьцё; за наш народ; за належныя ўлады гэтай краіны: дай ім, Госпадзе, спакойнае ўладаньне, каб і мы пад іхняй аховаю маглі пражыць наша жыцьцё ціха і спакойна, з усякай набожнасьцю і ў чысьціні.

Уголас: Насамперш успомні, Госпадзе, Сьвятога Айца нашага, Сусьветнага біскупа... (імя) Папу Рымскага; і дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага … (імя). Захавай іх для сьвятых Тваіх цэркваў у супакоі, цэласьці, добрай славе, здароўі і даўгалецьці, каб яны маглі верна навучаць нас словам Тваёй праўды.

Людзі: І ўсіх, і ўсё.

Сьвятар (ціха): Успомні, Госпадзе, горад (вёску), у якім (якой) мы жывем, усякі горад і краіну, і ўсіх, што з вераю жывуць у іх. Успомні, Госпадзе, падарожнікаў па моры, зямлі і ў паветры, хворых, тых што церпяць, зьняволеных і пашлі ім збаўленьне. Успомні, Госпадзе, тых, што прыносяць дары для сьвятых Тваіх цэркваў, робяць дабро, памятаюць пра ўбогіх, і на ўсіх іх пашлі Твае міласьці.

Успамінае паймення жывых, каго хоча.

Уголас: І дай нам адзінымі вуснамі і адзіным сэрцам славіць і выхваляць Тваё пачэснае і велічнае імя, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: І хай будуць міласьці вялікага Бога і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста з усімі вамі. (Бласлаўляе людзей)

Людзі: І з духам тваім.

Дыякан, узяўшы блаславеньне, выходзіць на звычайнае месца і пачынае літанію.

Дыякан: Успомніўшы ўсіх сьвятых, яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: За прынесеныя і асьвячаныя пачэсныя дары Госпаду памолімся.

Каб чалавекалюбны Бог наш, прыняўшы іх на свой сьвяты, нябесны і духоў-

ны ахвярнік, як адмысловую духмянасьць духоўную, паслаў нам узамен сваю Боскую ласку і дар Сьвятога Духа, памолімся.

Каб нам выбавіцца ад усякага гневу, суму і недастатку, Госпаду памолімся.

Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Каб увесь гэты дзень быў дасканалы, сьвяты, мірны і бязгрэшны, у Госпада просім.

Людзі: Дай нам, Госпадзе. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Анёла спакою, вернага настаўніка, апекуна душ і целаў нашых у Госпада просім.

Прабачэньня і адпушчэньня грахоў і правінаў нашых у Госпада просім.

Усяго, што добрае і карыснае для душ нашых, і супакою для сьвету ў Госпада просім.

Каб далейшы цяг жыцьця нашага ў супакоі і пакаяньні правесьці, у Госпада просім.

Хрысьціянскага канца жыцьця нашага, бязбольнага, бездакорнага, спакойнага, і добрага адказу на страшным судзе Хрыстовым просім.

Папрасіўшы адзінства веры і супольнасьці Духа Сьвятога, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Табе ахвяруем жыцьцё наша і надзею, чалавекалюбны Ўладару, і просім, і молім Цябе, і клічам: зрабі нас дастойнымі прыняць Твае нябесныя і страшныя Тайны з гэтага сьвятога і духоўнага стала з чыстым сумленьнем, для адпушчэньня грахоў, для дараваньня правінаў, для ўдзелу ў супольнасьці Сьвятога Духа, для атрыманьня валадарства нябеснага, для сьмеласьці набліжацца да Цябе, а не на суд ці на асуджэньне.

Уголас: І зрабі нас дастойнымі, Уладару, з поўным даверам і без асуджэньня сьмець зьвяртацца да Цябе, Бога нябеснага, як да Айца, і казаць:

Людзі: Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая, як у небе так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня. І адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым. І ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

Сьвятар: Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Мір усім.

Людзі: І твайму духу.

Дыякан: Галовы вашы Госпаду схіліце.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Дзякуем Табе, нябачны Уладару, што Тваёй бязьмежнай сілаю ўсё

стварыў і ў безьлічы міласэрнасьці Тваёй прывёў усё з нябыту да быцьця. Глянь, Госпадзе, з нябёсаў на тых, што схілілі галовы свае перад Табою, бо яны не схілілі іх перад целам і крывёю, але перад Табою, усемагутным Богам. Дык вось, Уладару, прынесеныя тут дары ўсім пароўну раздай, кожнаму паводле патрэбы: будзь з падарожнікамі па моры, зямлі і ў паветры, аздараві хворых, Лекару душ і целаў.

Уголас: Ласкаю, міласэрнасьцю і чалавекалюбствам адзінароднага Сына Твайго, з якім блаславёны Ты і Твой усесьвяты, добры і жыватворчы Дух, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Ісусе Хрысьце, Божа наш, які сядзіш з Айцом на вышынях і тут з намі нябачна прабываеш, глянь з Твайго сьвятога жылья і з пасаду славы валадарства Твайго, і прыйдзі асьвяціць нас. І будзь ласкавы даць нам магутнай Тваёй рукою Тваё ўсячыстае Цела і пачэсную Кроў, а праз нас усім людзям.

У міжчасе дыякан апярэзваецца накрыж арарам. Калі сьвятар скончыць малітву, ён і дыякан робяць тры паклоны, кажучы ціха за кожным разам:

Божа, будзь спагадлівы мне, грэшнаму, і зьмілуйся нада мною.

Дыякан (уголас): Будзьма ўважлівыя.

Сьвятар бярэ ў рукі Агнец і падымае яго, усклікаючы:

Сьвятыя рэчы для сьвятых.

Людзі: Адзін сьвяты, адзін Госпад Ісус Хрыстос на славу Бога Айца. Амін.

І сьпяваюць прычасьнік. У нядзелю:

Хваліце Госпада з нябёсаў, хваліце Яго на вышынях. Алілуя, алілуя, алілуя.

У міжчасе дыякан уваходзіць у алтар і, стаўшы па правай руцэ сьвятара, кажа:

Раздрабі, ойча.

Сьвятар: Раздрабляецца і разьдзяляецца Агнец Божы, які застаецца непадзельны, хоць яго разьдзяляюць, і заўсёды

неспажыты, хоць яго ўсьцяж спажываюць, але які асьвячае тых, што яго прымаюць.

Раздрабляе Агнец на чатыры часткі, кладучы іх на дыскасе ў наступным парадку:




Дыякан (паказваючы на чашу) : Напоўні, ойча, сьвятую чашу.

Сьвятар укладае ў чашу частку з літарамі ІС і кажа:

Паўната Духа Сьвятога.

Дыякан: Амін.

Дыякан бярэ цеплыню (гарачую ваду) і кажа сьвятару:

Блаславі, ойча, цеплыню.

Сьвятар (бласлаўляе): Блаславёная цеплыня сьвятых Тваіх, на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Дыякан улівае цеплыню ў чашу накрыж, кажучы:

Цеплыня веры, поўная Духа Сьвятога. Амін.

Сьвятар раздрабляе частку з літарамі ХС для прычасьця сьвятароў і дыяканаў. Тады кажа дыякану:

Дыякане, падыдзі.

Дыякан падыходзіць, робіць глыбокі паклон і кажа:

Дай мне, ойча, пачэснае і сьвятое Цела Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста.

Сьвятар кладзе на руку дыякану частку Сьвятога Хлеба, кажучы:

Пачэснае і сьвятое Цела Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста даецца сьвятадыякану… (імя), для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Дыякан адыходзіць, становіцца ззаду ахвярніка і, схіліўшы галаву, моліцца.

Сьвятар, пакланіўшыся, бярэ частку сьвятога хлеба, кладзе сабе на правую далонь, кажучы:

Пачэснае і сьвятое Цела Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста даецца мне, сьвятару... (імя), для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Трымаючы Хлеб на руцэ і схіліўшыся над ім, моліцца разам з дыяканам:

Веру, Госпадзе, і вызнаю, што Ты сапраўды Хрыстос, Сын Бога жывога, што прыйшоў на сьвет збавіць грэшнікаў, сярод якіх я самы першы. Веру таксама, што гэта сапраўды Тваё сьвятое Цела і пачэсная Кроў. Малюся Табе: зжалься нада мною і даруй мне мае правіны вольныя і міжвольныя, якія я зрабіў словам і ўчынкам, сьвядома і несьвядома. І дай мне без асуджэньня прыняць Твае сьвятыя Тайны для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Зрабі мяне сёньня, Сыне Божы, удзельнікам Тваёй Тайнай вячэры; я ня здраджу ворагам Тваім тайны і ня дам пацалунку, як Юда, але як разбойнік вызнаю Цябе: успомні мяне, Госпадзе, у Тваім валадарстве.

Няхай прыняцьце сьвятых Тваіх Тайнаў будзе мне не на суд ці асуджэньне, але для аздараўленьня душы і цела.

І спажывае пабожна сьвятое Цела. Таксама, пакланіўшыся зноў, бярэ чашу і п'е з яе тройчы, кажучы:

Я, слуга Божы сьвятар… (імя), прымаю сьвятую і пачэсную Кроў Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Прычасьціўшыся, кажа:

Дакрануўшыся да маіх вуснаў, яно адыме мае бясчынствы і ачысьціць грахі.

Тады сьвятар кліча зноў дыякана:

Дыякане, зноў падыдзі.

Дыякан падыходзіць, робіць паклон і кажа:

Вось падыходжу зноў да несьмяротнага Ўладара і Бога нашага. Дай мне, ойча, пачэсную і сьвятую Кроў Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста.

Сьвятар трымае чашу і дае піць з яе дыякану, кажучы:

Слуга Божы сьвятадыякан… (імя), прымае сьвятую і пачэсную Кроў Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Скончыўшы, сьвятар кажа:

Дыкрануўшыся да тваіх вуснаў, яно адыме твае бясчынствы і ачысьціць грахі.

Сьвятар раздрабляе часткі НІ і КА для прычасьця верных, а дыякан укладае іх у чашу і пакрывае яе пакраўцом. Тады сьвятар дае чашу дыякану, які выходзіць райскімі дзьвярамі, кажучы ўголас:

Са страхам Божым, вераю і любоўю падыходзьце.

Людзі: Блаславёны той, хто прыходзіць у імя Гасподняе. Госпад – Бог, і Ён зьявіўся нам.

Сьвятар бярэ ад дыякана чашу і прычашчае верных, кажучы за кожным разам:

Слуга Божы (Божая) … (імя) прымае сьвятое Цела і пачэсную Кроў Госпада, і Бо-

га, і Збавіцеля нашага Ісуса Хрыста для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Людзі падчас прычашчэньня сьпяваюць:

Цела Хрыстова прыміце, пакаштуйце крыніцы несьмяротнасьці. Алілуя, алілуя, алілуя.

Скончыўшы, сьвятар адносіць чашу на ахвярнік, кажучы:

Дыкрануўшыся да вашых вуснаў, яно адыме вашыя бясчынствы і ачысьціць грахі.

Дыякан укладае астатнія часткі з дыскаса ў чашу і ачышчае яго губкаю, молячыся:

Убачыўшы ўваскрасеньне Хрыстова, паклонімся сьвятому Госпаду Ісусу, адзінаму бязгрэшнаму. Крыжу Твайму пакланяемся, Хрысьце, і сьвятое ўваскрасеньне Тваё ў песьнях славім. Ты – Бог наш, апроч Цябе іншага бога ня знаем, імя Тваё клічам. Прыйдзіце, усе верныя, паклонімся сьвятому ўваскрасеньню Хрыстоваму, бо праз крыж прыйшла радасьць усяму сьвету. Заўжды бласлаўляючы Госпада, славім Ягонае ўваскрасеньне: бо Ён, пацярпеўшы ўкрыжаваньне, сьмерцю сьмерць зваяваў.

Сьвяціся, сьвяціся, Новы Ерусаліме, бо слава Господняя зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне. Ты ж, Чыстая, красуйся, Багародзіца, бо Той, каго Ты нарадзіла, з мёртвых устаў.

Ты, Хрысьце, наша вялікая і сьвятая Пасха, Слова Божае, Мудрасьць і Сіла. Дай, каб нам больш дасканала зьяднацца з Табою ў незаходны дзень валадарства Твайго.

Сьвятар (бласлаўляе людзей): Збаў, Божа, людзей Тваіх і блаславі набытак Твой.

Людзі: Мы бачылі праўдзівае сьвятло, прынялі Духа нябеснага, знайшлі веру праўдзівую, пакланяемся неразьдзельнай Тройцы, бо Яна нас збавіла.

Сьвятар кадзіць сьвятыя дары, кажучы ціха тройчы:

Узьнясіся на нябёсы, Божа, і хай па ўсёй зямлі разыдзецца слава Твая.

Дае дыскас дыякану, які, пакланіўшыся, адносіць яго на прыгатавальнік; а сам бярэ чашу, кажучы ціха:

Блаславёны Бог наш.

Павярнуўшыся да людзей, уголас:

На ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

І адыходзіць да прыгатавальніка.

Людзі: Амін. Хай нашы вусны будуць поўныя хвалы Тваёй, Госпадзе, каб нам пяяць славу Тваю, бо Ты зрабіў нас дастойнымі быць удзельнікамі сьвятых Тваіх, Боскіх, несьмяротных і жыватворчых Тайнаў. Захавай нас у Тваёй сьвятасьці, каб нам увесь дзень навучацца Тваёй справядлівасьці. Алілуя, алілуя, алілуя.

Сьвятар ставіць чашу на прыгатавальнік, кадзіць і адыходзіць да ахвярніка. Дыякан, разьвязаўшы арар, выходзіць і, стаўшы на сваё месца, пачынае літанію.

Дыякан: Устаньце! Атрымаўшы Боскія, сьвятыя, усячыстыя, несьмяротныя, нябесныя і жыватворчыя, страшныя Хрыстовыя тайны, дастойна падзякуем Госпаду.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Папрасіўшы, каб гэты ўвесь дзень быў дасканалы, сьвяты, мірны і бязгрэшны, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Дзякуем Табе, чалавекалюбны Ўладару, Дабрадзею душ і целаў нашых, што Ты сёньня зрабіў нас дастойнымі быць удзельнікамі Тваіх нябесных і несьмяротных Тайнаў. Зрабі простым наш шлях, умацуй нас усіх у страху Тваім, захавай наша жыцьцё, кіруй нашымі крокамі, малітвамі і заступніцтвам усяслаўнае Багародзіцы і Заўсёды Дзевы Марыі і ўсіх сьвятых.

Складае антымінс і робіць знак крыжа Евангельлем.

Уголас: Бо Ты асьвячэньне наша, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Кладзе Евангельле на антымінс.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Пойдзем з мірам.

Людзі: У імя Госпадняе.

Дыякан: Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар, стаўшы перад райскімі дзьвярамі або іконай Хрыста, з дыяканам з правага боку, моліцца:

Госпадзе, які бласлаўляеш тых, што бласлаўляюць Цябе і асьвячаеш тых, што ўскладаюць на Цябе надзею, збаў людзей Тваіх і блаславі набытак Твой; захавай у цэласьці Царкву Тваю і асьвяці тых, што любяць красу дому Твайго. Ты іх услаў Тваёю Боскаю сілаю і не пакінь нас, якія спадзяемся на Цябе. Даруй спакой усяму сьвету, цэрквам Тваім, нашаму беларускаму народу, належным уладам нашым і ўсім людзям Тваім. Бо ўсякае добрае дарэньне і дар дасканалы зыходзяць згары ад Цябе, Айца сьвятла, і мы Табе славу, падзяку і пакланеньне аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Хай будзе імя Госпадняе блаславёнае цяпер і давеку. (Тройчы)

Сьвятар і дыякан ідуць у алтар. Дыякан ідзе да прыгатавальніка спажываць сьвятыя дары, а сьвятар, схіліўшы галаву, моліцца ціха:

Ты – спаўненьне закону і пракокаў, Хрысьце Божа наш: споўніўшы ўвесь провід Айца, напоўні сэрцы нашы радасьцю і вясельлем на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Паварочваецца да людзей і бласлаўляе іх, кажучы голасна:

Блаславеньне Гасподняе хай будзе на вас, ласкаю Яго і чалавекалюбствам на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Слава Табе, Хрысьце Божа, надзея наша, слава Табе.

Людзі: Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін. Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся. Ойча, блаславі.

Сьвятар робіць водпуст.

У нядзелю:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які ўваскрос з мёртвых, малітвамі ўсячыстае свае Маці; сьвятых слаўных і годных пахвалы апосталаў, між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага; сьвятога (-той) … (імя сьвятога патрона царквы) ; сьвятога (-той) … (імя сьвятога, чыя памяць адзначаецца ў гэты дзень) ; сьвятых слаўных і роўных апосталам настаўнікаў славянскіх Кірылы і Мятода; між сьвятымі айца нашага Кірылы, біскупа Тураўскага; сьвятое маці нашае Еўфрасіньні Полацкае, асьветніцы Беларусі і ўсіх сьвятых заступнікаў беларускага народу; сьвятых і праведных богаайцоў Якіма і Ганны і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

Людзі: Амін.

## Водпусты на кожны дзень тыдня

У панядзелак:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае свае Маці; заступніцтвам нябесных сілаў анёльскіх; малітвамі сьвятых слаўных і годных пахвалы апосталаў; між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага ... (Усе іншае як у нядзелю)

У аўторак:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае свае Маці; сьвятога слаўнага прарока, прадвесьніка і Хрысьціцеля Яна; сьвятых слаўных і годных пахвалы апосталаў; між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага...

У сераду і пятніцу:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае свае Маці; сілаю пачэснага і жыватворчага Крыжа; малітвамі сьвятых слаўных і годных пахвалы апосталаў; між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага...

У чацьвер:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае свае Маці, сьвятых слаіных і годных пахвалы апосталаў; між сьвятымі айца нашага Міколы цудатворцы, арцыбіскупа Мірлікійскага; між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага...

У суботу:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае свае Маці; сьвятых слаўных і годных пахвалы апосталаў; сьвятых слаўных і пераможных мучанікаў; сьвятых і баганосных айцоў нашых; між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага...

## Малітвы, якія гаворыць ствятар, калі здымае сьвятую вопратку

Цяпер адпускаеш, Уладару, слугу Твайго ў супакоі, паводле слова Твайго, бо мае вочы бачылі збаўленьне Тваё, якое Ты прыгатаваў перад усімі людзьмі, сьвятло для прасьвятленьня народаў і славу Ізраіля, люду Твайго.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, зжалься над намі. (Тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Усесьвятая Тройца, зжалься над намі: Госпадзе, ачысьці грахі нашы; Уладару, даруй бясчынствы нашы; Сьвяты, наведай і аздараві немачы нашы дзеля Твайго імя.

Госпадзе, зьмілуйся. (Тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Трапар сьвятога Яна Залатавуснага:

Ласка, што з вуснаў тваіх, быццам полымя, зазьзяла, сусьвет асьвяціла, скарбы бескарысьлівасьці сьвету здабыла, вышыню пакорлівасьці паказала. Навучай нас словамі тваімі, ойча Яне Залатавусны, і малі Слова Хрыста-Бога збавіць душы нашыя.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Кандак сьвятога Яна Залатавуснага:

Сьвяты Яне Залатавусны, ты прыняў з неба Боскую ласку, і вуснамі тваімі навучаеш усіх пакланяцца ў Тройцы адзінаму Богу. Належна славім цябе як Боскіх праўдаў настаўніка.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Апякунка хрысьціян бездакорная, Хадайніца да Тварца незаменная, не пагардзі маленьнямі грэшнікаў, але, як добрая, сьпешна прыйдзі на падмогу нам, якія клічам Цябе даверліва. Пачуй хутка малітвы, адгукніся на просьбы, Багародзща, надзейная Заступніца тых, што шануюць Цябе.

Калі хоча, можа гаварыць трапар сьвятога дня.

Госпадзе, зьмілуйся. (12 разоў)

Больш годную пашаны за хэрувімаў і без параўнаньня больш слаўную за сэрафімаў, што, захаваўшы дзявоцтва, радзіла Бога Слова, існую Багародзіцу, Цябе мы ўзьвялічваем.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Малы водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае свае Маці, сьвятых і баганосных айцоў нашых і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец. Амін.

# Малітвы пасьля сьвятога Прычасьця

Слава Табе, Божа. Слава Табе, Божа. Слава Табе, Божа.

Дзякую Табе, Госпадзе Божа мой, што Ты не адкінуў мяне, грэшнага, але палічыў дастойным быць удзельнікам Тваіх сьвятасьцяў. Дзякую Табе, што Ты ўдастоіў мяне прыняць Твае сьвятыя Дары. Але, чалавекалюбны Ўладару, што дзеля нас памёр і ўваскрос і даравaў нам гэтыя страшныя і жыватворчыя Тайны для дабра і асьвячэньня душ і целаў, дай, каб яны былі і мне для аздараўленьня душы і цела, для прагнаньня ўсякага супраціўніка, для прасьвятленьня вачэй сэрца майго, для супакою душэўных маіх сілаў, для веры непахіснай, для шчырай любові, для спаўненьня мудрасьці, для захаваньня Тваіх запаветаў, для павелічэньня Тваёй Боскай ласкі і для асягненьня валадарства Твайго. Каб я, захаваны імі ў Тваёй сьвятасьці, быў заўжды памятны Тваёй ласкі і жыў ужо не для сябе, але для Цябе, нашага Ўладара і Дабрачынца; і, закончыўшы гэтае жыцьцё ў надзеі жыцьця вечнага, дасягнуў непрамінальнага супакою, дзе безупынна чутны голас сьвятых і пануе вечная радасьць тых, што аглядаюць невыказную красу Твару Твайго. Бо Ты – сапраўднае жаданьне і невыказная радасьць тых, што любяць Цябе, Хрысьце Божа, і Табе ўсё стварэньне пяе славу праз усе вякі. Амін.

### Малітва сьвятога Базыля:

Уладару Хрысьце Божа, Цару вякоў і Творча ўсяго, дзякую Табе за ўсе дабрадзействы, якімі Ты мяне абдарыў, і за прыняцьце сьвятых Тваіх і жыватворчых Тайнаў. Прашу Цябе, добры Чалавекалюбча, захавай мяне пад Тваім покрывам у ценю крылаў Тваіх і даруй мне чыстае сумленьне, каб я да канца жыцьця майго мог дастойна прымаць Твае сьвятасьці для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага. Бо Ты – Хлеб жыцьця, Крыніца сьвятасьці і Падаўца усяго добрага, і Табе славу аддаем, разам з Айцом і Духам, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

### Малітва Сямёна Мэтафраста:

Творча мой, які даў мне дабравольна на спажыву Тваё Цела: будучы агнём, што паліць недастойных, не апалі мяне, але ўвайдзі ўва ўсе суставы цела майго і ў сэрца, спалі церне маіх правінаў, ачысьці душу і асьвяці думкі. Умацуй мяне ўсяго, прасьвятлі пяць пачуцьцяў маіх і напоўні мяне Тваім страхам. Заўсёды пакрывай і ахоўвай мяне ад усіх дзеяньняў і словаў душагубных. Ачысьці, абмый і асьвяці мяне; накіруй мяне на праўдзівы шлях, дай мне разуменьне і прасьвятленьне. Учыні мяне жыльлём адзінага Духа, а не жыльлём граху: хай уцякае ад мяне, як ад Твайго дому, якім я стаўся праз прычасьце, усякі злыдзень і ўсякае грэшнае пажаданьне. Клічу на заступнікаў маіх усіх сьвятых Тваіх, анёлаў, Прадвесьніка Твайго, мудрых апосталаў і асабліва Тваю беззаганную Маці: прымі, добрасардэчны Хрысьце мой, іхнія малітвы і ўчыні слугу Твайго сынам сьвятла. Бо Ты, адзіны Добры, – асьвячэньне і сьвятло душ

нашых, і Табе, як нашаму Богу і Ўладару, славу аддаем праз усе дні.

Іншая малітва:

Госпадзе Ісусе Хрысьце, Божа наш, хай Тваё сьвятое Цела будзе мне на жыцьцё вечнае, і Твая пачэсная Кроў на адпушчэньне грахоў. Хай гэтая вось падзяка будзе мне на радасьць, здароўе і пацеху. А ў дзень страшнага Твайго другога прыйсьця зрабі мяне, грэшнага, дастойным стаць па правай руцэ славы Тваёй, малітвамі ўсячыстае Твае Маці і ўсіх сьвятых.

Малітва да Найсьвяцейшай Багародзіцы:

Найсьвятая Ўладарка Багародзіца, сьвятло маёй пацямнелай душы, надзея, покрыва, ахова, пацеха і радасьць мая: дзякую Табе, што Ты дазволіла мне, нягоднаму, прыняць ўсячыстае Цела і пачэсную Кроў Сына Твайго. Ты, што нарадзіла Праўдзівае Сьвятло, прасьвятлі духоўныя вочы сэрца майго! Ты, што нарадзіла Крыніцу несьмяротнасьці, ажыві мяне, амярцьвелага праз грэх! Міласэрнага Бога міласэрная Маці, зьмілуйся нада мною і дай мне жаль і скруху сардэчную, пакорнасьць у думках маіх і вызваленьне ад палону благіх намераў. І зрабі мяне дастойным да апошняй хвіліны жыцьця майго без асуджэньня прымаць сьвятыя і ўсячыстыя Тайны для аздараўленьня душы і цела. Дай мне таксама сьлёзы каяньня і вызнаньня, каб я мог узьвялічваць і славіць Цябе праз усе дні жыцьця майго, бо Ты блаславёная і праслаўленая на ўсе вякі. Амін.

# Асаблівасьці Літургіі ў некаторыя сьвяты Гасподнія

## Узвышэньне Сьвятога Крыжа (14 верасьня)

Уваходны верш (гаворыць сьвятар):

Узьвялічвайце Госпада Бога нашага і пакланяйцеся падножжу ног Ягоных, бо Ён сьвяты!

Людзі: Сыне Божы, што быў укрыжаваны ў целе, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Замест Сьвяты Божа…:

Крыжу Твайму пакланяемся, Уладару наш, і сьвятое ўваскрасеньне Тваё славім.

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае свае Маці; сілаю пачэснага і жыватворчага Крыжа; малітвамі між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## Нараджэньне Госпада нашага Ісуса Хрыста (25 сьнежня)

Уваходны верш:

Ва ўлоньні маім перад заранкай Я нарадзіў Цябе. Кляўся Госпад і не раскаяўся: Ты – сьвятар давеку паводле чыну Мэльхісэдэка.

Людзі: Сыне Божы, што нарадзіўся ад Дзевы, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Замест Сьвяты Божа…:

Усе вы, што ў Хрыста ахрысьціліся, у Хрыста апрануліся. Алілуя.

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які дзеля нашага збаўленьня нарадзіўся ў пячоры і ў ясьлях быў пакладзены, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## Богазьяўленьне (6 студзеня)

Уваходны верш:

Блаславёны Той, хто прыходзіць у імя Гасподняе. Бласлаўляем вас ад дому Гасподняга. Госпад – Бог, і Ён зьявіўся нам.

Людзі: Сыне Божы, што хрысьціўся ў Ярдане, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Замест Сьвяты Божа…:

Усе вы, што ў Хрыста ахрысьціліся, у Хрыста апрануліся. Алілуя.

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які дзеля нашага збаўленьня захацеў дабравольна ў Ярдане хрысьціцца ад Яна, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## Сустрэча Госпада нашага Ісуса Хрыста (2 лютага)

Уваходны верш:

Госпад паказаў збаўленьне сваё, перад людзьмі адкрыў справядлівасьць сваю.

Людзі: Сыне Божы, малітвамі Багародзіцы збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які дзеля нашага збаўленьня захацеў спачыць на руках праведнага Сямёна, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## Вербніца

Уваходны верш:

Блаславёны Той, хто прыходзіць у імя Господняе. Госпад – Бог, і Ён зьявіўся нам.

Людзі: Сыне Божы, што ўсеўся на жарабя, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які дзеля нашага збаўленьня захацеў сесьці на жарабя, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## Узьнясеньне

Уваходны верш:

Бог узьнёсься пад радасныя воклікі, Госпад – пад гучаньне трубаў.

Людзі: Сыне Божы, што ўзьнёсься ў славе, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які дзеля нашага збаўленьня ўзьнёсься ў славе на неба і сеў праваруч Айца, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстан-

тынопальскага і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## Сёмуха

Уваходны верш:

Узьнясіся, Госпадзе, у славе Тваёй: будзем пяяць і славіць магутнасьць Тваю.

Людзі: Суцяшальніку добры, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Замест Сьвяты Божа…:

Усе вы, што ў Хрыста ахрысьціліся, у Хрыста апрануліся. Алілуя.

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які ў выглядзе вогненных языкоў паслаў з неба Духа Сьвятога вучням сваім і апосталам, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## Перамяненьне Гасподняе (6 жніўня)

Уваходны верш:

Госпадзе, зышлі сьвятло Тваё і праўду Тваю: хай яны мяне накіруюць і прывядуць на гару сьвятую Тваю.

Людзі: Сыне Божы, што перамяніўся на гары, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які на гары Табор перамяніўся ў славе перад вучнямі і апосталамі, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

# Асаблівасьці Літургіі ў Вялікдзень і Сьветлы Тыдзень

## Уваходныя малітвы ў Сьветлы Тыдзень

Блаславёны Бог наш спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў. (Тройчы)

Устаўшы да сьвітаньня, жанчыны, што былі з Марыяй, убачылі камень, адвалены ад магілы, і пачулі ад анёла: “Нашто шукаеце сярод мёртвых, быццам чалавека, Таго, хто жыве ў вечным сьвятле? Гляньце, вось пахавальныя покрывы. Дык ідзіце і сьвету абвяшчайце, што Госпад уваскрос, зьнішчыўшы сьмерць, бо Ён – Сын Бога, які збаўляе род людзкі”.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Хоць Ты, Несьмяротны, і зышоў у магілу, Ты зьнішчыў пекла ўладу і ўваскрос пераможна, Хрысьце Божа, жанчынам-міраносіцам кажучы: “Радуйцеся!”, і Тваім апосталам супакой даруючы, Ты, што даеш памерлым уваскрасеньне.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Радуйся, асьвячонае жыльлё Найвышэйшага Бога, бо праз цябе, Багародзіца, была дадзеная радасьць усім, што клічуць: Блаславёная ты, Усячыстая Дзева!

Усячыстаму вобразу Твайму… і г.д. (як у іншыя дні)

## Літургія

Пасьля Блаславёнае валадарства…:

Сьвятар: Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў. (Тройчы)

Людзі: Хрыстос уваскрос з мёртвых… (Тройчы)

Сьвятар: Хай уваскрэсьне Бог і разьбягуцца ворагі Яго, і хай уцякуць ад Яго ўсе ненавісьнікі Яго.

Людзі: Хрыстос уваскрос з мёртвых… (Адзін раз. Так пасьля ўсіх наступных вершаў)

Хай зьнікнуць так, як зьнікае дым, і як тае воск ад агню.

Так хай згінуць грэшнікі ад аблічча Божага, а праведнікі хай узрадуюцца.

Вось дзень, што Госпад стварыў, дзень радасьці і весялосьці для ўсіх нас.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Цяпер і заўсёды, і на векі вякоў. Амін.

Сьвятар: Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў.

Людзі: І тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў.

Уваходны верш:

На зборах вашых блаславіце Бога, Госпада, усе нашчадкі Ізраіля!

Людзі: Сыне Божы, што ўваскрос з мёртвых, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Замест Сьвяты Божа:

Усе вы, што ў Хрыста ахрысьціліся, у Хрыста апрануліся. Алілуя.

## Заканчэньня літургіі

Пасьля Блаславеньне Гасподнае хай будзе на вас…:

Людзі: Амін.

Сьвятар: Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў.

Людзі: І тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў.

Сьвятар (робіць водпуст): Хрыстос праўдзівы Бог наш, які ўваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Яна Залатавуснага, арцыбіскупа Канстантынопальскага і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

Тады кажа ўголас:

Хрыстос уваскрос!

Людзі адказваюць:

Сапраўды ўваскрос!

Гэта паўтараецца тройчы. Пасьля людзі сьпяваюць:

Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў. (Тройчы)

І нам дараваў жыцьцё вечнае, пакланяемся Ягонаму трохдзённаму ўваскрасеньню.

## Асаблівасьці Літургіі ад нядзелі Тамаша да Ўзьнясеньня

Пасьля Блаславёнае валадарства… сьвятар сьпявае два разы трапар Хрыстос уваскрос з мёртвых…. Трэці раз сьпявае да паловы, а людзі заканчваюць: І тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў.

Пасьля прычасьця, замест Мы бачылі праўдзівае сьвятло…: Хрыстос уваскрос з мёртвых….

На заканчэньне, пасьля таго, як сьвятар скажа: Слава Табе, Хрысьце Божа, надзея наша, слава Табе, людзі сьпяваюць тройчы трапар: Хрыстос уваскрос з мёртвых…. Сьвятар робіць водпуст.

Увага: Малітва Ўладару нябесны ад Вялікадня да Сёмухі не гаворыцца.

# БОСКАЯ ЛІТУРГІЯ МІЖ СЬВЯТЫМІ АЙЦА НАШАГА БАЗЫЛЯ ВЯЛІКАГА

Дыякан: Блаславі, ойча.

Сьвятар робіць Евангельлем знак крыжа над ахвярнікам і кажа:

Блаславёнае валадарства Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: У супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: За супакой з вышыняў і збаўленьне душ нашых Госпаду памолімся.

За супакой на ўсім сьвеце, добры стан сьвятых Божых цэркваў і зьяднаньне ўсіх Госпаду памолімся.

За гэтую сьвятую царкву і тых, што з верою, пашанаю і страхам Божым уваходзяць у яе, Госпаду памолімся.

За Сьвятога Айца нашага Сусьветнага біскупа … (імя) Папу Рымскага, дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага … (імя), пачэсных сьвятароў, дыяканаў у Хрысьце, усё духавенства і людзей Госпаду памолімся.

За яго (яе) міласьць … (імя галавы дзяржавы), за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны, Госпаду памолімся.

За Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас Госпаду памолімся.

За гэты горад (гэтую вёску), за ўсе гарады і краіны, і за верных людзей, што жывуць у іх, Госпаду памолімся.

За добрае надвор’е, багаты ўраджай пладоў зямных і за часы спакойныя Госпаду памолімся.

За падарожнікаў па моры, зямлі і ў паветры, за нядужых, тых што церпяць, за зьняволеных і збаўленьне іх Госпаду памолімся.

Каб нам выбавіцца ад усякага гневу, суму і недастатку Госпаду памолімся.

Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (моліцца ціха): Госпадзе Божа наш, моц Твая невыказная, слава Твая невымерная, міласэрнасьць Твая бязьмежная, чалавекалюбства Тваё невымоўнае: у дабрыні Тваёй глянь, Уладару, на нас і на гэтую сьвятую царкву і даруй нам і тым, што моляцца разам з намі, багацьце Тваёй ласкі і спагады.

Уголас: Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

І сьпяваюць першы антыфан, які мяняецца ў залежнасьці ад дня і сьвята.

---

У нядзелі сьпяваецца наступны (Вялікодны) антыфан (Пс 65):

Чытальнік: Сьпявайце Госпаду, уся зямля! Слаўце ў песьнях імя Яго, аддайце хвалу велічы Яго.

Людзі: Малітвамі Багародзіцы, Збавіцелю, збаў нас. (Так пасьля наступных вершаў)

Скажыце Госпаду: якія цудоўныя творы Твае! Дзеля велічы магутнасьці Тваёй дрыжаць перад Табою ворагі Твае.

Уся зямля хай пакланяецца Табе і пяе Табе, хай славіць у песьнях імя Тваё, Усявышні!

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Дзе ёсьць звычай, у нядзелю, а таксама ў суботу і на вялікія сьвяты (апрача сьвятаў Гасподніх) сьпяваюцца наступныя радкі з Пс 102:

Блаславі, душа мая, Госпада: блаславёны Ты, Госпадзе. Блаславі, душа мая, Госпада, і ўсё нутро маё хай славіць імя сьвятое Яго. Блаславі, душа мая, Госпада і не забывай усіх дабрадзействаў Яго. Ён ачышчае ўсе бясчынствы Твае і аздараўляе ўсе немачы твае. Шчодры Бог і міласэрны, доўгацярплівы і багаты на ласку. Блаславі, душа мая, Госпада, і ўсё нутро маё хай славіць імя сьвятое Яго. Блаславёны Ты, Госпадзе.

---

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Божа наш, збаў людзей Тваіх і блаславі набытак Твой, захавай у цэласьці Царкву Тваю, асьвяці тых, што любяць красу дому Твайго: Ты іх услаў Тваёю Боскаю сілаю і не пакінь нас, якія спадзяемся на Цябе.

Уголас: Бо Твая ёсьць дзяржава і Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

І сьпяваюць другі антыфан.

---

У нядзелі (Пс 66):

Чытальнік: Божа, будзь ласкавы да нас і блаславі нас: прасьвятлі нас зьзяньнем твару Твайго і зьмілуйся над намі.

Людзі: Сыне Божы, што ўваскрос з мёртвых, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя. (Так пасьля наступных вершаў)

Каб мы маглі пазнаць на зямлі шлях Твой, сярод людзей усіх збаўленьне Тваё.

Хай славяць Цябе, Божа, усе народы, хай славяць Цябе ўсе людзі.

Людзі: Сыне Божы...

Слава... цяпер... Адзінародны Сыне... (Гл. ніжэй)

Іншы антыфан нядзельны і сьвяточны (Пс 145):

Хвалі, душа мая, Госпада. Праз усё жыцьцё маё буду хваліць Госпада, буду ў песьнях славіць Бога майго, пакуль буду жыць.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на векі вякоў. Амін.

Адзінародны Сыне і Слова Бога, Ты, Несьмяротны, дзеля нашага збаўленьня захацеў прыняць цела ад сьвятое Багародзіцы і заўсёды Дзевы Марыі і, не зазнаўшы зьмены, стаўся чалавекам; Ты быў укрыжаваны, Хрысьце Божа, сьмерцю зьнішчыўшы сьмерць. Будучы адным з Сьвятой Тройцы, роўным славаю Айцу і Сьвятому Духу, збаў нас.

---

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Божа, які даў нам ласку прыносіць Табе ў еднасьці гэтыя супольныя малітвы і які абяцаў выканаць просьбы двух ці трох, што сабраліся ў Тваё імя, выканай просьбы слугаў Тваіх для нашага дабра, даючы нам у гэтым веку пазнаньне Тваёй праўды, а ў будучым даруючы жыцьцё вечнае.

Уголас: Бо Ты добры і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

І сьпяваюць трэці антыфан.

---

Антыфан нядзельны і штодзённы (Пс 94):

Чытальнік: Прыйдзіце, будзем радасна славіць Госпада, будзем пяяць Богу Збавіцелю нашаму.

Людзі:

у нядзелі: Сыне Божы, што ўваскрос з мёртвых, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Або нядзельны трапар належнага тону

у іншыя дні: Сыне Божы, дзіўны ў сьвятых Тваіх, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Чытальнік: Станем з удзячнасьцю перад абліччам Ягоным, у песьнях уславім Яго.

Госпад – Бог вялікі і Ўладар магутны над усёй зямлёй.

У руках Ягоных усе канцы зямлі і вышыні гор належаць Яму.

Ягонае мора – Ён стварыў яго, і сушы рукі Ягоныя далі выгляд.

Людзі: Сыне Божы…

Іншы антыфан сьвяточны і нядзельны (Мц 5:3-12):

У валадарстве Тваім успомні нас, Госпадзе.

Шчасьлівыя ўбогія духам, бо іх ёсьць валадарства нябеснае.Шчасьлівыя тыя, што тужаць, бо яны суцешацца.

Шчасьлівыя ціхія, бо яны атрымаюць у спадчыну зямлю.

Шчасьлівыя тыя, што маюць голад і смагу справядлівасьці, бо яны насыцяцца.

Шчасьлівыя міласэрныя, бо яны зьведаюць міласьць.

Шчасьлівыя чыстыя сэрцам, бо яны ўбачаць Бога.

Шчасьлівыя міратворцы, бо яны будуць звацца сынамі Божымі.

Шчасьлівыя тыя, каго прасьледуюць за праўду, бо іх ёсьць валадарства нябеснае.

Шчасьлівыя вы, калі вас крыўдзяць і прасьледуюць, і кажуць усякую няпраўду на вас дзеля мяне: радуйцеся і цешцеся, бо ўзнагарода ваша ў небе вялікая.

---

Падчас сьпеву трэцяга антыфану сьвятар і дыякан робяць тры паклоны. Сьвятар дае дыякану Евангельле (або, калі няма дыякана, сам бярэ яго), і яны разам выходзяць паўночнымі дзьвярамі з алтара. Стаўшы перад райскімі дзьвярамі, яны ціха кажуць:

Дыякан: Госпаду памолімся.

Сьвятар: Усяўладны Божа наш, які ўстанавіў у небе чыны і хоры анёлаў і арханёлаў дзеля служэньня Тваёй славе, зрабі, каб гэты наш уваход быў таксама ўваходам сьвятых анёлаў, і каб яны разам з намі служылі Табе і славілі Тваю дабрыню. Бо Табе

належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Дыякан: Блаславі, ойча, сьвяты ўваход.

Сьвятар (бласлаўляе): Блаславёны ўваход сьвятых Тваіх на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Дыякан: Амін.

Узьняўшы ўгору Евангельле, кажа голасна:

Мудрасьць, устаньце!

Сьвятар з дыяканам уваходзяць у алтар, а людзі пяюць уваходны верш:

Прыйдзіце, паклонімся і прыпадзем да Хрыста. Сыне Божы, што ўваскрос з мёртвых, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

І адразу пяюць трапары і кандакі, г.зн. песьні ў гонар сьвята, сьвятога дня, патронаў царквы і г.д. Звычайна сьпеў заканчваецца кандаком у гонар Багародзіцы. У нядзелі Вялікага Посту пяецца наступная песьня :

(Тон 8) Магутная Ўладарка Багародзіца, мы, верныя слугі Твае, выбаўленыя Табою

ад бедаў, песьні ўдзячнасьці і перамогі Табе прыносім. Ты ж, маючы сілу неперераможную, ад усякіх напасьцяў выратуй нас, каб нам усклікнуць: “Радуйся, Дзева Маці!”

Сьвятар (у міжчасе моліцца ціха): Сьвяты Божа, які спачываеш сярод сьвятых, якога тройчы сьвятымі галасамі хваляць сэрафімы і славяць хэрувімы, якому пакланяюцца ўсе нябесныя сілы: Ты прывёў усё з нябыту да быцьця, стварыў чалавека на Тваё падабенства і ўпрыгожыў яго ўсякімі Тваімі дарамі; Ты даеш таму, хто просіць, мудрасьць і розум, і не пагарджаеш грэшнікам, але ўстанаўляеш пакуту для збаўленьня; Ты ўдастоіў нас, Тваіх пакорных і нягодных слугаў, у гэтую хвіліну стаць перад славаю Твайго ахвярніка і прыносіць належнае Табе пакланеньне і ўсхваленьне. Прымі, Уладару, з нашых грэшных вуснаў тройчы сьвятую песьню і глянь на нас ласкава; даруй нам нашы правіны, сьвядомыя і несьвядомыя, асьвяці нашы душы і целы і дай, каб мы маглі набожна служыць Табе праз усе дні жыцьця нашага, дзякуючы малітвам сьвятое Багародзіцы і ўсіх сьвятых, якія ад пачатку сьвету Табе дагадзілі.

Дыякан: Блаславі, ойча, час трысьвятога.

Сьвятар (уголас): Бо Ты сьвяты, Божа наш, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды.

Дыякан (павярнуўшыся да людзей) : І на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

І сьпяваюць "Трысьвятое":

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, зжалься над намі. (Тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Сьвяты Несьмяротны, зжалься над намі.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, зжалься над намі.

У некаторыя Гасподнія сьвяты замест "Трысьвятога" сьпяваюцца іншыя песьні.

Сьвятар і дыякан гавораць "Трысьвятое" разам з людзьмі. Пад канец дыякан кажа:

Загадай, ойча.

Сьвятар: Блаславёны Той, хто прыходзіць у імя Госпадняе.

Дыякан: Благаславі, ойча, горнае месца.

Сьвятар (благаслаўляе): Блаславёны Ты на пасадзе валадарства Твайго, што сядзіш на хэрувімах, на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Ідзе на горнае месца, затрымаўшыся збоку ад яго. Калі заканчваюць пяяць “Трысьвятое”, дыякан кажа ўголас:

Будзьма ўважлівыя.

Сьвятар: Мір усім! (Благаслаўляе людзей)

Чытальнік: І твайму духу.

Дыякан: Мудрасьць.

Чытальнік чытае пракімен (выбраныя вершы з псалмаў).

Дыякан: Мудрасьць.

Чытальнік: Чытаньне… (Аб’яўляе назву Апостальскага чытаньня)

Дыякан: Слухайма ўважліва.

Чытальнік чытае прызначаны на гэты дзень Апостал. Калі скончыць, сьвятар кажа:

Мір табе, чытальнік.

Чытальнік: І твайму духу. Алілуя, алілуя, алілуя.

Чытае выбраныя вершы з псалмаў, пасьля кожнага з якіх людзі пяюць “Алілуя”.

У міжчасе дыякан, узяўшы кадзіла і папрасіўшы блаславеньня ў сьвятара, кадзіць алтар, царкву і людзей, а сьвятар моліцца ціха:

Запалі ў сэрцах нашых, чалавекалюбны Ўладару, нязгаснае сьвятло Твайго богапазнаньня, і адчыні вочы нашага розуму, каб нам зразумець Тваё евангельскае прапаведаваньне. Укладзі ў сэрцы нашы страх Тваіх блаславёных прыказаньняў, каб мы, перамогшы ўсе цялесныя пажаданьні, маглі жыць духоўным жыцьцём, думаючы і робячы ўсё, што прыемна Табе. Бо Ты – сьветласьць душ і целаў нашых, Хрысьце Божа, і Табе славу аддаем разам з Тваім адвечным Айцом і з усесьвятым, добрым і жыватворчым Тваім Духам, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Дыякан, скончыўшы кадзіць, падыходзіць да сьвятара і, паказваючы на кнігу Евангельля, кажа:

Блаславі, ойча, дабравесьніка сьвятога апостала і евангеліста... (імя евангеліста)

Сьвятар (бласлаўляе): Бог малітвамі сьвятога, слаўнага і ўсяхвальнага апостала і евангеліста... (імя) хай дасьць табе слова дабравесьціць сілаю вялікаю, для спаўненьня Евангельля любага Сына свайго, Госпада нашага Ісуса Хрыста.

І дае кнігу Евангельля дыякану.

Дыякан: Амін.

Зрабіўшы паклон, дыякан прымае з рук сьвятара Евангельле і, выйшаўшы райскімі дзьвярыма, прыходзіць на назначанае месца. Сьвятар ля ахвярніка, павярнуўшыся да народу, кажа:

Мудрасьць, устаньце, будзем слухаць Сьвятое Евангельле. Мір усім. (Бласлаўляе людзей)

Людзі: І твайму духу.

Дыякан: Чытаньне Сьвятога Евангельля паводле... (імя)

Людзі: Слава Табе, Господзе, слава Табе.

Сьвятар: Слухайма ўважліва.

Дыякан чытае Евангельле. Калі скончыць, людзі пяюць:

Слава Табе, Господзе, слава Табе.

Дыякан падносіць Евангельле да сьвятара, які блаславўляе яго, кажучы:

Мір табе, дабравесьнік.

Тады бярэ Евангельле і адносіць на ахвярнік. Дыякан, стаўшы на сваім месцы, пачынае літанію.

Дыякан: Скажам усе разам ад усяе душы і ад усяе думкі нашае скажам.

Людзі: Господзе, зьмілуйся.

Дыякан: Господзе ўсемагутны, Божа айцоў нашых, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

Людзі: Господзе, зьмілуйся.

Дыякан: Зьмілуйся над намі, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Яшчэ молімся за Сьвятога Айца нашага, Сусьветнага біскупа... (імя) Папу Рымскага, дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага... (імя) і ўсіх у Хрысьце братоў нашых.

Яшчэ молімся за яго (яе) міласьць... (імя галавы дзяржавы), за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны.

Яшчэ молімся за Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас.

Яшчэ молімся за братоў нашых сьвятароў, дыяканаў і манахаў, і ўсіх братоў і сёстраў нашых у Хрысьце.

Яшчэ молімся за годных памяці заснавальнікаў гэтай сьвятой царквы і за ўсіх раней адышоўшых айцоў і братоў нашых, якія тут і на кожным іншым месцы спачываюць.

Яшчэ молімся за дабрачынцаў гэтай сьвятой царквы, за тых, што прыносяць дары, працуюць і сьпяваюць у ёй, і за ўсіх тут прысутных людзей, якія чакаюць ад Цябе багацьця Твайго зьмілаваньня.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Божа наш, прымі шчырыя малітвы слугаў Тваіх і зьмілуйся над намі паводле велічы Тваёй міласэрнасьці; пашлі даброты Твае на нас і на ўсіх людзей Тваіх, якія чакаюць ад Цябе багацьця Твайго зьмілаваньня.

Уголас: Бо Ты міласьцівы і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Літанія за пакліканых (г. зн. тых, што рыхтуюцца да сьвятога хросту).

Дыякан: Памаліцеся, пакліканыя, Госпаду.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Верныя, памолімся за пакліканых, каб Госпад зьмілаваўся над імі.

Каб Ён прасьвятліў іх словам праўды.

Каб даў ім зразумець дабравешчаньне праведнасьці.

Каб зьяднаў іх са сьвятой сваёй, паўсюднай і апостальскай Царквой.

Пакліканыя, галовы вашы Госпаду схіліце.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Божа наш, які жывеш у небе і пазіраеш на ўсе Твае стварэньні: глянь ласкава на слугаў Тваіх, якія рыхтуюцца да хросту і схілілі галовы свае

перад Табою, і пашлі ім лёгкае ярмо; учыні іх пачэснымі членамі Тваёй сьвятой Царквы і зрабі іх дастойнымі вады адраджэньня, адпушчэньня грахоў, вопраткі несьмяротнасьці і пазнаньня Цябе, праўдзівага Бога нашага.

Уголас: Каб і яны разам з намі маглі славіць Тваё пачэснае і велічнае імя, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: Усе пакліканыя, выходзьце; пакліканыя, выходзьце; усе пакліканыя, выходзьце; хай ніхто з пакліканых не застанецца тут!

Сьвятар разгортвае антымінс.

Дыякан: Усе верныя, яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, змілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (ціха): Ты, Госпадзе, паказаў нам гэтую вялікую тайніцу збаўленьня і зрабіў нас, Тваіх нягодных і пакорных слугаў, дастойнымі быць служкамі Твайго сьвятога ахвярніка. Сілаю Сьвятога Твайго Духа настаў нас на гэтую службу, каб нам стаць без асуджэньня перад сьвятой славаю Тваёю і прынесьці табе ахвяру хвалы, бо Ты – той, які дзейнічае ўва ўсіх. Прымі ласкава гэтую ахвяру за нашы грахі і людзкія правіны, і няхай яна будзе прыемная Табе.

Дыякан: Мудрасьць!

Сьвятар (уголас): Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на векі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (ціха): Ты, Божа, у сваёй спагадлівасьці і міласэрнасьці наведаў нашу пакорлівасьць і паставіў нас, Тваіх пакорных, грэшных і нягодных слугаў, перад сьвятой славаю Тваёю, каб нам служыць Твайму сьвятому ахвярніку: сілаю Сьвятога Твайго Духа ўмацуй нас на гэтую службу і дай нам, калі мы адчынім вусны нашы, знайсьці адпаведныя словы, каб клікаць ласку Духа Твайго Сьвятога на гэтыя дары, якія маюць неўзабаве быць прынесеныя Табе.

Дыякан: Мудрасьць.

Сьвятар (уголас): Каб мы, будучы заўсёды пад аховаю Тваёй магутнай улады, Табе славу аддавалі, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

І сьпяваюць Хэрувімскую песьню:

Мы, што ў тайны спосаб прадстаўляем хэрувімаў і Жыватворчай Тройцы тройчысьвятую песьню пяём, адложым цяпер усе жыцьцёвыя клопаты.

Дыякан уваходзіць у алтар, бярэ кадзіла і кадзіць ахвярнік, царкву і ўсіх людзей, гаворачы ціха Псалом 50 (калі няма дыякана, кадзіць сьвятар). У міжчасе сьвятар ціха чытае малітву:

Ніхто, зьвязаны цялеснымі пажаданьнямі і ўцехамі, не дастойны прыбліжацца да Цябе і служыць Табе, Уладару славы; бо служыць Табе – нешта вялікае і страшнае нават для саміх анёльскіх сілаў. Нягледзячы, аднак, на гэта, дзеля невыказнага і бязьмежнага Твайго чалавекалюбства, Ты, не зазнаўшы ніякай зьмены ці парушэньня Тваёй Боскай прыроды, стаў чалавекам і быў нам Найвышэйшым Сьвятаром і, будучы Ўладаром усіх, даручыў нам сьвятарскае выкананьне гэтай службы і бяскроўнай ахвяры. Ты адзін, Госпадзе, валодаеш усім на небе і на зямлі; Цябе, Уладара сэрафімаў і Цара Ізраільскага, носяць на хэрувімскім пасадзе. Ты адзіны сьвяты і сярод сьвятых спачываеш. Табе малюся, адзінаму добраму і заўсёды гатоваму ласкава выслухаць мяне:глянь на мяне, грэшнага і нягоднага слугу

Твайго, і ачысьці маю душу і сэрца ад благога сумленьня; сілаю Сьвятога Твайго Духа – паколькі я апрануты ў ласку сьвятарства, – зрабі мяне дастойным стаць перад Тваім сьвятым ахвярнікам і прыносіць Тваё сьвятое і ўсячыстае Цела і пачэсную Кроў. Да Цябе прыходжу, схіліўшы голаў, і малюся Табе: не адвярні Твару Твайго сьвятога ад мяне і не адлучы мяне ад дзяцей Тваіх, але дазволь, каб я, Твой грэшны і нягодны слуга, прынёс Табе гэтыя дары. Бо Ты сам Той, хто ахвяруе і каго ахвяруюць, і хто прымае і каго раздаюць, Хрысьце Божа наш, і Табе славу аддаем, разам з адвечным Тваім Айцом і з усесьвятым, добрым і жыватворчым Тваім Духам, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Дыякан, скончыўшы кадзіць, стае побач са сьвятаром. Сьвятар, узьняўшы рукі, кажа:

Мы, што ў тайны спосаб прадстаўляем хэрувімаў і Жыватворчай Тройцы тройчы сьвятую песьню пяём, адложым цяпер усе жыцьцёвыя клопаты.

Дыякан: Каб нам прыняць Уладара ўсіх, якога нябачна суправаджаюць анёльскія сілы. Алілуя, алілуя, алілуя.

У Чысты (Вялікі) Чацьвер замест “Мы, што ў тайны спосаб…” сьвятар гаворыць:

Зрабі мяне сёньня, Сыне Божы, удзельнікам Тваёй Тайнай вячэры; я ня здраджу ворагам Тваім тайны і ня дам пацалунку, як Юда, але як разбойнік вызнаю Цябе: Успомні мяне, Госпадзе, у Тваім валадарстве. Алілуя, алілуя, алілуя.

У падобны спосаб у Вялікую Суботу гавораць:

Хай маўчыць усё стварэньне, хай стаіць у страху і хваляваньні, і хай нішто зямное не кранае яго, бо вось Уладар і Госпад тых, што пануюць, прыходзіць, каб прынесьці ў ахвяру сябе і даць сябе на спажыву верным. Перад Ім ідуць хоры анёлаў з усімі пачаткамі, уладамі, шматвокія хэрувімы і шасьцікрылыя сэрафімы, закрываючы твары свае і сьпяваючы: Алілуя, алілуя, алілуя.

Абодва робяць паклон. Гэта паўтараюць тройчы. Тады, пацалаваўшы ахвярнік і пакланіўшыся ў бок людзей, адыходзяць да прыгатавальніка, кажучы:

Божа, ачысьці мяне, грэшнага, і зьмілуйся нада мною.

Сьвятар кадзіць прынесеныя дары, дае пакравец і дыскас дыякану, а сам бярэ чашу, кажучы:

Узьніміце рукі вашыя да сьвятых рэчаў і блаславіце Госпада.

Абодва выходзяць паўночнымі дзьвярамі.

Дыякан: Усіх вас, прававерных хрысьціянаў, хай успомніць Госпад Бог у валадарстве сваім на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Сьвятар: Сьвятога Айца нашага Сусьветнага біскупа… (імя) Папу Рымскага, дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага … (імя), пачэсных сьвятароў, дыяканаў у Хрысьце і ўсё духавенства; яго (яе) міласьць … (імя галавы дзяржавы), урад і належныя ўлады гэтай краіны; Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ; заснавальнікаў і дабрачынцаў гэтай сьвятой царквы; вас і ўсіх прававерных хрысьціянаў хай успомніць Госпад Бог у сваім валадарстве на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін. Каб нам прыняць Уладара ўсіх, якога нябачна суправаджаюць анёльскія сілы. Алілуя, алілуя, алілуя.

Сьвятар і дыякан уваходзяць у алтар. Дыякан кажа ціха:

Хай Госпад Бог успомніць сьвятарства тваё ў сваім валадарстве.

Сьвятар кажа дыякану:

Хай Госпад Бог успомніць сьвятадыяканства тваё ў сваім валадарстве, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Сьвятар ставіць на ахвярнік чашу, а таксама дыскас, узяўшы яго ад дыякана, здымае з іх малыя пакраўцы і пакрывае абодва вялікім пакраўцом, кадзіць і моліцца:

Высакародны Язэп, зьняўшы з дрэва Тваё ўсячыстае цела, спавіўшы яго ў чыстае палатно з духмянасьцямі, у магіле новай паклаў.

Пакажы, Госпадзе, з ласкі Тваёй спагаду Сыёну: хай муры Ерусаліму будуць зноў узьнесеныя. Тады глянеш прыхільна на правыя ахвяры, дары і цэлапаленьні, тады ўскладуць цялят на Твой ахвярнік.

Тады зьвяртаецца да дыякана:

Успомні мяне, браце і спаўслужыцелю.

Дыякан: Няхай успомніць Госпад Бог сьвятарства тваё ў валадарстве сваім.

Сьвятар: Памаліся за мяне, спаўслужыцелю мой.

Дыякан: Дух Сьвяты зыйдзе на цябе і сіла Ўсявышняга ацяніць цябе.

Сьвятар: Той самы Дух хай садзейнічае нам праз усе дні жыцьця нашага.

Дыякан: Успомні мяне, ойча сьвяты.

Сьвятар: Няхай успомніць цябе Госпад Бог у валадарстве сваім, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Баслаўляе дыякана, які выходзіць з алтара паўночнымі дзьвярамі і, стаўшы на сваім месцы, пачынае літанію:

Дыякан: Дапоўнім малітву нашу Госпаду.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: За прынесеныя пачэсныя дары Госпаду памолімся.

За гэтую сьвятую царкву і ўсіх, што з вераю, пашанаю і страхам Божым уваходзяць у яе, Госпаду памолімся.

Каб нам выбавіцца ад усякага гневу, суму і недастатку, Госпаду памолімся.

Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Каб увесь гэты дзень быў дасканалы, сьвяты, мірны і бязгрэшны, у Госпада просім.

Людзі: Дай нам, Госпадзе. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Анёла спакою, вернага настаўніка, апекуна душ і целаў нашых у Госпада просім.

Прабачэньня і адпушчэньня грахоў і правінаў нашых у Госпада просім.

Усяго, што добрае і карыснае для душ нашых, і супакою для сьвету у Госпада просім.

Каб далейшы цяг жыцьця нашага ў супакоі і пакаяньні правесьці, у Госпада просім.

Хрысьціянскага канца жыцьця нашага, бязбольнага, бездакорнага, спакойнага і добрага адказу на страшным судзе Хрыстовым просім.

Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Госпадзе, Божа наш, які стварыў нас і ўвёў у гэтае жыцьцё, паказаў нам шляхі збаўленьня і даў нам аб’яўленьне нябесных тайнаў: Ты – той, які сілаю Сьвятога Твайго Духа паклікаў нас на гэтую службу. Дзеля гэтага, Госпадзе, у дабрыні Тваёй дай нам быць дастойнымі слугамі Твайго Новага

Запавету і выканаўцамі Тваіх Тайнаў; дзеля вялікай Тваёй міласэрнасьці прымі нас, якія набліжаемся да Твайго сьвятога ахвярніка, і зрабі нас годнымі прыносіць Табе гэтую духоўную ахвяру за нашы грахі і людзкія правіны і, прыняўшы яе на Твой нябесны духоўны ахвярнік, як адмысловую духмянасьць духоўную, пашлі нам узамен ласку Твайго Сьвятога Духа. Глянь на нас, Госпадзе, і на гэтую службу і прымі яе так, як Ты прыняў дары Авеля, ахвяры Ноя, цэлапаленьні Абрагама, сьвятарскія службы Майсея і Аарона, ахвяры за супакой Самуіла. Як Ты ласкава прыняў ад сьвятых Тваіх апосталаў гэтую сапраўдную службу, так у дабрыні Тваёй прымі і гэтыя дары з нашых грэшных рук, каб мы, аказаўшыся дастойнымі служыць без заганы Твайму сьвятому ахвярніку, маглі атрымаць узнагароду верных і разважных распарадчыкаў у страшны дзень Тваёй справядлівай расплаты.

Уголас: Міласэрнасьцю адзінароднага Сына Твайго, з якім блаславёны Ты і Твой усесьвяты, добры і жыватворчы Дух, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Мір усім! (Бласлаўляе людзей)

Людзі: І твайму духу.

Дыякан: Будзем любіць адзін аднаго, каб нам аднадушна вызнаваць.

Людзі: Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, Тройцу адзінасутную і неразьдзельную.

Сьвятар робіць тры паклоны, кажучы за кожным разам:

Буду любіць Цябе, Госпадзе, сіла мая, умацаваньне маё і прытулак мой.

Потым цалуе вялікі пакравец над дыскасам і чашаю, а таксама край ахвярніка, бярэ пакравец у рукі і зьлёгку патрасае ім над дарамі.

Дыякан: Дзьверы, дзьверы! У мудрасьці будзьма ўважлівыя!

Людзі: Веру ў адзінага Бога Айца, усемагутнага, Творцу неба і зямлі, бачнага ўсяго і нябачнага. І ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, адзінароднага, ад Айца народжанага перад усімі вякамі; Сьвятло ад Сьвятла, праўдзівага Бога ад праўдзівага Бо-

га, народжанага, нястворанага, адзінасутнага з Айцом, праз якога ўсё стала быць. Ён дзеля нас людзей і дзеля нашага збаўленьня зышоў з неба, прыняў цела ад Духа Сьвятога і Марыі Дзевы і стаўся чалавекам. Быў укрыжаваны за нас пры Понцкім Пілаце, цярпеў і быў пахаваны. І на трэці дзень уваскрос згодна з Пісаньнямі; і ўзышоў на неба, і сядзіць па правай руцэ Айца; і зноў прыйдзе ў славе судзіць жывых і мёртвых, і Яго валадарству ня будзе канца. Веру ў Духа Сьвятога, Госпада жыватворчага, які ад Айца паходзіць; якому належыцца пакланеньне і слава разам з Айцом і Сынам; які гаварыў праз пракокаў. У адзіную, сьвятую, паўсюдную і апостальскую Царкву. Вызнаю адзіны хрост для адпушчэньня грахоў. Чакаю ўваскрасеньня мёртвых і жыцьця будучага веку. Амін.

Сьвятар гаворыць Вызнаньне веры разам з людзьмі, пасьля цалуе пакравец і адкладае яго, кажучы:

Ласка Госпада.

Дыякан: Станем добра, станем са страхам, уважліва сьвятое ахвяраваньне ў міры прыносіць.

Дыякан ідзе ў алтар і, стаўшы з правага боку сьвятара, бярэ рыпіду і павявае ёю лёгка над дарамі.

Людзі: Дар міру, ахвяру хвалы.

Сьвятар: Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста, любоў Бога Айца і супольнасьць Сьвятога Духа хай будуць з усімі вамі. (Блаславуляе людзей)

Людзі: І з духам тваім.

Сьвятар: Узьнімем угору сэрцы нашыя.

Людзі: Мы ўзьнялі іх да Госпада.

Сьвятар: Падзякуем Госпаду.

Людзі: Годна і справядліва ёсьць пакланяцца Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, Тройцы адзінасутнай і неразьдзельнай.

Сьвятар (ціха): Уладару Госпадзе, Божа Ойча ўсемагутны, Ты годны ўсякай хвалы! Сапраўды дастойна, справядліва і адпаведна велічы сьвятасьці Тваёй Цябе хваліць, Табе пяяць, Цябе бласлаўляць, Табе пакланяцца, Табе дзякаваць, Цябе славіць як адзінага праўдзівага Бога і Табе прыносіць

з сэрцам скрушлівым і душой пакорнай гэтую нашу духоўную ахвяру, бо Ты – той, які даравaў нам пазнаньне Тваёй праўды. Хто сапраўды здольны належна апісаць магутнасьць Тваю, зрабіць чутнай хвалу Тваю, расказаць аб усіх цудах, якія Ты чыніш у кожны час? Уладару ўсіх, Госпадзе неба і зямлі і ўсіх стварэньняў бачных і нябачных, Ты сядзіш на пасадзе славы і ўзіраешся ў бязьмежныя далі, адвечны, нябачны, недаступны, неабдымны, нязьменны; Ты – Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста, Вялікага Бога і Збавіцеля, надзеі нашай, які зьяўляецца вобразам Тваёй дабрыні, вернай пячаткаю Твайго падабенства – паказваючы ў Сабе Цябе, Ойча, – Словам жывым, праўдзівым Богам, спрадвечнай Мудрасьцю, Жыцьцём, Асьвячэньнем, сапраўдным Сьвятлом. Праз Яго Дух Сьвяты абʼявіўся – Дух праўды, Дар усынаўленьня, парука будучай спадчыны, пачатак вечных дабротаў, жыватворчая сіла, крыніца сьвятасьці, сілаю якога ўсякае разумнае і адухоўленае стварэньне служыць Табе і безупынна Цябе хваліць. Бо Табе служыць увесь сусьвет: Цябе хваляць анёлы, арханёлы, пасады, гаспадарствы, пачаткі, улады, сілы і шматвокія хэрувімы, навокал Цябе стаяць сэрафімы – шэсьць крылаў у кожнага: двума засланяюць твары свае, дву-

ма ногі і двума лётаюць, – безупынна пера-клікаючыся між сабою і несьціханымі гала-самі,

Уголас: Пераможную песьню пяюць, усклікаючы, прыпяваючы і кажучы.

Дыякан, адклаўшы рыпіду, бярэ з дыскаса зор-ку, стукае ёю накрыж аб дыскас і адкладае ўбок.

Людзі: Сьвяты, сьвяты, сьвяты Госпад сіл. Неба і зямля поўныя хвалы Тваёй. Га-санна на вышынях. Блаславёны Той, хто прыходзіць у імя Гасподняе. Гасанна на вы-шынях.

Сьвятар (ціха): З гэтымі блаславёнымі сіламі, чалавекалюбны Ўладару, і мы, грэш-ныя, усклікаем, кажучы: Сапраўды Ты сьвяты і ўсесьвяты і праведны ва ўсіх учынках Тваіх, і няма меры велічы славы Тваёй, бо праўдзі-вым судом Ты справядліва навёў на нас усё, што здарылася з намі. Ты, Божа, стварыў ча-лавека з пылу зямнога і, ушанаваўшы яго вобразам Твайго падабенства, пасяліў яго ў раі асалоды, абяцаючы несьмяротнае жыцьцё і карыстаньне вечнымі дабротамі ўзамен за паслушэнства Тваім прыказань-ням. Калі ж ён, паддаўшыся зьмяінай спаку-

се, не паслухаўся Цябе, праўдзівага Бога, які яго стварыў, і сваім праступкам аддаў сябе пад уладу сьмерці, Ты, Божа, справядлівым Тваім судом выгнаў яго з раю на гэты сьвет і вярнуў у зямлю, з якой ён быў узяты, устанаўляючы яму збаўленьне праз адраджэньне ў самім Хрысьце Тваім. Бо Ты, Добры, не адвярнуўся зусім ад стварэньняў Тваіх і не забыў твораў рук Тваіх, але наведаў іх шматлікімі спосабамі дзеля ласкавай міласэрнасьці Тваёй: прарокаў пасылаў, цуды чыніў праз сьвятых Тваіх, якія ў кожным пакаленьні рабілі прыемнае Табе; гаварыў да нас вуснамі слуг Тваіх прарокаў, прадвяшчаючы будучае збаўленьне; даў закон на падмогу і ўстанавіў анёлаў-апекуноў. Калі ж споўніўся час, Ты прамовіў да нас праз самога Сына Твайго, якім Ты вякі стварыў. Ён, будучы спрадвечным Богам, зьзяньнем славы Тваёй і вобразам Твайго падабенства, утрымліваючы ўсё ў існаваньні словам сілы сваёй, не палічыў за здабытак быць роўным Табе, Богу і Айцу, але зьявіўся на зямлі і пажыў сярод людзей. Узяўшы цела ад сьвятое Дзевы, Ён спустошыў Сябе, прыняўшы выгляд слугі, стаўшыся падобным да цела нашай пакорлівасьці, каб учыніць нас падобнымі да вобразу сваёй славы. Паколькі праз чалавека грэх прыйшоў на зямлю, а з грэхам

сьмерць, адзінародны Сын Твой, які прабывае ва ўлоньні Тваім, Божа і Ойча, захацеў нарадзіцца ад жанчыны, сьвятой Багародзіцы і Заўсёды Дзевы Марыі, – падпарадкаваўшы Сябе закону, – і асудзіць грэх целам сваім, каб тыя, што памерлі ў Адаме, ажылі ў самім Хрысьце Тваім. Пажыўшы на гэтым сьвеце, даўшы збавенныя прыказаньні і адвярнуўшы нас ад ідальскай маны, Ён прывёў нас да пазнаньня Цябе, праўдзівага Бога і Айца, набыўшы нас Сабе і зрабіўшы нас людзьмі выбранымі, уладарным сьвятарствам, народам сьвятым; і ачысьціўшы нас вадою і асьвяціўшы Духам Сьвятым, даў Сябе ўзамен за сьмерць, пад уладаю якое мы, зьняволеныя грахом, прабывалі. Зышоўшы Крыжом у пекла, каб напоўніць сабою ўсё, Ён суняў болі сьмерці; і ўваскросшы на трэці дзень – бо немагчыма было ўтрымаць у тленнасьці Ўладара жыцьця – устанавіў шлях да ўваскрасеньня кожнаму чалавеку, сам стаўшыся першынцам з тых, што заснулі, першародным з мёртвых, каб мець пяршынства ва ўсім; і ўзышоўшы на неба, Ён сеў на вышыні па правай руцэ Тваёй магутнасьці, адкуль прыйдзе даць кожнаму паводле ягоных заслугаў. Для нас жа Ён пакінуў вось гэты ўспамін сваіх збавенных мукаў, які мы выконваем згодна з Ягонымі запаветамі.

Перад тым, як ісьці на сваю дабравольную, вечнапамятную і жыватворчую сьмерць, у ноч, калі Ён аддаў Сябе за жыцьцё сьвету, Ён узяў хлеб у свае сьвятыя і бязьвінныя рукі і, ахвяраваўшы яго Табе, Богу і Айцу, аддаўшы падзяку, паблаславіўшы (бласлаўляе хлеб), асьвяціўшы і разламаўшы яго,

Уголас: Даў сьвятым сваім вучням і апосталам, кажучы:

Паказвае правай рукой на хлеб:

БЯРЫЦЕ, ЕШЦЕ, ГЭТА ЦЕЛА МАЁ, ШТО ЗА ВАС ЛОМІЦЦА ДЛЯ АДПУШЧЭНЬНЯ ГРАХОЎ.

Людзі: Амін.

Сьвятар і дыякан робяць глыбокі паклон. Пасьля сьвятар кажа ціха:

У падобны спосаб, узяўшы чашу плоду вінаграднага, зьмяшаўшы, аддаўшы падзяку, паблаславіўшы (бласлаўляе чашу) і асьвяціўшы яе,

Уголас: Даў сьвятым сваім вучням і апосталам, кажучы:

Паказвае на чашу:

ПІЦЕ З ЯЕ ЎСЕ, ГЭТА КРОЎ МАЯ НОВАГА ЗАПАВЕТУ, ШТО ЗА ВАС І ЗА МНОГІХ ПРАЛІВАЕЦЦА ДЛЯ АДПУШЧЭНЬНЯ ГРАХОЎ.

Людзі: Амін.

Сьвятар і дыякан робяць глыбокі паклон.

Сьвятар (ціха): Рабіце гэта на Мой успамін: кожны раз, калі вы ясьцё гэты хлеб і п’еце з гэтае чашы, вы прыгадваеце Маю сьмерць і вызнаеце Маё ўваскрасеньне.

Таму, Уладару, успамінаючы Ягоныя збавенныя мукі, жыватворчы крыж, трохдзённае пахаваньне, уваскрасеньне з мёртвых, узыход на неба, сядзеньне па правай руцэ Цябе, Бога і Айца, слаўнае і страшнае Ягонае другое прыйсьце,

Дыякан, склаўшы накрыж рукі, бярэ дыскас і чашу і падымае іх, а сьвятар кажа:

Прыносім Табе Твае ад Тваіх дзеля ўсіх і за ўсё.

Людзі: Цябе хвалім, Цябе бласлаўляем,

Табе дзякуем, Госпадзе, і молімся Табе, Божа наш.

Дыякан ставіць чашу і дыскас на месца, а сьвятар моліцца ціха:

Дзеля гэтага, Усесьвяты Ўладару, і мы, грэшныя і нягодныя слугі Твае, што ўдастоіліся служыць Твайму сьвятому ахвярніку не дзеля праведных учынкаў нашых – бо мы не зрабілі нічога добрага на зямлі, – але дзеля Тваёй міласэрнасьці і шчодрасьцяў Тваіх, якімі Ты багата надарыў нас, прыбліжаемся сьмела да Твайго сьвятога ахвярніка і, прынесшы існасьць сьвятога Цела і Крыві Хрыста Твайго, Табе молімся і клічам Цябе: Сьвяты Сьвятых, з добрай ласкі Тваёй дай, каб Дух Твой Сьвяты зышоў на нас і на гэтыя прынесеныя дары, і каб паблаславіў іх, асьвяціў і ўчыніў.

Сьвятар і дыякан робяць тры паклоны.

---

Дзе ёсьць звычай, можна гаварыць:

Сьвятар: Госпадзе, што ў трэцюю гадзіну паслаў Тваім апосталам Духа Твайго Сьвятога, не адымі Яго, Добры, і ад нас, але аднаві нас, якія молімся Табе.

Дыякан: Сэрца чыстае ствары ўва мне, Божа, і дух правы абнаві ў нутры маім. (Робяць паклон)

Сьвятар: Госпадзе, што ў трэцюю гадзіну… (Робяць паклон)

Дыякан: Не адкінь мяне ад аблічча Твайго, і Духа Твайго Сьвятога не адымі ад мяне. (Паклон)

Сьвятар: Госпадзе, што ў трэцюю гадзіну… (Паклон)

---

Дыякан, паказваючы арарам на сьвяты хлеб:

Блаславі, ойча, сьвяты хлеб.

Сьвятар (блаславляе): Хлеб гэты самім пачэсным Целам Госпада, Бога і Збавіцеля нашага Ісуса Хрыста.

Дыякан: Амін. Блаславі, ойча, сьвятую чашу.

Сьвятар (блаславляе): Чашу ж гэтую самою пачэснай Крывёю Госпада, Бога і Збавіцеля нашага Ісуса Хрыста.

Дыякан: Амін. Блаславі, ойча, абое.

Сьвятар (блаславўляе абое): Пралітай за жыцьцё сьвету.

Дыякан: Амін, амін, амін.

Робяць зямны паклон.

Сьвятар: Нас жа ўсіх, якія спажываем ад адзінага Хлеба і Чашы, зьяднай аднаго з адным у супольнасьці адзінага Сьвятога Духа; і хай ніводнаму з нас прыняцьце сьвятога Цела і Крыві Хрыста Твайго ня будзе на суд ці асуджэньне, але каб маглі мы знайсьці ласку і спагаду разам з усімі сьвятымі, што ў кожным веку чынілі прыемнае Табе: з праайцамі, айцамі, патрыярхамі, прарокамі, дабравесьнікамі, мучанікамі, вызнаўцамі, настаўнікамі, і з усякай душой праведнай, што ў веры памерла;

Узяўшы кадзіла, кадзіць сьвятыя дары, кажучы ўголас:

Асабліва з найсьвятою, усячыстаю, найблаславёнаю, слаўнаю Ўладаркаю нашаю Багародзіцаю і заўсёды Дзеваю Марыяй.

Дыякан, узяўшы кадзіла ад сьвятара, кадзіць вакол ахвярніка.

Людзі сьпяваюць песьню ў гонар Багародзіцы. Звычайна сьпяваецца наступная песьня:

У Табе радуецца, Поўная Ласкі, усякае стварэньне – сабор анёлаў і род людзкі, – асьвячаны хораме і раю духоўны, пахвала дзеваў; ад Цябе Бог прыняў цела і стаўся Дзіцяткам, Бог наш спрадвечны: улоньне Тваё Ён зрабіў пасадам сваім, і нутро Тваё Ён учыніў больш прасторным за неба. У Табе радуецца, Поўная Ласкі, усякае стварэньне: слава Табе.

Сьвятар (ціха): Са сьвятым Янам прарокам, Прадвесьнікам і Хрысьціцелем; са сьвятымі, слаўнымі і годнымі пахвалы апосталамі; са сьвятым (-тою)... (імя), чыю памяць сьвяткуем, і з усімі сьвятымі, малітвамі якіх наведай нас, Божа.

І ўспомні ўсіх, што раней заснулі ў надзеі ўваскрасеньня і жыцьця вечнага.

Успамінае пайменна памерлых, каго хоча.

Яшчэ молімся Табе: успомні, Госпадзе, сьвятую Тваю, паўсюдную і апостальскую Царкву, што распасьціраецца ад канца да канца сьвету, і супакой яе, якую Ты заснаваў

сьвятою Тваёю Крывёю; і гэты сьвяты дом умацуй да сканчэньня веку. Успомні, Госпадзе, тых, што прынесьлі Табе гэтыя дары, і тых, праз каго і за каго яны прынесеныя. Успомні, Госпадзе, тых, што робяць дабро і працуюць у сьвятых Тваіх цэрквах і памятаюць пра ўбогіх: пашлі ім узамен Твае багатыя і нябесныя дары, даючы ім замест зямных скарбаў нябесныя, замест дачасных – вечныя, замест тленных – нятленныя.

Успомні, Госпадзе, тых, што жывуць у пустынях, у горах, у пячорах і шчылінах зямных. Успомні, Госпадзе, тых, што набожна прабываюць у дзявоцтве, пастох і чыстым жыцьці. Успомні, Госпадзе, належныя нашыя ўлады, даруй ім глыбокі і неад’емны супакой, укладзі ў сэрцы іх добрыя думкі пра Царкву Тваю і пра ўсіх людзей Тваіх, каб мы ў цішыні іх маглі пражыць жыцьцё наша ціха і спакойна, з усякай набожнасьцю і ў чысьціні. Успомні, Госпадзе, усякае начальства, братоў і сёстраў нашых на дзяржаўнай службе і ў войску; захавай добрых у Тваёй дабрыні, благіх учыні добрымі ласкаю Тваёю.

Успомні, Госпадзе, прысутных тут людзей і тых, што адсутнічаюць дзеля важкіх прычын, і зьлітуйся над імі і ўсімі намі павод-

ле вялікай Тваёй міласэрнасьці; напоўні склады іх усякім дабром, сужэнствы іх умацуй у спакоі і згодзе; будзь апекуном дзетак, настаўнікам моладзі, падтрымкай старых; дай суцяшэньне маладушным, расьцярушаных зьбяры; тых, што паддаліся спакусе, навярні і зьяднай з Тваёй сьвятой, паўсюднай і апостальскай Царквой; выбаў тых, што церпяць ад духаў нячыстых; будзь з тымі, што падарожнічаюць па моры, зямлі і ў паветры; барані ўдоваў, за сірот заступайся, вызвалі палонных, аздараві хворых; будзь памятлівы, Божа, тых, што пад судом, у вязьніцах, на катаржных работах і на выгнаньні, і ва ўсякай патрэбе, бядзе і цяжкіх абставінах, і ўсіх тых, якія маюць патрэбу ў Тваёй вялікай міласэрнасьці; тых, што любяць нас і ненавідзяць нас, і тых, што прасілі нас, недастойных, маліцца за іх; і ўсіх людзей Тваіх успомні, Госпадзе Божа наш, і пашлі ім багацьце Твайго зьмілаваньня, даруючы ім спаўненьне просьбаў дзеля іхняга збаўленьня. І калі мы каго прамінулі дзеля няведаньня, або праз забыцьцё, або дзеля мноства імёнаў, Ты, Божа, які ведаеш кожнага век і імя ад улоньня маці, сам іх успомні: бо Ты, Госпадзе, помач бездапаможным, надзея зьняверaных, збавіцель тых, што гінуць у бурах, прыстанішча падарожнікаў, лекар нядужых.

Дык будзь усім для ўсіх, ведаючы кожнага просьбу, дом і патрэбу. Выбаў, Госпадзе, гэты горад і ўсякі горад і краіну ад голаду, пошасьці, землятрусу, паводкі, агню, мяча, нападу ворагаў і братабойчай вайны.

Уголас: Насамперш успомні, Госпадзе, Сьвятога Айца нашага, Сусьветнага біскупа... (імя) Папу Рымскага; і дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага … (імя). Захавай іх для сьвятых Тваіх цэркваў у супакоі, цэласьці, добрай славе, здароўі і даўгалецьці, каб яны маглі верна навучаць нас словам Тваёй праўды.

Людзі: І ўсіх, і ўсё.

Сьвятар (ціха): Успомні, Госпадзе, слугу Божага (слуг Божых) … (успамінае па імю жывых, каго хоча)

Успомні, Госпадзе, у Тваёй вялікай міласэрнасьці і маю недастойнасьць, і адпусьці мне ўсякую правіну вольную і міжвольную, і не ўстрымай дзеля маіх грахоў ласкі Духа Твайго Сьвятога ад прынесеных тут дароў.

Успомні, Госпадзе, сьвятароў, дыяканаў у Хрысьце і ўсё духавенства, і не паса-

ром ніводнага з нас, якія стаім вакол Твайго сьвятога ахвярніка. Наведай нас, Госпадзе, у Тваёй дабрыні і аб’явіся нам у багацьці шчодрасьцяў Тваіх: даруй нам памяркоўнае і прыемнае надвор’е, пашлі дажджы мірныя на зямлю, каб яна магла прынесьці багаты ўраджай; блаславі круг году ласкі Тваёй; спыні разлады царкоўныя, суцішы хваляваньні народныя, усякія праявы ілжывых вучэньняў хутка патушы сілаю Сьвятога Твайго Духа. Прымі нас у Тваё валадарства, зрабіўшы нас дзецьмі сьвятла, дзецьмі дня; і дай нам любоў Тваю, Госпадзе Божа наш, які ўсё даў нам.

Уголас: І дай нам адзінымі вуснамі і адзіным сэрцам славіць і выхваляць Тваё пачэснае і велічнае імя, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: І хай будуць міласьці вялікага Бога і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста з усімі вамі. (Бласлаўляе людзей)

Людзі: І з духам тваім.

Дыякан, узяўшы блаславеньне, выходзіць на звычайнае месца і пачынае літанію.

Дыякан: Успомніўшы ўсіх сьвятых, яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: За прынесеныя і асьвячаныя пачэсныя дары Госпаду памолімся.

Каб чалавекалюбны Бог наш, прыняўшы іх на свой сьвяты, нябесны і духоўны ахвярнік, як адмысловую духмянасьць духоўную, паслаў нам узамен сваю Боскую ласку і дар Сьвятога Духа, памолімся.

Каб нам выбавіцца ад усякага гневу, суму і недастатку, Госпаду памолімся.

Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Каб увесь гэты дзень быў дасканалы, сьвяты, мірны і бязгрэшны, у Госпада просім.

Людзі: Дай нам, Госпадзе. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Анёла спакою, вернага настаўніка, апекуна душ і целаў нашых у Госпада просім.

Прабачэньня і адпушчэньня грахоў і правінаў нашых у Госпада просім.

Усяго, што добрае і карыснае для душ нашых, і супакою для сьвету ў Госпада просім.

Каб далейшы цяг жыцьця нашага ў супакоі і пакаяньні правесьці, у Госпада просім.

Хрысьціянскага канца жыцьця нашага, бязбольнага, бездакорнага, спакойнага, і добрага адказу на страшным судзе Хрыстовым просім.

Папрасіўшы адзінства веры і супольнасьці Духа Сьвятога, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Божа наш, Божа збаўленьня, навучы нас дастойна дзякаваць Табе за ўсе дабрадзействы, якія Ты нам учыніў і чыніш. Прыняўшы гэтую ахвяру, Ты, Божа наш, ачысьці нас ад усякае нечыстаты цялеснай і духоўнай і навучы, як асягнуць асьвячэньне ў страху Тваім, каб нам з чыстым сьведчаньнем нашага сумленьня прыняць частку сьвятасьцяў Тваіх і зьяднацца з Целам і Крывёю Хрыста Твайго; і, прыняўшы іх дастойна, мець Хрыста ў сэрцах нашых і быць жыльлём Сьвятога Твайго Духа. Так, Божа наш, ня дай ніводнаму з нас несьці адказнасьць за гэтыя Твае страшныя нябесныя Тайны, або занядужаць целам і душою за тое, што мы іх недастойна прынялі; але дай нам да самага скону дастойна прымаць частку сьвятасьцяў Тваіх на дарогу да жыцьця вечнага і для добрага адказу на страшным судзе Хрыста Твайго. Хай і мы, разам з усімі сьвятымі, якія ад веку Табе дагадзілі, будзем удзельнікамі вечных Тваіх даброт аў, якія Ты прыгатаваў тым, што любяць Цябе.

Уголас: І зрабі нас дастойнымі, Уладару, з поўным даверам і без асуджэньня сьмець зьвяртацца да Цябе, Бога нябеснага, як да Айца, і казаць:

Людзі: Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая, як у небе так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня. І адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым. І ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

Сьвятар: Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Мір усім.

Людзі: І твайму духу.

Дыякан: Галовы вашы Госпаду схіліце.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Уладару Госпадзе, Ойча дабротаў і Божа ўсякага суцяшэньня, блаславі тых, што схілілі галовы свае перад Табою, асьвяці, захавай, умацуй і падтрымай іх, адвядзі ад усякага благога намеру і далучы да ўсякай добрай справы; і дай ім без асуджэньня прыняць гэтыя ўсячыстыя і

жыватворчыя Тайны для адпушчэньня грахоў і супольнасьці Духа Сьвятога.

Уголас: Ласкаю, міласэрнасьцю і чалавекалюбствам адзінароднага Сына Твайго, з якім блаславёны Ты і Твой усесьвяты, добры і жыватворчы Дух, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Ісусе Хрысьце, Божа наш, які сядзіш з Айцом на вышынях і тут з намі нябачна прабываеш, глянь з Твайго сьвятога жыльля і з пасаду славы валадарства Твайго, і прыйдзі асьвяціць нас. І будзь ласкавы даць нам магутнай Тваёй рукою Тваё ўсячыстае Цела і пачэсную Кроў, а праз нас усім людзям.

У міжчасе дыякан апярэзваецца накрыж араром. Калі сьвятар скончыць малітву, ён і дыякан робяць тры паклоны, кажучы ціха за кожным разам:

Божа, будзь спагадлівы мне, грэшнаму, і зьмілуйся нада мною.

Дыякан (уголас): Будзьма ўважлівыя.

Сьвятар бярэ ў рукі Агнец і падымае яго, усклікаючы:

Сьвятыя рэчы для сьвятых.

Людзі: Адзін сьвяты, адзін Госпад Ісус Хрыстос на славу Бога Айца. Амін.

І сьпяваюць прычасьнік. У нядзелю:

Хваліце Госпада з нябёсаў, хваліце Яго на вышынях. Алілуя, алілуя, алілуя.

У міжчасе дыякан уваходзіць у алтар і, стаўшы па правай руцэ сьвятара, кажа:

Раздрабі, ойча.

Сьвятар: Раздрабляецца і разьдзяляецца Агнец Божы, які застаецца непадзельны, хоць яго разьдзяляюць, і заўсёды неспажыты, хоць яго ўсьцяж спажываюць, але які асьвячае тых, што яго прымаюць.

Раздрабляе Агнец на чатыры часткі, кладучы іх на дыскасе ў наступным парадку:



Дыякан (паказваючы на чашу) : Напоўні, ойча, сьвятую чашу.

Сьвятар укладае ў чашу частку з літарамі ІС і кажа:

Паўната Духа Сьвятога.

Дыякан: Амін.

Дыякан бярэ цеплыню (гарачую ваду) і кажа сьвятару:

Блаславі, ойча, цеплыню.

Сьвятар (блаславўляе): Блаславёная цеплыня сьвятых Тваіх, на ўсе чысы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Дыякан улівае цеплыню ў чашу накрыж, кажучы:

Цеплыня веры, поўная Духа Сьвятога. Амін.

Сьвятар раздрабляе частку з літарамі ХС для прычасьця сьвятароў і дыяканаў. Тады кажа дыякану:

Дыякане, падыдзі.

Дыякан падыходзіць, робіць глыбокі паклон і кажа:

Дай мне, ойча, пачэснае і сьвятое цела Госпада, Бога і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста.

Сьвятар кладзе на руку дыякану частку Сьвятога Хлеба, кажучы:

Пачэснае і сьвятое Цела Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста даецца сьвятадыякану… (імя), для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Дыякан адыходзіць, становіцца ззаду ахвярніка і, схіліўшы галаву, моліцца.

Сьвятар, пакланіўшыся, бярэ частку сьвятога хлеба, кладзе сабе на правую далонь, кажучы:

Пачэснае і сьвятое Цела Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста даецца мне, сьвятару… (імя), для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Трымаючы хлеб на руцэ і схіліўшыся над ім, моліцца разам з дыяканам:

Веру, Госпадзе, і вызнаю, што Ты сапраўды Хрыстос, Сын Бога жывога, што

прыйшоў на сьвет збавіць грэшнікаў, сярод якіх я самы першы. Веру таксама, што гэта сапраўды Тваё сьвятое Цела і пачэсная Кроў. Малюся Табе: зжалься нада мною і даруй мне мае правіны вольныя і міжвольныя, якія я зрабіў словам і ўчынкам, сьвядома і несьвядома. І дай мне без асуджэньня прыняць Твае сьвятыя Тайны для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Зрабі мяне сёньня, Сыне Божы, удзельнікам Тваёй Тайнай вячэры; я ня здраджу ворагам Тваім тайны і ня дам пацалунку, як Юда, але як разбойнік вызнаю Цябе: успомні мяне, Госпадзе, у Тваім валадарстве.

Няхай прыняцьце сьвятых Тваіх Тайнаў будзе мне не на суд ці асуджэньне, але для аздараўленьня душы і цела.

І спажывае пабожна сьвятое Цела. Таксама, пакланіўшыся зноў, бярэ чашу і п’е з яе тройчы, кажучы:

Я, слуга Божы сьвятар… (імя), прымаю сьвятую і пачэсную Кроў Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Прычасьціўшыся, кажа:

Дакрануўшыся да маіх вуснаў, яно адыме мае бясчынствы і ачысьціць грахі.

Тады сьвятар кліча зноў дыякана:

Дыякане, зноў падыдзі.

Дыякан падыходзіць, робіць паклон і кажа:

Вось падыходжу зноў да несьмяротнага Ўладара і Бога нашага. Дай мне, ойча, пачэсную і сьвятую Кроў Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Сьвятар трымае чашу і дае піць з яе дыякану, кажучы:

Слуга Божы сьвятадыякан… (імя), прымае сьвятую і пачэсную Кроў Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Скончыўшы, сьвятар кажа:

Дакрануўшыся да тваіх вуснаў, яно адыме твае бясчынствы і ачысьціць грахі.

Сьвятар раздрабляе часткі НІ і КА для прычасьця верных, а дыякан укладае іх у чашу і пакрывае

яе пакраўцом. Тады сьвятар дае чашу дыякану, які выходзіць райскімі дзьвярамі, кажучы ўголас:

Са страхам Божым, вераю і любоўю падыходзьце.

Людзі: Блаславёны той, хто прыходзіць у імя Гасподняе. Госпад – Бог, і Ён зьявіўся нам.

Сьвятар бярэ ад дыякана чашу і прычашчае верных, кажучы за кожным разам:

Слуга Божы (Божая) ... (імя) прымае сьвятое Цела і пачэсную Кроў Госпада, і Бога, і Збавіцеля нашага Ісуса Хрыста для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Людзі падчас прычашчэньня сьпяваюць:

Цела Хрыстова прыміце, пакаштуйце крыніцы несьмяротнасьці. Алілуя, алілуя, алілуя.

Скончыўшы, сьвятар адносіць чашу на ахвярнік, кажучы:

Дыкрануўшыся да вашых вуснаў, яно адыме вашыя бясчынствы і ачысьціць грахі.

Дыякан укладае астатнія часткі з дыскаса ў чашу і ачышчае яго губкаю, молячыся:

Убачыўшы ўваскрасеньне Хрыстова, паклонімся сьвятому Госпаду Ісусу, адзінаму бязгрэшнаму. Крыжу Твайму пакланяемся, Хрысьце, і сьвятое ўваскрасеньне Тваё ў песьнях славім. Ты – Бог наш, апроч Цябе іншага бога ня знаем, імя Тваё клічам. Прыйдзіце, усе верныя, паклонімся сьвятому ўваскрасеньню Хрыстоваму, бо праз крыж прыйшла радасьць усяму сьвету. Заўжды благаслаўляючы Госпада, славім Ягонае ўваскрасеньне: бо Ён, пацярпеўшы ўкрыжаваньне, сьмерцю сьмерць зваяваў.

Сьвяціся, сьвяціся, Новы Ерусаліме, бо слава Господняя зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне. Ты ж, Чыстая, красуйся, Багародзіца, бо Той, каго Ты нарадзіла, з мёртвых устаў.

Ты, Хрысьце, наша вялікая і сьвятая Пасха, Слова Божае, Мудрасьць і Сіла. Дай, каб нам больш дасканала зьяднацца з Табою ў незаходны дзень валадарства Твайго.

Сьвятар (бласлаўляе людзей): Збаў, Божа, людзей Тваіх і блаславі набытак Твой.

Людзі: Мы бачылі праўдзівае сьвятло, прынялі Духа нябеснага, знайшлі веру праўдзівую, пакланяемся неразьдзельнай Тройцы, бо Яна нас збавіла.

Сьвятар кадзіць сьвятыя дары, кажучы ціха тройчы:

Узьнясіся на нябёсы, Божа, і хай па ўсёй зямлі разыдзецца слава Твая

Дае дыскас дыякану, які, пакланіўшыся, адносіць яго на прыгатавальнік; а сам бярэ чашу, кажучы ціха:

Блаславёны Бог наш.

Павярнуўшыся да людзей, уголас:

На ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

І адыходзіць да прыгатавальніка.

Людзі: Амін. Хай нашы вусны будуць поўныя хвалы Тваёй, Госпадзе, каб нам пяяць славу Тваю, бо Ты зрабіў нас дастойнымі быць удзельнікамі сьвятых Тваіх, Боскіх, несьмяротных і жыватворчых Тайнаў. Захавай нас у Тваёй сьвятасьці, каб нам

увесь дзень навучацца Тваёй справядлівасьці. Алілуя, алілуя, алілуя.

Сьвятар ставіць чашу на прыгатавальнік, кадзіць і адыходзіць да ахвярніка. Дыякан, разьвязаўшы арар, выходзіць і, стаўшы на сваё месца, пачынае літанію.

Дыякан: Устаньце! Атрымаўшы Боскія, сьвятыя, усячыстыя, несьмяротныя, нябесныя і жыватворчыя, страшныя Хрыстовыя тайны, дастойна падзякуем Госпаду.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Папрасіўшы, каб гэты ўвесь дзень быў дасканалы, сьвяты, мірны і бязгрэшны, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Дзякуем Табе, Госпадзе Божа наш, за атрыманыя сьвятыя Твае чыс-

тыя, несьмяротныя і нябесныя Тайны, якія Ты нам дараваў для нашага дабра і для асьвячэньня і ацаленьня душ і целаў нашых. Дай, Уладару ўсіх, каб прыняцьце сьвятога Цела і Крыві Хрыста Твайго было нам для веры беззаганнай, для любові шчырай, для памнажэньня мудрасьці і аздараўленьня душы і цела, для адпору ўсякаму супраціўніку, для захаваньня Тваіх запаветаў, для добрага адказу на страшным судзе Хрыста Твайго.

Складае антымінс і робіць знак крыжа Евангельлем.

Уголас: Бо Ты асьвячэньне наша, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Кладзе Евангельле на антыменс.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Пойдзем з мірам.

Людзі: У імя Гасподняе.

Дыякан: Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар, стаўшы перад райскімі дзьвярамі або іконай Хрыста, з дыяканам з правага боку, моліцца:

Госпадзе, які бласлаўляеш тых, што бласлаўляюць Цябе і асьвячаеш тых, што ўскладаюць на Цябе надзею, збаў людзей Тваіх і блаславі набытак Твой; захавай у цэласьці Царкву Тваю і асьвяці тых, што любяць красу дому Твайго. Ты іх услаў Тваёю Боскаю сілаю і не пакінь нас, якія спадзяемся на Цябе. Даруй спакой усяму сьвету, цэрквам Тваім, нашаму беларускаму народу, належным уладам нашым і ўсім людзям Тваім. Бо ўсякае добрае дарэньне і дар дасканалы зыходзяць згары ад Цябе, Айца сьвятла, і мы Табе славу, падзяку і пакланеньне аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Хай будзе імя Госпадняе блаславёнае цяпер і давеку. (Тройчы)

Сьвятар і дыякан ідуць у алтар. Дыякан ідзе да прыгатавальніка спажываць сьвятыя дары, а сьвятар, схіліўшы галаву, моліцца ціха:

Зьдзейсьнілася і споўнілася, наколькі гэта было ў нашай моцы, тайніца провіду Твайго, Хрысьце Божа наш: мы прыгадалі

Тваю сьмерць, мы бачылі вобраз Твайго ўваскрасеньня, мы напоўніліся жыцьцём Тваім бясконцым, пажывіліся ў асалоду Тваёй невычэрпнаю стравою: просім Цябе, зрабі нас годнымі яе ў будучым жыцьці, ласкаю спрадвечнага Твайго Айца, і сьвятога, і добрага, і жыватворчага Твайго Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Паварочваецца да людзей і бласлаўляе іх, кажучы голасна:

Блаславеньне Гасподняе хай будзе на вас, ласкаю Яго і чалавекалюбствам на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Слава Табе, Хрысьце Божа, надзея наша, слава Табе.

Людзі: Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін. Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся. Ойча, блаславі.

Сьвятар робіць водпуст.

У нядзелі Вялікага Посту:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які ўваскрос з мёртвых, малітвамі ўсячыстае свае Маці, (у трэцюю нядзелю Посту: сілаю пачэснага і жыватворчага Крыжа) і ўсіх сьвятых апосталаў; між сьвятымі айца нашага Базыля Вялікага, арцыбіскупа Кесарыі Кападакійскай; сьвятога (-той) … (імя сьвятога патрона царквы) ; сьвятога (-той) … (імя сьвятога, чыя памяць адзначаецца ў гэты дзень) ; сьвятых слаўных і роўных апосталам настаўнікаў славянскіх Кірылы і Мятода; між сьвятымі айца нашага Кірылы, біскупа Тураўскага; сьвятое маці нашае Еўфрасіньні Полацкае, асьветніцы Беларусі і ўсіх сьвятых заступнікаў беларускага народу; сьвятых і праведных богаайцоў Якіма і Ганны і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

Людзі: Амін.

## Малітвы, якія гаворыць сьвятар, калі здымае сьвятую вопратку

Цяпер адпускаеш, Уладару, слугу Твайго ў супакоі, паводле слова Твайго, бо мае вочы бачылі збаўленьне Тваё, якое Ты прыгатаваў перад усімі людзьмі, сьвятло для прасьвятленьня народаў і славу Ізраіля, люду Твайго.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, зжалься над намі. (Тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Усесьвятая Тройца, зжалься над намі: Госпадзе, ачысьці грахі нашы; Уладару, даруй бясчынствы нашы; Сьвяты, наведай і аздараві немачы нашы дзеля Твайго імя.

Госпадзе, зьмілуйся. (Тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Трапар сьвятога Базыля Вялікага:

Голас твой разышоўся па ўсёй зямлі, і яна ўспрыняла словы твае, якімі ты навучаў усіх, выясьняючы сутнасьць рэчаў і выпраўляючы норавы людзей. Вышыня сьвятарства, ойча блаславёны, малі Хрыста Бога, каб Ён дараваў нам багацьце свайго зьмілаваньня.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Кандак сьвятога Базыля Вялікага:

Ты стаўся непахіснай асноваю Царквы, даючы людзям незьнішчальны скарб, умацоўваючы іх навучаньнем тваім, блаславёны Базылю, нябесных тайнаў вестуне.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Апякунка хрысьціян бездакорная, Хадайніца да Тварца незаменная, не пагардзі маленьнямі грэшнікаў, але, як добрая, сьпешна прыйдзі на падмогу нам, якія клічам Цябе даверліва. Пачуй хутка малітвы, адгукніся на просьбы, Багародзіца, надзейная Заступніца тых, што шануюць Цябе.

Госпадзе, зьмілуйся. (12 разоў)

Больш годную пашаны за хэрувімаў і без параўнаньня больш слаўную за сэрафімаў, што, захаваўшы дзявоцтва, радзіла Бога Слова, існую Багародзіцу, Цябе мы ўзьвялічваем.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Малы водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае свае Маці, сьвятых і баганосных айцоў нашых і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец. Амін.

# Асаблівасьці Літургіі ў некаторыя сьвяты

Літургія сьвятога Базыля служыцца дзесяць разоў у год, асобна або ў спалучэньні з вячэрняй. У апошнім выпадку літургія пачынаецца ад Сьвяты Божа…

Асобна Літургія служыцца ў пяць нядзеляў Вялікага Посту, 1 студзеня (дзень сьвятога Базыля); а таксама на Каляды (25 сьнежня) і Богазьяўленьня (6 студзеня), калі гэтыя сьвяты прыпадаюць на нядзелю або панядзелак.

У спалучэньні з вячэрняй Літургія Сьвятога Базыля служыцца ў Чысты (Вялікі) Чацьвер, Вялікую Суботу, а таксама напярэдадні сьвятаў Нараджэньня Хрыстовага і Богазьяўленьня (г. з. 24 сьнежня і 5 студзеня), калі гэтыя сьвяты прыпадаюць на будні дзень тыдня, апрача панядзелка.

## Нараджэньне Госпада нашага Ісуса Хрыста (25 сьнежня)

Уваходны верш:

Ва ўлоньні маім перад заранкай Я нарадзіў Цябе. Кляўся Госпад і не раскаяўся: Ты – сьвятар давеку паводле чыну Мэльхісэдэка.

Людзі: Сыне Божы, што нарадзіўся ад Дзевы, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Замест Сьвяты Божа…:

Усе вы, што ў Хрыста ахрысьціліся, у Хрыста апрануліся. Алілуя.

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які дзеля нашага збаўленьня нарадзіўся ў пячоры і ў ясьлях быў пакладзены, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Базыля Вялікага, арцыбіскупа Кесарыі Кападакійскай, і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## Абрэзаньне Гасподняе і Сьвятога Базыля (1 студзеня)

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які на восьмы дзень захацеў дабравольна прыняць абрэзаньне ў целе дзеля нашага збаўленьня, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Базыля Вялікага, арцыбіскупа Кесарыі Кападакійскай, і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## Богазьяўленьне (6 студзеня)

Уваходны верш:

Благаслававёны Той, хто прыходзіць у імя Гасподняе. Блаславаўляем вас ад дому Гасподняга. Госпад – Бог, і Ён зьявіўся нам.

Людзі: Сыне Божы, што хрысьціўся ў Ярдане, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

Замест Сьвяты Божа…:

Усе вы, што ў Хрыста ахрысьціліся, у Хрыста апрануліся. Алілуя.

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які дзеля нашага збаўленьня захацеў дабравольна ў Ярдане хрысьціцца ад Яна, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Базыля Вялікага, арцыбіскупа Кесарыі Кападакійскай, і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## Трэцяя нядзеля Вялікага Посту

Замест Сьвяты Божа…:

Крыжу Твайму пакланяемся, Уладару наш, і сьвятое ўваскрасеньне Тваё славім.

## Чысты Чацьвер

Водпуст:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які ў вялікай сваёй дабрыні паказаў нам дасканалы шлях пакоры, калі захацеў вучням сваім ногі памыць, і сам ўпакорыўся аж да крыжа і магілы, малітвамі ўсячыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Базыля Вялікага, арцыбіскупа Кесарыі Кападакійскай і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

# ЛІТУРГІЯ РАНЕЙ АСЬВЯЧАНЫХ ДАРОЎ

Згодна з традыцыяй бізантыйскай Царквы, у Вялікі Пост эўхарыстычная Літургія ня служыцца, апрача суботаў і нядзеляў, а таксама сьвята Дабравешчаньня, у які б дзень тыдня яно ня выпала. Каб даць магчымасьць вернікам прычасьціцца Цела і Крыві Хрыстовай, у некаторыя буднія дні Посту служыцца Літургія раней асьвячаных дароў, якая па сутнасьці ёсьць Вячэрняй з прычасьцем. Традыцыя прыпісвае ейнае аўтарства сьв. Рыгору Вялікаму, Папе Рымскаму. Звычайна Літургія раней асьвячаных дароў служыцца вечарам у серады і пятніцы Вялікага Посту і ў першыя тры дні Вялікага Тыдня.

Падчас нядзельнае Літургіі ў Вялікім Посьце сьвятар асьвячае адзін або больш Агнцаў у залежнасьці ад таго, колькі разоў на дадзеным тыдні мае служыцца Літургія раней асьвячаных дароў. У нядзелю робіцца Праскамідыя паводле звычайнага парадку. Пасьля таго, як сьвятар разрэжа і ахвяруе першую прасфору, тое ж самае робіць з іншымі, паўтараючы над кожнай асобна На успамін... Як авечку... Агнец Божы... Адзін з жаўнераў... і г.д. паводле абраду прыгатаваньня, гл. с. 11. На сьвятой Літургіі робіцца паднясеньне ўсіх хлябоў, як таго, што будзе разьдзелены і пакладзены ў чашу, так і тых, што рыхтуюцца на наступны тыдзень. Першы Агнец разьдзяляецца і кладзецца ў чашу, як звычайна. Пасьля гэтага ў даразахавальніцу па чарзе ўкладваюцца іншыя Агнцы. Папярэдне іх крыжападобна змочваюць сьвятой Кры-

вёй (пры дапамозе лыжачкі). Усё іншае – паводле нармальнага парадку службы.

Сьвятар і дыякан, апранутыя ў поўную літургічную вопратку, робяць тры паклоны перад ахвярнікам, кажучы за кожным разам: Божа, ачысьці мяне, грэшнага; і цалуюць ахвярнік і Евангельле. Дыякан, атрымаўшы блаславеньне, выходзіць з алтара і, стаўшы перад іканастасам, пачынае:

Блаславі, ойча! (ідзе ў алтар)

Сьвятар: Блаславёнае валадарства Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.”

Чытальнік: Амін.

Прыйдзіце, паклонімся Ўладару нашаму Богу.

Прыйдзіце, паклонімся і прыпадзем да Хрыста, Уладара нашага і Бога.

Прыйдзіце, паклонімся і прыпадзем да самога Хрыста, Уладара і Бога нашага.

Псалом 103. Блаславі, душа мая, Госпада:

Госпадзе Божа мой, Ты вялікі наўзьдзіў.

Ты апрануўся ў веліч і красу, ты ахутаўся сьвятлом, быццам плашчом.

Ты расьцягнуў неба, быццам шацёр, хорамы Твае над водамі паставіў.

Ты робіш з хмараў калясьніцу сабе, ходзіш на крылах ветру.

Ты чыніш вятры пасланцамі Тваімі і слугамі Тваімі – полымя агню.

Ты ўмацаваў зямлю на асновах яе: не пахісьнецца павек вякоў.

Безданьню, быццам вопраткаю, пакрыў Ты яе: воды над гарамі сталі.

Ад пагрозы Тваёй яны ўзад падаліся, ад грому голасу Твайго задрыжэлі.

Горы ўзьняліся, даліны зышлі ў месцы, якія Ты ім назначыў.

Ты ўстанавіў межы, якіх ім не перайсьці, каб не пакрыць зноў зямлю.

Ты пасылаеш крыніцы ў рэкі, што плывуць у далінах між гораў.

З іх п’юць усе зьвяры польныя, аслы дзікія ў іх смагу сваю гасяць.

Каля іх птушкі нябесныя жывуць: між скалаў чутны сьпеў іх.

З хорамаў Тваіх навадняеш горы: зямля поўніцца плодам твораў Тваіх.

Ты вырошчваеш траву для жывёлы, зельле на пажытак чалавеку, каб ён мог здабыць сабе ежу з зямлі:

Віно, што весяліць сэрца чалавека; алі-

ву, што робіць твар сьветлым; хлеб, што сэрца чалавека ўмацоўвае.

Дрэвы нізінныя маюць удосталь соку – кедры лібанскія, што іх насадзіў.

Там птушкі маюць гнёзды свае, бусьлінае жыльлё ўзвышаецца над імі.

Горы высокія для дзікіх козаў, шчыліны скалаў – сховішча для грызуноў.

Ты стварыў месяц, каб паказваў поры; сонца знае час заходу свайго.

Пасылаеш цемру і надыходзіць ноч, падчас якое выходзяць усе зьвяры лясныя.

Львяняты рыкаюць, шукаючы здабычы, просячы ў Бога спажывы сабе.

Як толькі сонца ўзыдзе, яны хаваюцца і кладуцца ў логавах сваіх.

Выходзіць чалавек да справаў сваіх і да работы сваёй да вечара.

Якое багацьце твораў Тваіх, Госпадзе! Ты ўсё мудра стварыў: зямля поўная стварэньняў Тваіх.

Вось мора вялікае і прасторнае: у ім рухаецца безьліч стварэньняў, зьвяроў вялікіх і малых.

Караблі плаваюць па ім, і кіт агромністы там, якога Ты стварыў на пацеху сабе.

Усе яны чакаюць ад Цябе, каб Ты даў ім спажыву ў свой час.

Ты ім даеш, і яны падбіраюць, расчыняеш руку Тваю, і яны поўняцца ўсякім дабром.

Калі ж Ты адвяртаеш твар Твой ад іх, яны трывожацца; адымаеш дух ад іх, і яны гібеюць, і ў пыл зноў вяртаюцца.

Пасылаеш Духа Твайго, і яны ажываюць, і Ты абнаўляеш твар зямлі.

Няхай слава Гасподняя трывае давеку, хай Госпад цешыцца з твораў сваіх.

Ён гляне на зямлю, і яна дрыжыць, дакранецца да гораў, і яны дымяцца.

Праз усё жыцьцё маё буду хваліць Госпада, буду ў песьнях славіць Бога майго, пакуль буду жыць.

Няхай прыемнай Яму будзе песьня мая: я радуюся ў Госпадзе.

Няхай счэзнуць грэшнікі з зямлі і няхай ня будзе больш нягоднікаў.

Блаславі, душа мая, Госпада.

Сонца знае час заходу свайго; Ты пасылаеш цемру і надыходзіць ноч.

Якое багацьце твораў Тваіх, Госпадзе: Ты ўсё мудра стварыў.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Алілуя, алілуя, алілуя: слава Табе, Божа. (Тройчы)

У міжчасе сьвятар, выйшаўшы і стаўшы перад райскімі дзьвярамі, чытае ціха вячэрнія малітвы, пачынаючы з чацьвертае, бо тры першыя гаворацца пазьней, пасьля літаніяў:

Малітва 4. Ты, якога ў несьціханых песьнях і нястомных усхваленьнях славяць сьвятыя сілы, напоўні сэрцы нашы хвалою Тваёю, каб нам аддаваць пашану імю Твайму сьвятому; і дай нам у спадчыне ўдзел з усімі, што пакланяюцца Табе ў праўдзе і захоўваюць Твае прыказаньні. Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на векі вякоў. Амін.

Малітва 5. Госпадзе, Госпадзе, Ты ўсё трымаеш Тваёй усячыстай рукою, Ты доўгацярплівы да нас і сумуеш з прычыны нашае нягоднасьці; памятай пра міласьць і ласку Тваю, наведай нас у дабрыні Тваёй і дай нам правесьці рэшту гэтага дня свабоднымі ад розных падкопаў нячыстага і, сілаю ўсесьвятога Твайго Духа, захавай наша жыцьцё ад усякіх напасьцяў. Міласэрнасьцю і чалавекалюбствам адзінароднага Сына Твайго, з якім блаславёны Ты і Твой усесьвя-

ты, добры і жыватворчы Дух, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Малітва 6. Божа вялікі і дзіўны, што невыказнай дабрынёю і багатым провідам Тваім кіруеш усім: Ты абдарыў нас зямнымі дабротамі і ў Тваёй дабрыні ўпэўніў нас у атрыманьні абяцанага валадарства. Зьбярогшы нас у сёньняшні дзень ад усяго благога, дай і рэшту яго правесьці беззаганна перад сьвятою славаю Тваёю і ўзьвялічваць Цябе, адзінага добрага і чалавекалюбнага Бога нашага. Бо Ты Бог наш, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Малітва 7. Божа вялікі, усявышні, адзіны несьмяротны, што жывеш у недасяжным сьвятле! Ты ўсё, што існуе, мудра стварыў, аддзяліў сьвятло ад цемры, сонца ўстанавіў, каб днём кіравала, месяц і зоркі – ноччу. Ты ўдастоіў нас, грэшных, у гэтую хвіліну стаць перад Тваім абліччам і прыносіць Табе вячэрняе ўсхваленьне. Учыні, чалавекалюбны Ўладару, каб гэтая наша малітва ўзьнялася да Цябе, быццам кадзіла, і прымі яе як адмысловую духмянасьць. Дай, каб гэты вечар і ноч, што неўзабаве настане, былі мірнымі; апрані нас у зброю сьвятла, захавай нас ад

страху начнога і ад усякай пагрозы, што крыецца ў цемры. Зрабі, каб наш сон, які Ты нам даў на адпачынак дзеля слабасьці нашай, быў вольным ад д'ябальскіх спакусаў. Так, Уладару, Падаўча ўсяго добрага, дай, каб мы і ўночы, лежачы на ложах нашых, з любоўю ўспаміналі Імя сьвятое Тваё; і, прасьветленыя ўспамінам запаветаў Тваіх, з радаснай душой усталі, каб славіць Тваю дабрыню, ахвяруючы міласэрнасьці Тваёй малітвы і просьбы за нашы правіны і за ўсіх людзей Тваіх, якіх, малітвамі Багародзіцы, наведай у спагадлівасьці Тваёй. Бо Ты добры і чалавекалюбны Бог, і мы Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

---

Дыякан: У супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: За супакой з вышыняў і збаўленьне душ нашых Госпаду памолімся.

За супакой на ўсім сьвеце, добры стан сьвятых Божых цэркваў і зьяднаньне ўсіх Госпаду памолімся.

За гэтую сьвятую царкву і тых, што з вераю, пашанаю і страхам Божым уваходзяць у яе, Госпаду памолімся.

За Сьвятога Айца нашага Сусьветнага біскупа … (імя) Папу Рымскага, дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага … (імя), пачэсных сьвятароў, дыяканаў у Хрысьце, усё духавенства і людзей Госпаду памолімся.

За яго (яе) міласьць … (імя галавы дзяржавы), за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны, Госпаду памолімся.

За Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас Госпаду памолімся.

За гэты горад (гэтую вёску), за ўсе гарады і краіны, і за верных людзей, што жывуць у іх, Госпаду памолімся.

За добрае надвор'е, багаты ўраджай пладоў зямных і за часы спакойныя Госпаду памолімся.

За падарожнікаў па моры, зямлі і ў паветры, за нядужых, тых, што церпяць, за зьняволеных і збаўленьне іх Госпаду памолімся.

Каб нам выбавіцца ад усякага гневу, суму і недастатку Госпаду памолімся.

Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Госпадзе, шчодры і міласэрны, доўгацярплівы і багаты на ласку, уваж малітву нашу і пачуй голас маленьня нашага, пакажы нам знак спагадлівасьці Тваёй, накіруй нас на шлях Твой, каб мы маглі хадзіць у праўдзе Тваёй; напоўні радасьцю сэрцы нашы, каб нам баяцца імя Твайго сьвятога, бо Ты вялікі і творыш цуды. Ты – Бог адзіны, і няма падобнага між багамі да Цябе, Госпадзе: Ты сільны ў дабрыні і добры ў моцы,

здольны памагчы, суцешыць і збавіць тых, што спадзяюцца на імя сьвятое Тваё.

Уголас: Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар унутры алтара, пакадзіўшы ахвярнік тройчы, з пашанаю вымае з даразахавальніцы сьвяты Агнец, кладзе яго на дыскас і пераносіць на прыгатавальнік. Дыякан ідзе перад ім са сьвячою, кадзячы. Паставіўшы дыскас, сьвятар улівае віно ў чашу, пакрывае ўсё пакраўцамі і, пакадзіўшы, адыходзіць. У міжчасе бывае чытаньне 18 катызмы Псалтыра (Пс 119-133), дзелячы яе на тры часткі.

Чытальнік: (Пс 119) У бядзе гукаў я Госпада, і Ён пачуў мяне.

Госпадзе, вызваль душу маю ад вуснаў хлусьлівых і ад языка здрадлівага.

Што дасьць або што прынясе табе хлусьлівы язык?

Вострыя стрэлы магутнага і распаленае вугольле жаўтазелю.

Гора мне, што жыву як прыхадзень, прабываю ў палатках Кідарскіх.

Задоўга жыла душа мая сярод міраненавісьнікаў.

Калі я кажу ім пра мір, яны імкнуцца да вайны.

(Пс 120) Я ўзьняў вочы мае да гораў, адкуль мае прыйсьці дапамога мая.

Дапамога мая ад Госпада, які стварыў неба і зямлю.

Ён ня дасьць пахіснуцца назе тваёй: не засьпіць той, хто сьцеражэ цябе.

Ня дрэмле і ня сьпіць той, хто ахоўвае Ізраіля.

Госпад твой абаронца з правага боку твайго: сонца не паразіць цябе ўдзень, ні месяц уночы.

Госпад захавае цябе ад усяго благога: захавае Ён душу тваю.

Госпад будзе сьцерагчы твой выхад і прыйсьце цяпер і на ўсе вякі.

(Пс 121) Усьцешыўся я, калі мне сказалі: Пойдзем да дому Госпадняга.

Ногі нашы стаяць у дварах тваіх, Ерусалім.

Ерусалім адбудаваны, горад суцэльны.

Туды ідуць пакаленьні, пакаленьні Гасподнія, паводле закону Ізраіля, каб славіць імя Госпадняе.

Там установленыя пасады судовыя, пасады для дому Давідавага.

Прасіце супакою для Ерусаліму, няхай жывуць у бясьпечнасьці ўсе, што любяць яго.

Няхай будзе супакой у мурах тваіх, бясьпечнасьць у харомах тваіх.

Дзеля братоў і прыяцеляў маіх буду казаць: “Мір табе”.

З увагі на дом Господа Бога нашага буду жадаць дабра табе.

(Пс 122) Уздымаю вочы мае да Цябе, што жывеш у небе.

Як вочы слуг узіраюцца на рукі гаспадароў сваіх, і як вочы служкі на рукі гаспадыні сваёй, так вочы нашы ўзьнесеныя да Господа Бога нашага, пакуль Ён зьмілуецца над намі.

Зьмілуйся над намі, Госпадзе, зьмілуйся над намі, бо мы перапоўненыя зьнявагай.

Асабліва душа наша поўная насьмешак магутных і пагарды гордых.

(Пс 123) Калі б ня Господ быў на нашым баку – хай прызнаецца Ізраіль, –

калі б ня Господ быў на нашым баку, калі на нас паўсталі людзі,

яны б жывымі праглынулі нас, калі іхняя злосьць распальвалася супраць нас; ва-

да затапіла б нас, паток заліў бы нас, бурлівыя воды пранесліся б над намі.

Блаславёны Госпад, які не аддаў нас на патраву ў зубы іх.

Душа нашая, быццам птушка, вырвалася з сеці лаўцоў: сетка парвалася і мы ўраталіся.

Дапамога наша ў імені Госпада, які стварыў неба і зямлю.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Алілуя, алілуя, алілуя: слава Табе, Божа. (Тройчы)

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Уладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Ма-

рыю і ўсіх сьвятых, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Госпадзе, у строгасьці Тваёй не судзі нас і ў гневе Тваім не карай нас, але ўчыні з намі згодна з Тваёй міласэрнасьцю, Лекару і Збавіцелю душ нашых. Накіруй нас да жаданага прыстанішча Твайго, прасьвятлі вочы нашы, каб нам пазнаць праўду Тваю; і дай нам рэшту гэтага дня і ўсе дні жыцьця нашага правесьці без граху і ў супокоі, малітвамі Багародзіцы і ўсіх сьвятых.

Уголас: Бо Твая ёсьць дзяржава і Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Чытальнік: (Пс 124) Тыя, што спадзяюцца на Госпада, падобныя да гары Сыён: не зварухнецца ніколі той, хто жыве ў Ерусаліме.

Горы навакол яго (Ерусаліму), і Госпад навакол народу свайго цяпер і давеку.

Бо Госпад ня дасьць жэзлу нязбожных панаваць над лёсам праведных, каб праведнікі не працягвалі рук сваіх да беззаконьня.

Госпадзе, чыні дабро людзям добрым і шчырага сэрца.

А тых, што зыходзяць на крывыя сьцежкі, хай Госпад выганіць вонкі разам са злачынцамі.

Мір Ізраілю!

(Пс 125) Калі Госпад вяртаў палонных Сыёну, мы былі быццам у сьне.

Тады вусны нашыя былі поўныя сьмеху, а язык – радасьці. Тады пагане гаварылі між сабою: “Як добра абышоўся з імі Госпад”.

Госпад абышоўся цудоўна з намі, і мы ўсьцешыліся.

Вярні, Госпадзе, нашых палонных, быццам ручаі на сасьмяглую зямлю.

Тыя, што сеюць са сьлязьмі, жаць будуць у радасьці.

Тыя, што з плачам нясуць зерне сеяць, вяртаюцца радасныя, несучы снапы свае.

(Пс 126) Калі ня Госпад збудуе дом, марныя намаганні будаўнікоў. І калі ня Госпад сьцеражэ места, дарэмна пільнуюць яго вартаўнікі.

Дарэмна ўстаеце на досьвітку, сядзіце да позьняй ночы, спажываеце хлеб свой у цяжкай працы: Госпад і ў сьне абдорвае абраньнікаў сваіх.

Вось дзеці – гэта дар Госпада, а плод улоньня – узнагарода.

Як стрэлы ў руцэ ваяра, так сыны маладыя.

Шчасьлівы той, хто напоўніў імі калчан свой: ня будуць пасаромленыя, калі ў браме стануць для расправы з ворагам.

(Пс 127) Блаславёныя ўсе, што баяцца Госпада, і што ходзяць Ягонымі шляхамі.

Будзеш карміцца з працы рук тваіх, будзеш шчасьлівы і добра табе будзе.

Жонка твая будзе быццам пладавітая лаза вінаградная ў зацішшы дому твайго; сыны ж твае – быццам галінкі аліўныя вакол стала твайго.

Так будзе блаславёны той, хто баіцца Госпада.

Няхай блаславіць цябе Госпад з Сыёну, каб ты бачыў дабрабыт Ерусаліму праз усе дні жыцьця твайго, каб ты дачакаўся бачыць дзяцей сыноў тваіх.

Мір Ізраілю!

(Пс 128) Шмат прыгняталі мяне з маладосьці маёй – хай прызнаецца Ізраіль, –

Вельмі прыгняталі мяне з маладосьці маёй, але ня здолелі перамагчы мяне.

На хрыбце маім аралі яны, доўгія барозны свае праганяючы.

Але справядлівы Госпад абцяў вяроўкі нязбожных.

Няхай будуць пасаромленыя і адступяцца ўсе, што ненавідзяць Сыён.

Няхай стануцца падобнымі да травы на страсе, што засыхае перад тым, як вырвуць яе.

Жнец ня здолее напоўніць ёю жмені сваёй, ані той, хто вяжа снапы, – прыгаршчаў сваіх.

І тыя, што праходзяць паўз іх, ня скажуць: “Блаславеньне Гасподняе хай будзе на вас. Бласлаўляем вас у імя Гасподняе”.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Алілуя, алілуя, алілуя: слава Табе, Божа. (Тройчы)

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Божа мой, будзь памятлівы нас грэшных і непатрэбных слугаў Тваіх, што клічуць імя сьвятое Тваё; і не пасаром нас у спадзяваньні Тваёй міласэрнасьці, але дай нам, Госпадзе, усё, што просім для нашага збаўленьня, і зрабі нас годнымі любіць і баяцца Цябе ад усяго сэрца нашага, і чыніць ва ўсім волю Тваю.

Уголас: Бо Ты добры і чалавекалюбец Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Чытальнік: (Пс 129) З глыбіні клічу Цябе, Госпадзе: Госпадзе, пачуй голас мой.

Хай вушы Твае будуць уважлівымі да голасу маленьня майго.

Калі памятлівы бясчынстваў нашых будзеш, Госпадзе, Госпадзе, хто зможа ўстаяць? Але ж у Цябе адпушчэньне ёсьць.

Дзеля імя Твайго спадзяюся на Цябе, Госпадзе: душа мая чакае слова Твайго. Душа мая спадзяецца на Госпада.

Больш чым сьвітаньня чакае страж начны, больш чым сьвітаньня, хай Ізраіль чакае Госпада.

Бо ў Госпада міласэрнасьць і вялікае ў Яго збаўленьне, і Ён вызваліць Ізраіля ад усіх беззаконьняў яго.

(Пс 130) Сэрца маё, Госпадзе, не ганарыцца, і вочы мае не глядзяць пыхліва. Не ганюся за тым, што для мяне завялікае або недасяжнае.

Але я ўпакорыў і супакоіў душу маю:

Быццам грудное дзіцятка на лоне маці, як малое дзіцятка, так душа мая ўва мне.

Спадзявайся, Ізраілю, на Госпада цяпер і давеку.

(Пс 131) Успомні, Госпадзе, Давіда і ўсе ягоныя намаганьні,

як ён кляўся Госпаду, даваў абяцаньне Моцнаму Якубаваму:

“Не ўвайду да пакояў дому майго, і ня ўзыду на пасьцель ложа майго,

і ня дам сну вачом маім, і спачынку павекам маім,

пакуль не знайду месца для Госпада, памяшканьня для Моцнага Якубавага”.

Вось мы чулі пра яго ў Эўфраце, знайшлі яго на полі Яару;

Увойдзем у Ягонае жыльлё, падзем ніцма перад падножжам ног Ягоных.

Устань, Госпадзе, ідзі на месца спачынку Твайго, Ты і каўчэг славы Тваёй.

Хай сьвятары Твае апрануцца ў справядлівасьць, і сьвятыя Твае хай узрадуюцца.

З увагі на Давіда, слугу Твайго, не адварочвай твару ад памазаньніка Твайго.

Кляўся Госпад Давіду моцнай клятваю, і не адступіцца ад яе: Нашчадкаў тваіх пасаджу на пасадзе тваім.

Калі сыны твае захаваюць запавет Мой і прыказаньні, якіх Я іх навучу, дык і іх сыны будуць сядзець на пасадзе тваім давеку.

Бо Госпад выбраў Сыён, пажадаў мець яго за сялібу:

“Вось месца Майго супачынку давеку, дзе буду жыць, бо Я ўпадабаў яго; багацьці

ягоныя шчодра бласлаўлю, бедных ягоных насычу хлебам;

сьвятароў ягоных апрану ў збаўленьне, і сьвятыя яго ў радасьці жыць будуць.

Там Я ўздыму рог Давіда, сьветач пастаўлю памазаньніку Майму;

Ворагаў ягоных пакрыю сорамам, а на ім закрасуе сьвятасьць Мая”.

(Пс 132) Як гэта добра, як міла, калі браты жывуць разам,

быццам алей духмяны на галаве, што сьцякае па барадзе, барадзе Ааронавай, ажно да краёў вопраткі яго;

быццам раса Гэрмону, што спадае на гару Сыён, – бо там Госпад дае сваё блаславеньне і жыцьцё давеку.

(Пс 133) Блаславіце Госпада, усе слугі Гасподнія, усе, што чуваеце начамі ў сьвятыні Гасподняй:

уздымайце рукі вашыя да месца сьвятога і бласлаўляйце Госпада.

Няхай блаславіць вас з Сыёну Госпад, што стварыў неба і зямлю.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Алілуя, алілуя, алілуя: слава Табе, Божа. (Тройчы)

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Уладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар: Бо Ты Бог наш, які нас мілуе і збаўляе, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Людзі сьпяваюць псальмы 140, 141, 129 і 116, чаргуючы іхнія апошнія вершы з адпаведнымі песьнямі дня або сьвята; у міжчасе дыякан кадзіць царкву.

(Пс 140) Госпадзе, Цябе клічу: пачуй мяне.

Пачуй мяне, Госпадзе!

Госпадзе, Цябе клічу: пачуй мяне; будзь уважлівы да голасу маленьня майго, калі я клічу Цябе.

Пачуй мяне, Госпадзе.

Хай малітва мая ўзыдзе да Цябе, быццам кадзіла, і ахвярай вячэрняй будзе ўздыманьне рук маіх.

Пачуй мяне, Госпадзе.

Наступныя вершы, аж да Вызваль з вязьніцы, звычайна чытаюцца або зусім прапускаюцца:

Пастаў, Госпадзе, ахову вуснам маім і сьцеражы дзьверы губ маіх.

Ня дай ухіліцца сэрцу майму да благога, каб мне не шукаць прычыны для ўчынкаў нягодных.

З людзямі, якія чыняць бясчынствы: хай не пакаштую прысмакаў іх.

Хай праведнік па-добраму карае і папраўляе мяне: алей грэшнікаў не намасьціць галавы маёй.

Супраць злосьці іх я буду ўвесь час маліцца. Уладары іх, расьсеяныя між скалаў,

Пачуюць, як лагодныя словы мае. Быццам разараная зямля, так косьці іх раскіданыя па апраметнай.

Бо да Цябе, Госпадзе Божа мой, зьвернутыя вочы мае; да Цябе прыбягаю: не загубі душы маёй.

Сьцеражы мяне ад сеці, што на мяне паставілі, ад пасткі людзей нягодных.

Хай усе нязбожныя ўпадуць у сеці свае, я ж адзін перайду бясьпечна.

(Пс 141) Галасна клічу Госпада, галасна да Госпада малюся.

Перад Ім сум мой выліваю, пра тугу маю Яму распавядаю:

Дух мой зьнемагае ўва мне, Ты ж ведаеш шляхі мае.

На дарозе, па якой іду, паставілі пастку на мяне.

Гляджу ўправа, углядаюся: няма нікога, хто б мне спагадаў;

Ня маю, куды ўцякаць: няма нікога, хто б парупіўся аб душы маёй.

Цябе, Госпадзе, клічу; кажу: Ты мая надзея, мой удзел у краіне жывых.

Будзь уважлівы да малітвы маёй, бо я вельмі няшчасны.

Вызвалі мяне ад ворагаў маіх, бо яны мацнейшыя за мяне.

Калі ёсьць 10 песьняў, яны сьпяваюцца ўперамежку з вершамі псалмаў, пачынаючы ад наступнага:

(Пс 141) Вызваль з вязьніцы душу маю, каб мне дзякаваць імю Твайму.

Праведнікі вакол мяне чакаюць, калі Ты мне пакажаш спагадлівасьць Тваю.

Калі ёсьць 8 песьняў, іх пачынаюць сьпяваць тут:

(Пс 129) З глыбіні клічу Цябе, Госпадзе: Госпадзе, пачуй голас мой.

Хай вушы Твае будуць уважлівымі да голасу маленьня майго.

Калі ёсьць 6 песьняў, іх пачынаюць сьпяваць пасьля наступнага верша:

Калі памятлівы бясчынстваў нашых будзеш, Госпадзе, Госпадзе, хто зможа ўстаяць? Але ж у Цябе адпушчэньне ёсьць.

Дзеля імя Твайго спадзяюся на Цябе, Госпадзе: душа мая чакае слова Твайго. Душа мая спадзяецца на Госпада.

Больш чым сьвітаньня чакае страж начны, больш чым сьвітаньня, хай Ізраіль чакае Госпада.

Бо ў Госпада міласэрнасьць і вялікае ў Яго збаўленьне, і Ён вызваліць Ізраіля ад усіх беззаконьняў яго.

(Пс 116) Хваліце Госпада, усе народы; слаўце Яго, усе людзі.

Бо міласэрнасьць Ягоная ўмацавалася над намі і вернасьць Господняя трывае давеку.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Пахвальная песьня сьвятому, або сьвяту, калі ёсьць.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Пахвальная песьня Багародзіцы або, у сьвяты Господнія, сьвяту.

На ўрачыстай вячэрні, падчас сьпеву Слава… цяпер…, сьвятар, апрануўшы фелон, і дыякан з кадзілам робяць уваход; стаўшы перад райскімі дзьвярамі, дыякан кажа ціха:

Госпаду памолімся.

Сьвятар (*ціха*): Вечарам, раніцай і апоўдні хвалім і бласлаўляем Цябе, дзякуем і молімся Табе, Уладару ўсіх: накіруй малітву нашу, быццам кадзіла перад Табою, і ня дай ухіліцца сэрцам нашым да благіх слоў і думак; але выбаў нас ад усіх, што жадаюць улавіць душы нашы; бо вочы нашы, Госпадзе, Госпадзе, зьвернутыя да Цябе – дык не пасаром нас. Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на векі вякоў. Амін.

Дыякан: Блаславі, ойча, сьвяты ўваход.

Сьвятар (бласлаўляе ўваход): Блаславёны ўваход сьвятых Тваіх на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на векі вякоў. Амін.

Як толькі заканчваецца сьпеў, дыякан кажа ўголас:

Мудрасьць, устаньце!

Людзі: Сьвятло лагоднае сьвятое славы несьмяротнага Айца нябеснага, сьвятога, блаславёнага – Ісусе Хрысьце! Дажыўшы да захаду сонца і ўбачыўшы вячэрняе сьвятло, славім Айца, і Сына, і Сьвятога Духа – Бога. Дастойна ёсьць на ўсякі час чыстымі галасамі пяяць хвалу Тваю, Сыне Божы, што даеш жыцьцё: дзеля гэтага сьвет славіць Цябе.

Дыякан: Будзьма ўважлівыя.

Сьвятар: Мір усім! (Блаславўляе людзей)

Людзі: І твайму духу.

Дыякан: Мудрасьць. Слухайма ўважліва.

Чытальнік або, дзе ёсьць звычай, дыякан чытае пракімен дня; людзі паўтараюць першы верш, як прысьпеў. Пасьля:

Дыякан: Мудрасьць.

Чытальнік: Чытаньне кнігі Роду. (у Вялікі Тыдзень: Чытаньне кнігі Выхаду).

Дыякан: Слухайма ўважліва.

Чытальнік чытае адпаведны ўрывак са Сьвятога Пісаньня.

Пасьля першага чытаньня адразу прагалошваецца другі пракімен. У міжчасе сьвятар са сьвячою і кадзілам у руках стае перад ахвярнікам, і пасьля пракімена:

Дыякан: Загадайце!

Сьвятар: Мудрасьць, устаньце!

Павярнуўшыся да людзей, бласлаўляе іх і кажа:

Сьвятло Хрыстовае прасьвятляе ўсіх!

Чытальнік: Чытаньне кнігі Прыповесьцяў. (у Вялікі Тыдзень: Чытаньне кнігі Ёва).

Дыякан: Слухайма ўважліва.

Чытальнік чытае другі ўрывак са Сьвятога Пісаньня. Пасьля сьвятар кажа:

Мір табе, чытальнік! (Бласлаўляе)

Дыякан: Мудрасьць.

Сьвятар, узяўшы кадзільніцу і стаўшы перад ахвярнікам, пачынае сьпяваць:

Хай малітва мая ўзыдзе да Цябе, быццам кадзіла, і ахвярай вячэрняй будзе ўздыманьне рук маіх.

Людзі, калі сьвятар сьпявае гэты і наступныя вершы, кленчаць; пасьля ўстаюць і сьпяваюць як прысьпеў:

Хай малітва мая ўзыдзе да Цябе, быццам кадзіла, і ахвярай вячэрняй будзе ўздыманьне рук маіх.

Сьвятар (стаўшы з правага боку ахвярніка): Госпадзе, Цябе клічу: пачуй мяне, будзь уважлівы да голасу маленьня майго, калі я клічу Цябе.

Людзі: Хай малітва мая ўзыдзе да Цябе, быццам кадзіла, і ахвярай вячэрняй будзе ўздыманьне рук маіх.

Сьвятар (стаўшы ззаду ахвярніка): Пастаў, Госпадзе, ахову вуснам маім, і сьцеражы дзьверы губ маіх.

Людзі: Хай малітва мая ўзыдзе да Цябе, быццам кадзіла, і ахвярай вячэрняй будзе ўздыманьне рук маіх.

Сьвятар (стаўшы з левага боку ахвярніка): Ня дай ухіліцца сэрцу майму да благога, каб мне не шукаць прычыны да ўчынкаў нягодных.

Людзі: Хай малітва мая ўзыдзе да Цябе, быццам кадзіла, і ахвярай вячэрняй будзе ўздыманьне рук маіх.

Сьвятар (стаўшы перад ахвярнікам): Хай малітва мая ўзыдзе да Цябе, быццам кадзіла.

Людзі: І ахвярай вячэрняй будзе ўздыманьне рук маіх.

Пасьля сьпеву сьвятар і дыякан становяцца перад райскімі дзьвярамі. Сьвятар гаворыць малітву сьв. Ахрэма Сірына:

Госпадзе і Ўладару жыцьця майго, духа ленасьці, нуды, уладалюбства і марнаслоўя ня дай мне. (Усе робяць зямны паклон)

Духа чысьціні, пакоры, цярплівасьці і любові дай мне, слузе Твайму. (Зямны паклон)

Так, Госпадзе Ўладару! Дай мне бачыць мае правіны і не асуджаць брата май-

го, бо Ты блаславёны на векі вякоў. Амін. (Зямны паклон)

І вяртаюцца ў алтар.

На гэтым месцы, калі належыцца, чытаецца Апостал і Евангельле (у Вялікі Тыдзень толькі Евангельле). Парадак чытаньня звычайны, як на Літургіі.

Дыякан (стаўшы на сваім месцы): Скажам усе разам ад усяе душы і ад усяе думкі нашае скажам.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Госпадзе ўсемагутны, Божа айцоў нашых, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Зьмілуйся над намі, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Яшчэ молімся за Сьвятога Айца нашага, Сусьветнага біскупа... (імя) Папу Рымскага, дастойнага арцыбіскупа (багалюбнага біскупа) нашага... (імя) і ўсіх у Хрысьце братоў нашых.

Яшчэ молімся за яго (яе) міласьць... (імя галавы дзяржавы), за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны.

Яшчэ молімся за Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас.

Яшчэ молімся за братоў нашых сьвятароў, дыяканаў і манахаў, і ўсіх братоў і сёстраў нашых у Хрысьце.

Яшчэ молімся за годных памяці заснавальнікаў гэтай сьвятой царквы і за ўсіх раней адышоўшых айцоў і братоў нашых, якія тут і на кожным іншым месцы спачываюць.

Яшчэ молімся за дабрачынцаў гэтай сьвятой царквы, за тых, што прыносяць дары, працуюць і сьпяваюць у ёй, і за ўсіх тут

прысутных людзей, якія чакаюць ад Цябе багацьця Твайго зьмілаваньня.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Божа наш, прымі шчырыя малітвы слугаў Тваіх і зьмілуйся над намі паводле велічы Тваёй міласэрнасьці; пашлі даброты Твае на нас і на ўсіх людзей Тваіх, якія чакаюць ад Цябе багацьця Твайго зьмілаваньня.

Уголас: Бо Ты міласьцівы і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Літанія за пакліканых (г. зн. тых, што рыхтуюцца да сьвятога хросту) і прасьветленых (тых, што маюць неўзабаве атрымаць хрост).

Дыякан: Памаліцеся, пакліканыя, Госпаду.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Верныя, памолімся за паклікаваных, каб Госпад зьмілаваўся над імі.

Каб Ён прасьвятліў іх словам праўды.

Каб даў ім зразумець дабравешчаньне праведнасьці.

Каб зьяднаў іх са сьвятой сваёй, паўсюднай і апостальскай Царквой.

Пакліканыя, галовы вашы Госпаду схіліце.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Божа, Божа наш, Творча і Ўладару ўсіх, Ты, што хацеў, каб усе збавіліся і прыйшлі да разуменьня праўды, глянь на пакліканых тут слуг Тваіх і вызвалі іх ад старой спакусы і нападаў супраціўніка; і, прасьвятліўшы іхнія душы і целы, пакліч іх да жыцьця вечнага і далучы да Твайго духоўнага статку, які носіць імя Тваё.

Уголас: Каб яны разам з намі маглі славіць Тваё пачэснае і велічнае імя, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: Пакліканыя, выходзьце; усе пакліканыя, выходзьце; пакліканыя, выходзьце; хай ніхто з пакліканых не застанецца тут!

Пачынаючы з чацьвёртай серады Посту бывае літанія за прасьветленых (г. зн. за тых, што павінны атрымаць хрост на Вялікдзень). Пасьля Хай ніхто з пакліканых не застанецца тут дыякан працягвае:

Тыя, што да прасьвятленьня, прыступіце; памаліцеся ўсе, хто рыхтуецца да прасьвятленьня.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Верныя, памолімся за тых, што рыхтуюцца да сьвятога прасьвятленьня, і за збаўленьне іх.

Каб Госпад Бог умацаваў іх і даў ім сілы.

Каб Ён прасьвятліў іх прасьвятленьнем розуму і набожнасьці.

Каб зрабіў іх годнымі ў свой час вады адраджэньня, адпушчэньня грахоў і вопраткі нятленнасьці.

Каб нарадзіў іх вадою і Духам.

Каб даравaў ім дасканалую веру.

Каб далучыў іх да свайго абранага статку.

Збаў, зжалься, заступіся і сьцеражы іх, Божа, ласкаю Тваёю.

Тыя, што да прасьвятленьня, галовы вашыя Госпаду схіліце.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Ñüâÿòàð (ціха): Яві, Уладару, аблічча Тваё тым, што рыхтуюцца да сьвятога прасьвятленьня і жадаюць вызваліцца ад брыдоты грахоў: прасьвятлі іхнія думкі, навучы іх веры, умацуй іх у надзеі, зрабі дасканалымі ў любові, пакажы ім пачэснае цела Хрыста, які аддаў сябе як збаўленьне за душы нашыя.

Уголас: Бо Ты прасьвятленьне наша, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: Тыя, што да прасьвятленьня, выходзьце; усе, што да прасьвятленьня, выходзьце; усе пакліканыя, выходзьце; хай ніхто з пакліканых не застанецца тут.

Дыякан: Усе верныя, яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (ціха): Божа вялікі, усяхвальны, што перавёў нас ад тленнасьці да нятленнасьці жыватворчаю сьмерцю Хрыста свайго, вызвалі нашыя пачуцьці ад пажаданьняў, якія вядуць да сьмерці, і дай нам разважнасьць за добрага праваднікá: хай вока ўстрымаецца ад бачаньня благога, а слых будзе глухі для слоў пустых; а язык хай будзе вольны ад гутарак недастойных; ачысьці нашыя вусны, каб яны хвалілі Цябе, Госпадзе; зрабі, каб нашыя рукі цураліся ўсялякіх благіх учынкаў і рабілі толькі прыемнае

Табе; умацуй нашыя целы і розум ласкаю Тваёю.

Дыякан: Мудрасьць!

Сьвятар (уголас): Бо Табе належыцца ўсякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (ціха): Молім Цябе, Уладару сьвяты, усядобры, багаты на міласэрнасьць: будзь спагадлівы да нас, грэшных, і зрабі нас годнымі прыняць адзінароднага Сына Твайго і Бога нашага, Уладара славы. Бо вось Ягонае ўсячыстае Цела і жыватворчая Кроў у атачэньні мноства нябачных хораў

нябесных, прыносяцца ў гэтую хвіліну, каб быць пакладзенымі на гэтым сьвятым стале. Дай нам прыняць іх без асуджэньня, каб з прасьветленымі духоўнымі вачыма мы сталіся сынамі сьвятла і дня.

Дыякан: Мудрасьць!

Сьвятар (уголас): Паводле дару Хрыста Твайго, з якім блаславёны Ты і Твой усесьвяты, добры і жыватворчы Дух, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Людзі: Сёньня сілы нябесныя з намі нябачна служаць, бо вось ідзе Ўладар славы, вось ахвяра тайная, дасканалая ўрачыста прыносіцца.

Дыякан уваходзіць у алтар. Адчыняюцца райскія дзьверы. Сьвятар кадзіць ахвярнік і сьвятыя дары; пасьля, стаўшы з дыяканам перад ахвярнікам, гаворацць тройчы:

Сьвятар: Сёньня сілы нябесныя з намі нябачна служаць, бо вось ідзе Ўладар славы, вось ахвяра тайная, дасканалая ўрачыста прыносіцца.

Дыякан: З вераю і любоўю прыступім, каб нам быць удзельнікамі жыцьця вечнага. Алілуя, алілуя, алілуя. (Робяць паклон)

Гэта паўтараецца тройчы; тады, пацалаваўшы ахвярнік і пакланіўшыся людзям, ідуць да прыгатавальніка. Сьвятар дае пакравец дыякану, а сам бярэ праваю рукою дыскас са сьвятымі дарамі і ставіць сабе на галаву, леваю бярэ чашу і, нічога ня кажучы, выходзіць паўночнымі дзьвярамі і ідзе праз райскія дзьверы да ахвярніка. Дыякан ідзе наперадзе і кадзіць, а людзі праз увесь час уваходу ляжаць ніцма на зямлі. Прыйшоўшы, сьвятар ставіць дыскас і чашу на ахвярнік, пакрывае іх, кадзіць і разам з дыяканам робіць тры зямныя паклоны. Дзьверы зачыняюцца і заслона зацягваецца напалову.

Людзі: З вераю і любоўю прыступім, каб нам быць удзельнікамі жыцьця вечнага. Алілуя, алілуя, алілуя.

Дыякан: Дапоўнім вячэрнюю малітву нашу Госпаду.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: За прынесеныя і раней асьвячаныя пачэсныя дары Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Каб чалавекалюбны Бог наш, прыняўшы іх на свой сьвяты, нябесны і духоўны ахвярнік, як адмысловую духмянасьць духоўную, паслаў нам узамен сваю Боскую ласку і дар Сьвятога Духа, памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Каб нам выбавіцца ад усякага гневу, суму і недастатку, Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар (у міжчасе моліцца ціха): Божа невыказных і нябачных тайнаў, Скарбніца мудрасьці і розуму: Ты навучыў нас выконваць гэтую службу і ў вялікім чалавекалюбстве Тваім паклікаў нас, грэшных, прыносіць Табе дары і ахвяры за нашы грахі і за людзкое няведаньне. Ты сам, нябачны Ўладару, Творца вялікіх і недасьледных, слаўных і значных справаў, якім няма ліку, глянь на нас, Тваіх недастойных слугаў, якія, быццам перад Тваім хэрувімскім пасадам, стаяць перад гэтым ахвярнікам, на якім Твой адзінародны Сын і Бог наш спачывае пад выглядам гэтых страшных Тайнаў; вызваліўшы нас і ўсіх людзей Тваіх ад усякае нячыстасьці, асьвяці нашы душы і целы неад’ем-

ным асьвячэньнем, каб мы з чыстым сумленьнем, непасаромленым тварам і прасьветленым сэрцам маглі прыняць гэтыя Боскія сьвятасьці і, ажыўленыя імі, зьяднацца з самым Хрыстом Тваім, праўдзівым Богам нашым, які сказаў: “Хто есьць Маё цела і п’е Маю кроў, той прабывае ўва Мне і Я ў ім”. Такім чынам, Госпадзе, маючы Слова Тваё, што жыве ў нас і прабывае сярод нас, станемся сьвятыняю ўсесьвятога і ўсяхвальнага Духа і, вызваленыя ад усякіх д’ябальскіх падступных дзеяньняў, слоў і думак, атрымаем абяцаныя даброты разам з усімі сьвятымі, што ад пачатку сьвету Табе дагадзілі.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Каб увесь гэты вечар быў дасканалы, сьвяты, мірны і бязгрэшны, у Госпада просім.

Людзі: Дай нам, Госпадзе. (Так пасьля наступных прашэньняў)

Дыякан: Анёла спакою, вернага настаўніка, апекуна душ і целаў нашых у Госпада просім.

Прабачэньня і адпушчэньня грахоў і правінаў нашых у Госпада просім.

Усяго, што добрае і карыснае для душ нашых, і супакою для сьвету ў Госпада просім.

Каб далейшы цяг жыцьця нашага ў супакоі і пакаяньні правесьці, у Госпада просім.

Хрысьціянскага канца жыцьця нашага, бязбольнага, бездакорнага, спакойнага, і добрага адказу на страшным судзе Хрыстовым просім.

Папрасіўшы адзінства веры і супольнасьці Духа Сьвятога, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар: І зрабі нас дастойнымі, Уладару, з поўным даверам і без асуджэнь-

ня сьмець зьвяртацца да Цябе, Бога нябеснага, як да Айца, і казаць:

Людзі: Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая, як у небе так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня. І адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым. І ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

Сьвятар: Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Мір усім.

Людзі: І твайму духу.

Дыякан: Галовы нашы Госпаду схілім.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Божа, адзіны добры і добрасардэчны, што жывеш на вышынях і глядзіш на пакорных, глянь спагадлівым вокам на ўсіх людзей Тваіх і захавай іх у бясь-

печнасьці; і зрабі нас дастойнымі без асуджэньня прыняць гэтыя Твае жыватворчыя Тайны, бо мы схілілі галовы перад Табою ў спадзяваньні велічы Тваёй міласэрнасьці.

Уголас: Ласкаю, міласэрнасьцю і чалавекалюбствам адзінароднага Сына Твайго, з якім благаславёны Ты і Твой усесьвяты, добры і жыватворчы Дух, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар (ціха): Госпадзе Ісусе Хрысьце, Божа наш, які сядзіш з Айцом на вышынях і тут з намі нябачна прабываеш, глянь з Твайго сьвятога жыльля і з пасаду славы валадарства Твайго, і прыйдзі асьвяціць нас; будзь ласкавы даць нам магутнай Тваёй рукою Твае ўсячыстае Цела і пачэсную Кроў, а праз нас усім людзям.

Робіць тры паклоны, кажучы:

Божа, будзь спагадлівы мне, грэшнаму, і зьмілуйся нада мною.

Дыякан: Будзьма ўважлівыя!

Сьвятар, уклаўшы рукі пад пакравец і падняўшы Агнец, кажа ўголас:

Раней асьвячаныя сьвятыя рэчы для сьвятых.

Людзі: Адзін Сьвяты, адзін Госпад Ісус Хрыстос на славу Бога Айца. Амін.

Пакаштуйце і ўбачыце, як добры Госпад. Алілуя алілуя, алілуя.

Дыякан уваходзіць у алтар і становіцца па правай руцэ сьвятара. Зачыняецца заслона.

Дыякан: Раздрабі, ойча, сьвяты Хлеб.

Сьвятар, адклаўшы пакравец, раздзяляе Агнец на чатыры часткі, кажучы:

Раздрабляецца і разьдзяляецца Агнец Божы, які застаецца непадзельны, хоць яго разьдзяляюць, і заўсёды неспажыты, хоць яго ўсьцяж спажываюць, але які асьвячае тых, што яго прымаюць.

Укладае частку з літарамі ІС у чашу. Дыякан уլівае цёплую ваду ў чашу, нічога ня кажучы.

Сьвятар: Дыякане, падыдзі.

Дыякан: Вось прыходджу да Ўладара і Бога нашага: дай мне, ойча, пачэснае і сьвятое Цела і Кроў Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста.

Сьвятар дае дыякану частку Сьвятых Дароў, кажучы:

Пачэснае і сьвятое Цела і Кроў Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста даецца сьвятадыякану… (імя), для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Дыякан, трымаючы ў правай далоні сьвяты хлеб, адыходзіць і становіцца ззаду ахвярніка.

Сьвятар, зрабіўшы глыбокі паклон, бярэ частку сьвятога хлеба, кладзе сабе на правую далонь, кажучы:

Пачэснае і сьвятое Цела і Кроў Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста даецца мне, нягоднаму сьвятару… (імя), для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Трымаючы сьвяты хлеб у далоні і схіліўшы галовы, абодва моляцца ціха, або, калі ёсьць звычай, голасна разам з людзьмі :

Веру, Госпадзе, і вызнаю, што Ты сапраўды Хрыстос, Сын Бога жывога, што прыйшоў на сьвет збавіць грэшнікаў, сярод якіх я самы першы. Веру таксама, што гэта сапраўды Тваё сьвятое Цела і пачэсная Кроў. Малюся Табе: зжалься нада мною і даруй мне мае правіны вольныя і міжвольныя, якія я зрабіў словам і ўчынкам, сьвядома і несьвядома. І дай мне без асуджэньня прыняць Твае сьвятыя Тайны для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Зрабі мяне сёньня, Сыне Божы, удзельнікам Тваёй Тайнай вячэры; я ня здраджу ворагам Тваім тайны і ня дам пацалунку, як Юда, але як разбойнік вызнаю Цябе: успомні мяне, Госпадзе, у Тваім валадарстве.

Няхай прыняцьце сьвятых Тваіх Тайнаў будзе мне не на суд ці асуджэньне, але для аздараўленьня душы і цела.

І спажываюць сьвяты хлеб. Сьвятар бярэ чашу і п’е з яе. Дыякан ня п’е, бо ён пасьля павінен спажыць сьвятыя дары. Калі сьвятар служыць сам, дык таксама з чашы ня п’е дзеля той самай прычыны.

Дыякан укладае ў чашу апошнія часткі Агнеца і пакрывае яе пакраўцом. Адчыняюцца райскія дзьверы. Дыякан з чашаю ў руках выходзіць райскімі дзьвярамі, кажучы ўголас:

Са страхам Божым, вераю і любоўю падыходзьце.

Людзі: Бласлаўляю Госпада на ўсякі час: хвала Яго на вуснах маіх.

Сьвятар бярэ ад дыякана чашу і прычашчае верных, кажучы за кожным разам:

Слуга Божы (Божая) … (імя) прымае сьвятое Цела і пачэсную Кроў Госпада, і Бога, і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста для адпушчэньня грахоў і жыцьця вечнага.

Скончыўшы, сьвятар адносіць чашу на ахвярнік, кажучы ціха:

Дыкрануўшыся да вашых вуснаў, яно адыме вашыя бясчынствы і ачысьціць грахі.

Пасьля ўголас, павярнуўшыся да людзей:

Збаў, Божа, людзей Тваіх і блаславі набытак Твой. (Бласлаўляе людзей)

Людзі: Хлеб нябесны і чашу жыцьця прыміце і ўбачыце, як добры Госпад. Алілуя, алілуя, алілуя.

Сьвятар кадзіць сьвятыя дары, кажучы ціха тройчы:

Узьнясіся на нябёсы, Божа, і хай па ўсёй зямлі разыдзецца слава Твая.

Пасьля, зрабіўшы паклон, дае дыскас дыякану, які, пакланіўшыся перш да людзей, адносіць яго на прыгатавальнік; а сам, пакланіўшыся, бярэ чашу, кажучы ціха:

Блаславёны Бог наш.

Павярнуўшыся да людзей, уголас:

На ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

І адносіць Сьвятыя Дары на прыгатавальнік, кадзіць і адыходзіць да ахвярніка, а дыякан ідзе на сваё месца перад іканастасам.

Людзі: Амін. Хай нашы вусны будуць поўныя хвалы Тваёй, Госпадзе, каб нам пяяць славу Тваю, бо Ты зрабіў нас дастойнымі быць удзельнікамі сьвятых Тваіх, Боскіх, несьмяротных і жыватворчых Тайнаў. Захавай нас у Тваёй сьвятасьці, каб нам увесь дзень навучацца Тваёй справядлівасьці. Алілуя, алілуя, алілуя.

Дыякан: Устаньце! Атрымаўшы Боскія, сьвятыя, усячыстыя, несьмяротныя, нябесныя і жыватворчыя, страшныя Хрыстовыя тайны, дастойна падзякуем Госпаду.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Папрасіўшы, каб гэты ўвесь дзень быў дасканалы, сьвяты, мірны і бязгрэшны, самі сябе, і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар (ціха): Дзякуем Табе, Збаўцелю ўсіх і Божа, за ўсё добрае, што Ты нам даў, і за прыняцьце сьвятога Цела і Крыві Хрыста Твайго. Молімся Табе, чалавекалюбны Ўладару: захавай нас пад покрывам крылаў Тваіх, і дай нам да апошняе хвіліны жыцьця нашага дастойна прымаць сьвятасьці Твае дзеля прасьвятленьня душы і цела, і спадчыны валадарства нябеснага.

Уголас: Бо Ты асьвячэньне наша, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Сьвятар: Пойдзем з мірам.

Людзі: У імя Госпадняе.

Дыякан: Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар, стаўшы перад райскімі дзьвярамі або іконай Хрыста, з дыяканам з правага боку, моліцца:

Усемагутны Ўладару, які мудрасьцю сваёю стварыў усё, што існуе, і невыказным провідам Тваім прывёў нас да гэтых пачэсных дзён для ачышчэньня душ і целаў, утаймаваньня пажадлівасьцяў і надзеі ўваскрасеньня; Ты, што пасьля сарака дзён даў слузе Твайму Майсею табліцы Закону, напісаныя Боскай рукою, у дабрыні Тваёй дай нам змагацца добрым змаганьнем, час посту добра закончыць, захаваць непарушнай веру, скрышыць галовы нябачных ворагаў, быць пераможцамі граху і без асуджэньня

дажыць пакланіцца сьвятому ўваскрасеньню. Бо ўсепачэснае і велічнае імя Тваё, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, блаславёнае і праслаўленае цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін. Хай будзе імя Гасподняе блаславёнае цяпер і давеку. (Тройчы)

Сьвятар і дыякан вяртаюцца ў алтар і, схіліўшы галовы, кажуць ціха наступную малітву:

Госпадзе, Божа наш, які ўвёў нас у гэтыя пачэсныя дні і ўчыніў удзельнікамі страшных Тваіх тайнаў, прылучы нас да Тваёй духоўнай паствы і зрабі спадкаемцамі валадарства Твайго, цяпер і заўсёды, і на ўсе вякі. Амін.

Дыякан ідзе да прыгатавальніка і спажывае сьвятыя дыры. У міжчасе бывае чытаньне Пс 33.

Чытальнік: Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

(Пс 33) Увесь час бласлаўляць буду Госпада: хвала Ягоная заўжды на вуснах маіх.

Госпадам будзе хваліцца душа мая: хай пачуюць пакорныя і ўзрадуюцца.

Слаўце Госпада са мною: будзем разам узьвялічваць Яго.

Я шукаў Госпада, і Ён пачуў мяне, і адняў ад мяне ўсю тугу маю.

Гляньце на Яго і ўзрадуйцеся: хай аблічны вашы ня будуць пасаромленыя.

Вось убогі ўсклікнуў, і Госпад пачуў яго, і ад усіх напасьцяў выбавіў яго.

Анёл Госпадні стаіць, быццам мур абаронны, вакол тых, што баяцца Яго, і выбаўляе іх.

Пакаштуйце, і ўбачыце, як добры Госпад: шчасьлівы той, хто да Яго прыбягае.

Бойцеся Бога, усе сьвятыя Яго, бо тыя, што Яго баяцца, не зазнаюць бяды.

Багатыя зьбяднелі і церпяць голад; тыя, што шукаюць Госпада, ня будуць мець ні ў чым нястачы.

Хадзіце, дзеткі, паслухайце мяне: страху Госпадняга навучу вас.

Хто той чалавек, што любіць жыцьцё і што рады бачыць шчасьлівыя дні?

Устрымай язык твой ад злога і вусны твае ад словаў крывадушных.

Ухіліся ад злога і чыні дабро: шукай супакою і захоўвай яго.

Вочы Госпада зьвернутыя да праведных, вушы Яго чуюць кліч іх.

Твар Госпада супраць тых, што чыняць благое, каб вынішчыць іх памяць на зямлі.

Усклікнулі праведнікі, і Госпад пачуў іх, і ад усіх бедаў выбавіў іх.

Блізкі Госпад да скрушлівых сэрцам, прыгнечаных духам Ён выбаўляе.

Шмат бедаў у праведніка, і ад усіх іх ратуе яго Госпад.

Ён сьцеражэ ўсе ягоныя косьці: ніводная з іх ня скрышыцца.

Сьмерць грэшнікаў лютая; грашаць тыя, што ненавідзяць праведніка.

Госпад вызваляе душы слугаў сваіх: не зазнае кары той, хто на Яго спадзяецца.

Сьвятар: Блаславеньне Гасподняе хай будзе на вас, ласкаю Яго і чалавекалюбствам на ўсе часы, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. (Бласлаўляе людзей)

Людзі: Амін.

Сьвятар: Слава Табе, Хрысьце Божа, надзея наша, слава Табе.

Людзі: Слава Айцу і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся. Ойча, блаславі.

Сьвятар робіць водпуст:

У дні Вялікага Посту: Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі найчыстае свае Маці; сьвятых слаўных і годных пахвалы апосталаў, між сьвятымі айца нашага Рыгора Вялікага, Папы Рымскага; сьвятога (сьвятой) … (імя сьвятога патрона царквы); сьвятога (сьвятой) … (імя сьвятога дня); сьвятога (-той) … (імя сьвятога дня); сьвятых слаўных і роўных апосталам настаўнікаў славянскіх Кірылы і Мятода; між сьвятымі айца нашага Кірылы, біскупа Тураўскага, і сьвятое маці нашае Еўфрасіньні Полацкае, асьветніцы Беларусі, і ўсіх сьвятых заступнікаў беларускага народу; сьвятых і праведных богаайцоў Якіма і Ганны і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

У панядзелак, аўторак і сераду Вялікага Тыдня:

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які дзеля нашага збаўленьня ідзе на дабравольныя

мукі, малітвамі найчыстае свае Маці, між сьвятымі айца нашага Рыгора Вялікага, Папы Рымскага; сьвятых і праведных багаайцоў Якіма і Ганны і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

Людзі: Амін.

# Пракімены і алілуя нядзельныя васьмі тонаў

## Тон 1

Пракімен (Пс 32:22,1): Хай любоў Твая, Госпадзе, спачыне на нас, бо мы ўсклалі надзею на Цябе.

Верш: Усклікніце, праведныя, Госпаду ў радасьці: хвала пасуе праведным.

Алілуя (Пс 17:48,51): Бог дае помсту і пакарае мне людзей.

Верш: Ён памнажае збаўленьне караля свайго і праяўляе спагаду памазаньніку свайму Давіду і пакаленьню яго давеку.

## Тон 2

Пракімен (Пс 117:14,18): Госпад – сіла мая і песьня: Ён стаўся мне збаўленьнем.

Верш: Шматразова караў мяне Госпад, але на сьмерць не аддаў мяне.

Алілуя (Пс 19:1,10): Хай пачуе цябе Госпад у дзень суму, хай імя Бога Якубавага будзе табе абаронаю.

Верш: Госпадзе, збаў караля і пачуй нас, калі будзем клікаць Цябе.

## Тон 3

Пракімен (Пс 46:7,2): Сьпявайце Богу нашаму, сьпявайце, сьпявайце Уладару нашаму, сьпявайце.

Верш: Усе народы пляскайце ў далоні, усклікніце Госпаду радасным голасам.

Алілуя (Пс 30:2,3): На Цябе, Госпадзе, спадзяюся: хай не пасаромеюся ніколі.

Верш: Будзь мне абароннай сьцяною, бясьпечным прыстанішчам, дзе б я мог знайсьці збаўленьне.

## Тон 4

Пракімен (Пс 103:24,1): Якое багацьце твораў Тваіх, Госпадзе: Ты ўсё мудра стварыў.

Верш: Блаславі, душа мая, Госпада: Госпадзе Божа мой, Ты вялікі наўзьдзіў.

Алілуя (Пс 44:5,8): Падрыхтуйся і ідзі ўперад пераможна дзеля праўды, набожнасьці і справядлівасьці.

Верш: Ты палюбіў справядлівасьць і ўзьненавідзеў беззаконьне.

## Тон 5

Пракімен (Пс 11:8,12): Ты, Госпадзе, сьцеражы нас і захавай нас ад гэтага роду давеку.

Верш: Збаў мяне, Госпадзе, бо не засталося праведніка: няма верных сярод сыноў людзкіх.

Алілуя (Пс 88:2,3): Міласэрнасьць Тваю буду вечна славіць, Госпадзе, праўду Тваю абвяшчаць буду вуснамі маімі з пакаленьня ў пакаленьне.

Верш: Я сказаў: Міласэрнасьць створаная, каб трываць давеку, праўда ж Твая мае непахісную ў небе аснову.

## Тон 6

Пракімен (Пс 27:9,1): Збаў, Госпадзе, людзей Тваіх і благаславі набытак Твой.

Верш: Цябе, Госпадзе, клічу: Божа мой, не змаўчы.

Алілуя (Пс 90:1,2): Той, хто жыве пад апекаю Ўсявышняга і ў цені Бога нябеснага прабывае.

Верш: Скажа Госпаду: Ты – маё прыстанішча, мая абарона, Бог мой і на Цябе спадзяюся.

## Тон 7

Пракімен (Пс 28:11,1): Госпад сілу людзям сваім дае, Госпад благаслаўляе людзей сваіх супакоем.

Верш: Аддайце Госпаду, сыны Божыя, аддайце Госпаду славу і пашану.

Алілуя (Пс 91: 2,3): Добра ёсьць славіць Госпада і пець хвалу імю Твайму, Усявышні.

Верш: Абвяшчаць раніцай міласэрнасьць Тваю, і праўду Тваю ўночы.

## Тон 8

Пракімен (Пс 75:12,2): Выконвайце абяцаньні, дадзеныя Госпаду Богу нашаму.

Верш: Бог вядомы ў Юдэі, у Ізраілі вялікае імя Яго.

Алілуя (Пс 94:1,2): Прыйдзіце, будзем радасна славіць Госпада, будзем пяяць Богу Збавіцелю нашаму.

Верш: Станем з удзячнасьцю перад аблічам Ягоным, у песьнях уславім Яго.

## Пракімены, алілуя і прычасьнікі на кожны дзень тыдня

### Панядзелак
### Служба сьвятым анёлам

Пракімен (Пс 103:4,1): Ён робіць вятры пасланцамі сваімі, і слугамі сваімі – полымя агню.

Верш: Блаславі, душа мая, Госпада: Госпадзе Божа мой, Ты вялікі наўзьдзіў.

Алілуя (Пс 148:2; 32:9): Хваліце Госпада, усе анёлы Яго, хваліце Яго, усе сілы Яго.

Верш: Бо Ён сказаў, і сталася; загадаў, і ўсё прыйшло да быцьця.

Прычасьнік: Ён робіць вятры пасланцамі сваімі, і слугамі сваімі – полымя агню. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Аўторак
## Служба сьвятому Яну Хрысьціцелю

Пракімен (Пс 63:11,2): Праведнік узрадуецца ў Госпадзе і знойдзе прытулак у Яго.

Верш: Госпадзе, пачуй голас малітвы маёй.

Алілуя (Пс 91:13,14): Праведнік як пальма зацьвіце, як кедр лібанскі разрасьцецца.

Верш: Пасаджаны ў доме Госпаднім, ён расьцьвіце на панадворку Бога нашага.

Прычасьнік (Пс 111:6-7): Памяць праведніка жыць будзе вечна, благое весткі ён не збаіцца. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Серада
## Служба Найсьвяцейшай Багародзіцы і Крыжу

Пракімен (Лк 1:46-47): Душа мая абвяшчае веліч Госпада, і мой дух узрадаваўся ў Богу Збаўцы маім.

Верш: Бо Ён глянуў на пакорнасьць служкі сваёй: ад гэтага часу шчасьліваю будуць называць мяне ўсе пакаленьні.

Алілуя (Пс 44:11,13): Слухай, дачка, глянь і прыхілі вуха тваё.

Верш: Вяльможы людзкія будуць шукаць ласкі ў цябе.

Прычасьнік (Пс 115:4): Чашу збаўленьня прыму, буду клікаць імя Госпадняе. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Чацьвер
## Служба апосталам і сьвятому Міколу

Пракімен (Пс 18:5,2): Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

Верш: Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

Алілуя (Пс 88:6,8): Нябёсы славяць цуды Твае, Госпадзе, і вернасьць Тваю – хоры сьвятых.

Верш: Бог праслаўлены ў мностве сьвятых.

Прычасьнік (Пс 18:5,2): Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Пятніца
## Служба Крыжу Гасподняму

Пракімен (Пс 98:5,1): Узьвялічвайце Госпада Бога нашага і пакланяйцеся падножжу Ягонаму, бо Ён сьвяты.

Верш: Госпад пануе – хай дрыжаць людзі; Ён сядзіць на хэрувімах – хай ускалыхнецца зямля.

Алілуя (Пс 73:2,12): Успомні народ Твой, які Ты ад пачатку прызначыў для сябе.

Верш: Бог – Уладар наш спрадвеку: Ён учыніў збаўленьне пасярод зямлі.

Прычасьнік: Ты, Божа, учыніў збаўленьне пасярод зямлі. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Субота
## Служба ўсім сьвятым і памерлым

Пракімен (Пс 31:11,1): Весяліцеся ў Госпадзе і радуйцеся, праведныя.

Верш: Шчасьлівыя, каму адпушчаныя бясчынствы і чые грахі пакрытыя.

І памерлым (Пс 24:13): Душы іх у шчасьці жыць будуць.

Алілуя (Пс 33:18,20): Усклікнулі праведнікі, і Гоcпад пачуў іх, і ад усіх бедаў выбавіў іх.

Верш: Шмат бедаў прыйшлося зазнаць праведнікам, і ад усіх іх выбавіў іх Госпад.

І памерлым (Пс 64:5): Шчасьлівыя, каго Ты выбраў і прыняў, Госпадзе: памяць іх будзе жыць з пакаленьня ў пакаленьне.

Прычасьнік (Пс 32:1): Усклікніце, праведнікі, Госпаду ў радасьці: хвала пасуе праведным.

І памерлым (Пс 64:5): Шчасьлівыя, каго Ты выбраў і прыняў, Госпадзе: памяць іх будзе жыць з пакаленьня ў пакаленьне. Алілуя, алілуя, алілуя.

# Пракімены, алілуя і прычасьнікі агульныя сьвятым

## Найсьвятой Багародзіцы

Гл. службу серады

## Анёлам

Гл. службу панядзелка

## Яну Прадвесьніку

Гл. службу аўторка

## Прароку

Пракімен (Пс 109:4,1): Ты – сьвятар давеку паводле чыну Мэльхісэдэка.

Верш: Сказаў Госпад Госпаду майму: Сядзь па правай руцэ Маёй, пакуль пакладу ворагаў Тваіх падножжам для ног Тваіх.

Алілуя (Пс 98:6;96:1): Майсей і Аарон сярод сьвятароў Яго і Самуіл сярод тых, што клічуць імя Яго.

Верш: Сьвятло ўзышло для праведных і радасьць – для людзей правага сэрца.

Прычасьнік: Памяць праведніка жыць будзе вечна: благое весткі ён не збаіцца. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Апосталу або апосталам

Пракімен (Пс 18:5,2 ): Па ўсей зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету – словы іх.

Верш: Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

Алілуя (Пс 88:6,8): Нябёсы славяць цуды Твае, Госпадзе, і вернасьць Тваю – хоры сьвятых.

Верш: Бог праслаўлены ў мностве сьвятых.

Прычасьнік: Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету – словы іх. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Сьвятаначальніку

Пракімен (Пс 48:4,2): Вусны мае кажуць словы мудрасьці, разважнасьць – роздум сэрца майго.

Верш: Пачуйце гэта, усе людзі, слухайце уважліва, усе жыхары зямлі.

Алілуя (Пс 36:30,31): Вусны праведніка абвяшчаюць мудрасьць, язык ягоны кажа праўду.

Верш: Закон Бога ягонага ў сэрцы яго, ногі ягоныя не спатыкнуцца.

Прычасьнік: Памяць праведніка жыць будзе вечна, благое весткі ён не збаіцца. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Сьвятаначальнікам

Пракімен (Пс 115:6,3): Дарагая ў вачох Госпада сьмерць сьвятых Яго.

Верш: Чым адплачу Госпаду за ўсе дабрадзействы Яго?

Алілуя (Пс 131:9,13): Сьвятары Твае, Госпадзе, апрануцца ў справядлівасьць і сьвятыя Твае ў радасьці жыць будуць.

Верш: Бо Госпад выбраў Сыён, захацеў мець яго жыльлём сабе.

Прычасьнік: Памяць праведніка жыць будзе вечна, благое весткі ён не збаіцца. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Настаўніку царкоўнаму і вызнаўцы

Пракімен (Пс 77:1,2): Хай праведныя весяляцца ў славе і цешацца на ложах сваіх.

Верш: Сьпявайце Госпаду песьню новую, аддайце хвалу Яму ў грамадзе сьвятых.

Алілуя (Пс 111:1,2): Шчасьлівы муж, які баіцца Госпада і пацяшэньне знаходзіць ў запаветах Яго.

Верш: Патомства яго будзе магутным на зямлі.

Прычасьнік: Усклікніце, праведнікі, Госпаду ў радасьці: хвала пасуе праведным. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Пачэснаму айцу, пачэсным айцам

Пракімен (Пс 115:6,3): Дарагая ў вачох Госпада сьмерць сьвятых Яго.

Верш: Чым адплачу Госпаду за ўсе дабрадзействы Яго?

.

Алілуя (Пс 111:1,2): Шчасьлівы муж, які баіцца Госпада і пацяшэньне знаходзіць ў запаветах Яго.

Верш: Патомства яго будзе магутным на зямлі.

Прычасьнік: Памяць праведніка жыць будзе вечна, благое весткі ён не збаіцца. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Мучаніку

Гл. службу аўторка.

## Мучанікам

Пракімен (Пс 15:3,8): Госпад узбудзіў ува мне дзіўную любоў да сьвятых, што жывуць на Ягонай зямлі.

Верш: Маю Госпада заўжды перад вачыма: не пахіснуся, бо Ен па правай руцэ маёй.

Алілуя (Пс 33:18,20): Усклікнулі праведнікі, і Госпад пачуў іх, і ад усіх бедаў выбавіў іх.

Верш: Шмат бедаў прыйшлося зазнаць праведнікам, і ад усіх іх выбавіў іх Госпад.

Прычасьнік (Пс 32:1): Ускlікніце, праведнікі, Госпаду ў радасьці: хвала пасуе праведным.

## Сьвятамучаніку

Пракімен (Пс 77:1,2): Хай праведныя весяляцца ў славе і цешацца на ложах сваіх.

Верш: Сьпявайце Госпаду песьню новую, аддайце хвалу Яму ў грамадзе сьвятых.

Алілуя (Пс 131:9,13): Сьвятары Твае, Госпадзе, апрануцца ў справядлівасьць і сьвятыя Твае ў радасьці жыць будуць.

Верш: Бо Госпад выбраў Сыён, захацеў мець яго жыльлём сабе.

Прычасьнік: Памяць праведніка жыць будзе вечна, благое весткі ён не збаіцца. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Сьвятамучанікам

Пракімен (Пс 115:6,3): Дарагая ў вачох Госпада сьмерць сьвятых Яго.

Верш: Чым адплачу Госпаду за ўсе дабрадзействы Яго?

.

Алілуя (Пс 131:9,13): Сьвятары Твае, Госпадзе, апрануцца ў справядлівасьць і сьвятыя Твае ў радасьці жыць будуць.

Верш: Бо Госпад выбраў Сыён, захацеў мець яго жыльлём сабе.

Прычасьнік (Пс 32:1): Усклікніце, праведнікі, Госпаду ў радасьці: хвала пасуе праведным.

## Пачэснамучаніку, пачэснамучанікам

Гл. службу настаўніку царкоўнаму і вызнаўцы

## Мучаніцы, мучаніцам, сьвятой жанчыне

Пракімен (Пс 67:36,27): Дзіўны Бог у сьвятых сваіх, Бог Ізраіля.

Верш: На зборах вашых блаславіце Бога, Госпада, усе нашчадкі Ізраіля.

Алілуя (Пс 39:2,3): Спадзяваўся я на Госпада, спадзяваўся моцна, і Ен, схіліўшыся нада мною, пачуў кліч мой.

Верш: Ен выцягнуў мяне з гібельнае ямы і з багністага балота.

Прычасьнік (Пс 32:1): Усклікніце, праведнікі, Госпаду ў радасьці: хвала пасуе праведным.

## Бескарысьлівым лекарам і цудатворцам

Пракімен (Пс 15:3,8): Госпад узбудзіў ува мне дзіўную любоў да сьвятых, што жывуць на Ягонай зямлі.

Верш: Маю Госпада заўжды перад вачыма: не пахіснуся, бо Ен па правай руцэ маёй.

Алілуя (Пс 132:1,3): Як гэта добра, як міла, калі браты жывуць разам.

Верш: Бо Госпад там дае блаславеньне і жыцьцё давеку.

Прычасьнік (Пс 32:1): Усклікніце, праведнікі, Госпаду ў радасьці: хвала пасуе праведным.

## Служба за памерлых

Пракімен (Пс 24:13,1): Душы іх у шчасьці жыць будуць.

Верш: Да Цябе, Госпадзе, я ўзьняў душу маю, Божа мой, не змаўчы.

Алілуя (Пс 64:5;24:13): Шчасьлівыя, каго Ты выбраў і прыняў, Госпадзе: памяць іх будзе жыць з пакаленьня ў пакаленьне. Алілуя, алілуя, алілуя.

Верш: Душы іх у шчасьці жыць будуць.

Прычасьнік (Пс 64:5): Шчасьлівыя, каго Ты выбраў і прыняў, Госпадзе: памяць іх будзе жыць з пакаленьня ў пакаленьне. Алілуя, алілуя, алілуя.

Апостал і Евангельле:

У панядзелак: Рым 14: 6-9; Ян 5: 17-24
У аўторак: 1Кар 15: 39-47; Ян 5: 24-30
У сераду: 2Кар 5: 1-10; Ян 6: 35-39
У чацьвер: 1Кар 15: 20-28; Ян 6: 40-44
У пятніцу: 1Кар 15: 47-57; Ян 6: 48-54
У суботу: 1Сал 4: 13-17; Ян 5: 24-30

## Служба на ўсякую патрэбу

Пракімен: Госпадзе, пачуй просьбу маю, будзь уважлівы да голасу маленьня майго.

Верш: Хваліце Госпада, бо Ён добры.

Апостал: Флп 4: 4-9; або Эф 5: 10-17

Алілуя: Выбаў, Божа, Ізраіля ад усіх бедаў яго.

Верш: За тое памоліцца Табе кожны набожны чалавек у час патрэбы.

Евангельле: Мц 7: 7-11; або Мк 11: 23-26; або Лк 18: 2-8

Прычасьнік: Калі паклічу Цябе, Госпадзе, пачуй голас мой і зьмілуйся нада мною. Алілуя, алілуя, алілуя.

# Месяцаслоў

## Верасень

1. Пачатак царкоўнага году; пачэснага Сямёна Стоўпніка
2. Мучаніка Маманта; пачэснага Яна Посьніка, патр. Канстантынопальскага
3. Сьвятамучаніка Анхіма, біск. Нікамідыйскага; пачэснага Тэактыста посьніка
4. Сьвятамучаніка Вавілы, біск. Антыяхійскага; прарока Майсея
5. Прарока Захара, бацькі сьв. Яна Прадвесьніка
6. Успамін цуду архане́ла Міхала ў Калосах
7. Перадсьвяцьце Нараджэньня Найсьвяцейшай Багародзіцы; мучаніка Сазона
**8. Нараджэньне Найсьвяцейшай Багародзіцы**
9. Праведных Якіма і Ганны, бацькоў Багародзіцы; мучаніка Севярына
10. Мучаніц Мінадоры, Мітрадоры і Німфадоры
11. Пачэснае Тадоры Александрыйскай
12. Адданьне сьвята Нараджэньня Найсьвяцейшай Багародзіцы; сьвятамучаніка Аўтанома, біск.
13. Перадсьвяцьце Ўзвышэньня Крыжа; аднаўленьне храму Ўваскрасеньня; сьвятамучаніка Карнілы Сотніка
**14. Узвышэньне Пачэснага і Жыватворчага Крыжа**
15. Вялікамучаніка Мікіты
16. Вялікамучаніцы Аўхіміі
17. Мучаніц Веры, Надзеі, Любові і маці іх Сафіі
18. Пачэснага Яўмена, біск. Гартынскага

19. Мучанікаў Трахіма, Сабата і Дарымадонта
20. Вялікамучаніка Астапа
21. Адданьне сьвята Ўзвышэньня Крыжа; апостала Кандрата з 70-ці
22. Сьвятамучаніка Фокі, біск. Сінопскага;
23. Зачацьце сьв. Яна Прадвесьніка
24. Першамучаніцы роўнаапостальнае Тэклі
25. Пачэснае Еўфрасіньні Александрыйскай
26. Перастаўленьне сьв. апостала і евангеліста Яна Багаслова
27. Мучаніка Калістрата і іншых
28. Пачэснага Харытона вызнаўцы
29. Пачэснага Кірыяка самотніка
30. Сьвятамучаніка Рыгора асьветніка, біск. Вялікай Арменіі

## Кастрычнік

1. Покрыва Найсьвяцейшай Багародзіцы, апостала Ананіі з 70-ці, пачэснага Рамана Салодкапеўца
2. Сьвятамучаніка Кіпрыяна біск.; мучаніцы Юстыны
3. Сьвятамучаніка Дзяніса Арэапагіта
4. Сьвятамучаніка Ератэя, біск. Атэнскага
5. Мучаніцы Харытыны
6. Апостала Тамаша
7. Мучанікаў Сяргея і Бакха
8. Пачэснае Пелягеі
9. Апостала Якуба Алфеевага; пачэснага Андроніка і жонкі яго Апанасьсі
10. Мучанікаў Яўлана і Яўланьні
11. Апостала Піліпа, аднаго з 7-мі дыяканаў, пачэснага Тэафана, біск. Нікейскага, вызнаўцы

12. Мучанікаў Прова, Тараха і Андроніка; пачэснага Кузьмы, біск. Маюмскага
13. Мучанікаў Карпа, Папілы, Агападора і Агапонікі
14. Мучанікаў Назара, Герваза, Пратаса і Цэльса; пачэснае Параскевы Тырнаўскай
15. Сьвятамучаніка Лук'яна, празьбітара Антыяхійскага
16. Мучаніка Лонгіна Сотніка
17. Прарока Асіі; пачэснамучаніка Андрэя Крыцкага
18. Апостала і евангеліста Лукі
19. Прарока Яэля; мучаніка Увара
20. Вялікамучаніка Арцёма
21. Пачэснага Іларыёна Вялікага
22. Роўнаапостальнага Авера, біск. Ерапальскага, цудатворцы
23. Апостала Якуба, сваяка Гасподняга
24. Мучаніка Арэты і іншых
25. Мучанікаў Маркіяна і Мартырыя
26. Вялікамучаніка Зьмітра Салунскага
27. Мучаніка Несьцера Салунскага
28. Мучаніцы Параскевы; мучанікаў Цярэнція і Нэаніллы, пачэснага Сьцяпана посьніка, пачэснае Параскевы (Праксэды), ігуменьні Полацкай
29. Пачэснамучаніцы Анастасьсі; пачэснага Аўрама посьніка
30. Мучанікаў Зінова і Зіноўі
31. Апосталаў Стаха, Апэля, Амплея, Урбана, Арыстовула і Нарцыса з 70-ці

## Лістапад

1. Кузьмы і Дзямяна, бескарысьлівых лекараў і цудатворцаў

2. Мучанікаў Акіндына, Пігаса, Аўтонія, Эльпідафора і Анэмпадыста
3. Мучанікаў Акепсімы біск., Язэпа прэсьбітара і Айтала дыякана, вялікамучаніка Юр’я
4. Пачэснага Анікея Вялікага; сьвятамучанікаў Нікандра, біскупа Мірскага і Ярмея прэсьбітара
5. Мучанікаў Галакціёна і Эпістыміі
6. Сьвятаначальніка Паўла вызнаўцы, патр. Канстантынопальскага
7. 32-х мучанікаў Мелітэнскіх; пачэснага Лазара
8. Сабор арханёла Міхала і ўсіх бесьцялесных сілаў
9. Мучанікаў Анцыпара і Парфіра; пачэснае Матроны
10. Апосталаў Алімпа, Радзівона, Сасіпатра, Тэрцыя і Кварта з 70-ці
11. Мучанікаў Міны, Віктара, Вінцэнта і Сьцепаніды; пачэснага Тодара Студыта
12. Сьвятамучаніка Язафата, арцыбіск. Полацкага; Яна, патр. Александрыйскага, пачэснага Ніла Сінаіта
13. Сьвятаначальніка Яна Залатавуснага, арцыбіск. Канстантынопальскага
14. Апостала Піліпа
15. Мучанікаў Гурэя, Самона і Абіба
16. Апостала і евангеліста Мацьвея
17. Сьвятаначальніка Рыгора цудатворцы, біск. Нэакесарыйскага
18. Мучанікаў Платона і Рамана
19. Прарока Аўдзея; мучаніка Варлама
20. Перадсьвяцьце Ўваходу ў сьвятыню Найсьвяцейшай Багародзіцы, пачэснага Рыгора Дэкапаліта; сьвятаначальніка Прокла, арцыбіск. Канстантынопальскага
**21. Уваход у Храм Найсьвяцейшай Багародзіцы**
22. Апосталаў Халімона, Архіпа, Анісіма і мучаніцы роўнаап. Апфіі; мучаніцы Цэцыліі

23. Сьвятаначальнікаў Амфілёха, біск. Іканійскага і Рыгора, біск. Акрагантыйскага
24. Вялікамучаніцы Кацярыны; мучаніка Мяркурыя Смаленскага
25. Адданьне сьвята Ўваходу ў сьвятыню Багародзіцы; сьвятамучаніка Клімэнта, папы Рымскага і сьвятаначальніка Пятра, арцыбіск. Александрыйскага
26. Пачэснага Аліпа Стоўпніка
27. Вялікамучаніка Якуба Пэрсіяніна
28. Пачэснамучаніка Сьцяпана Новага; мучаніка Ірынарха
29. Мучанікаў Парамона і Філумэна
30. Апостала Андрэя Першапакліканага

## Сьнежань

1. Прарока Навума
2. Прарока Абакума
3. Прарока Сафона
4. Вялікамучаніцы Барбары; пачэснага Яна Дамаскіна
5. Пачэснага Савы Асьвячонага
6. Сьвятаначальніка Міколы Цудатворцы, арцыбіск. Мірлікійскага
7. Сьвятаначальніка Амбражэя, арцыбіск. Мілянскага
8. Пачэснага Патапа
9. Зачацьце сьвятое Ганны, маці Багародзіцы
10. Мучанікаў Міны, Гермагена і Яўграфа
11. Пачэснага Данілы Стоўпніка
12. Сьвятаначальніка Сьпірыдона цудатворцы, біск. Трымітунцкага
13. Мучанікаў Яўстрата, Аксёна, Яўгена, Мардарыя і Арэста; мучаніцы Лукіі

14. Мучанікаў Тырса, Ляўка, Калініка, Філімона і Апалона
15. Сьвятамучаніка Аліфера, біск. Ілірыйскага
16. Прарока Агея
17. Прарока Данілы і трох юнакоў Ананіі, Азара і Місаэля
18. Мучаніка Сэбасьцяна і іншых, з ім разам пацярпелых
19. Мучаніка Баніфацыя
20. Перадсьвяцьце Нараджэньня Хрыстовага; сьвятамучаніка Ігната Баганосца, біск.
21. Мучаніцы Ульляны і іншых мучанікаў Нікамідыйскіх
22. Вялікамучаніцы Анастасьсі
23. 10-ці мучанікаў Крыцкіх
24. Чаканьне Нараджэньня Хрыстовага; пачэснамучаніцы Аўгіні
**25. Нараджэньне Госпада нашага Ісуса Хрыста**
26. Сабор Найсьвяцейшае Багародзіцы; сьвятамучаніка Аўхіма, біск. Сардыйскага
27. Першамучаніка дыякана Сьцяпана; пачэснага Тодара Пазначанага, вызнаўцы
28. 2 тыс. мучанікаў Нікамідыйскіх
29. Мучанікаў-немаўлятаў, у Бэтлееме праз Ірада забітых; пачэснага Маркела
30. Мучаніцы Анісьсі; сьвятамучаніка Зоціка, кармільца сіротаў
31. Адданьне сьвята Нараджэньня Хрыстовага; пачэснае Маланьні Рымлянкі

У нядзелю пасьля Калядаў успамін праведнага Язэпа, цара Давіда і Якуба, брата Господняга.

## Студзень

1. Абрэзаньне Господняе; сьвятаначальніка Базыля Вялікага, арцыбіск. Кесарыі Кападакійскай
2. Перадсьвяцьце Богазьяўленьня; сьвятаначальніка Сыльвэстра, папы Рымскага
3. Прарока Малахіі, мучаніка Гардзея
4. Сабор 70-ці апосталаў, пачэснага Тэактыста
5. Чаканьне Богазьяўленьня; мучанікаў Тэапэмпта і Тэоны; пачэснае Сынклітыкі Александрыйскай
6. **Богазьяўленьне Збаўцы нашага Ісуса Хрыста**
7. Сабор сьв. Яна, Прадвесьніка і Хрысьціцеля
8. Пачэснага Юр'я Хазэвіта; пачэснае  Дамінікі
9. Мучаніка Паліеўкта
10. Сьвятаначальніка Рыгора, біск. Ніскага; пачэсных Маркіяна празьбітара і Даміцыяна, біск. Мелітэнскага
11. Пачэснага Хвядоса Вялікага
12. Мучаніцы Тацяны
13. Мучанікаў Ярміла і Стратоніка
14. Адданьне сьвята Богазьяўленьня; пачэсных айцоў, у Сінаі і Раіце забітых
15. Пачэсных Паўла Табэйскага і Яна Буданьніка
16. Пакланеньне кайданам апостала Пятра
17. Пачэснага Антона Вялікага
18. Сьвятаначальнікаў Апанаса і Кірылы, біскупаў Александрыйскіх
19. Пачэснага Макара Ягіпецкага
20. Пачэснага Аўхіма Вялікага
21. Пачэснага Максіма вызнаўцы, мучаніка Нэафіта
22. Апостала Цімафея; пачэснамучаніка Анастаса Пэрсіяніна
23. Сьвятамучаніка Клімэнта, біск. Анкірскага і мучаніка Агатангела

24. Пачэснае Аксіньні
25. Сьвятаначальніка Рыгора Багаслова, арцыбіск. Канстантынопальскага
26. Пачэснага Ксенафонта і жонкі яго Марыі
27. Перанясеньне мошчаў сьвятаначальніка Яна Залатавуснага
28. Пачэснага Ахрэма Сірына
29. Перанясеньне мошчаў сьвятамучаніка Ігната Баганосца, біск.
30. Трох сьвятаначальнікаў: Базыля Вялікага, Рыгора Багаслова і Яна Залатавуснага; сьвятамучаніка Іпаліта Рымскага
31. Мучанікаў Кіра і Яна, бескарысьлівых лекараў і цудатворцаў

## Люты

1. Перадсьвяцьце Сустрэчы Госпада нашага Ісуса Хрыста; мучаніка Трыфана
**2. Сустрэча Госпада нашага Ісуса Хрыста**
3. Праведных Сямёна Богапрыемцы і Ганны Прарочыцы
4. Пачэснага Сідара Пэлусіёта
5. Мучаніцы Агаты
6. Пачэснага Вакулы, біскупа Сьмірнскага
7. Пачэснага Партэна, біскупа Лямпсакійскага
8. Вялікамучаніка Тодара Страцілата; прарока Захара
9. Адданьне сьвята Сустрэчы; мучаніка Нічыпара
10. Мучаніка Харалампа
11. Сьвятамучаніка Ўласа, біскупа Сэбастыйскага
12. Сьвятога Мялеція, арцыбіскупа Антыяхійскага
13. Пачэснага Мартыніяна

14. Перастаўленьне пачэснага Кірылы, настаўніка славянаў
15. Анісіма, апостала з 70-ці
16. Мучанікаў Панфіла, Валента, Паўла, Парфіра, Сялеўка і іншых
17. Вялікамучаніка Тодара Тырона
18. Сьвятаначальніка Льва Вялікага, папы Рымскага
19. Архіпа, апостала з 70-ці
20. Пачэснага Льва, біскупа Катанскага
21. Пачэснага Цімафея; сьвятаначальніка Астапа, арцыбіскупа Антыяхійскага
22. Знаходка мошчаў мучанікаў у Яўгеніі
23. Сьвятамучаніка Палікарпа, біскупа Сьмірнскага
24. 1-я і 2-я знаходкі галавы Яна Хрысьціцеля
25. Сьвятаначальніка Тараса, арцыбіскупа Канстан-тынопальскага
26. Сьвятаначальніка Парфіра, біскупа Гаскага
27. Пачэснага Пракопа Дэкапаліта, вызнаўцы
28. Пачэснага Базыля, вызнаўцы
29. Пачэснага Касьяна Рымляніна

## Сакавік

1. Пачэснамучаніцы Аўдоцьці
2. Сьвятамучаніка Тэадота, біскупа Кірынэйскага
3. Мучанікаў Антропа, Клеаніка і Базыліска
4. Пачэснага Герасіма Ярданскага
5. Мучаніка Конана Ісаўрыйскага
6. 42-х мучанікаў Амарэйскіх
7. Ахрэма, Базыля, Яўгена і іншых сьвятамучанікаў, біскупаў Херсанэсу
8. Пачэснага Тэафілякта, біскупа Нікамедыйскага
9. 40-х мучанікаў Сэбастыйскіх

10. Мучаніка Кандрата і іншых
11. Сьвятаначальніка Сафрона, патрыярха Ерусалімскага
12. Пачэснага Тэафана Сігрыянскага, вызнаўцы; сьвятаначальніка Рыгора Вялікага, папы Рымскага
13. Перанясеньне мошчаў сьвятаначальніка Нічыпара, патрыярха Канстанцінопальскага
14. Пачэснага Бенэдыкта
15. Мучаніка Агапа і іншых
16. Мучанікаў Сабіна і Папы
17. Пачэснага Аляксея, чалавека Божага
18. Сьвятаначальніка Кірылы, арцыбіскупа Ерусалімскага
19. Мучанікаў Хрызанта і Дарыі
20. Пачэсных Яна, Сяргея, Патрыка і іншых, у лаўры сьв. Савы замучаных
21. Пачэснага Якуба вызнаўцы, біскупа Катанскага
22. Сьвятамучаніка Базыля, біскупа Анкірскага
23. Пачэснамучаніка Нікана і 199 вучняў ягоных
24. Перадсьвяцьце Дабравешчаньня; пачэснага Захара пустэльніка; сьвятога Арцямона, біскупа Сялеўкіі
**25. Дабравешчаньне Найсьвяцейшай Багародзіцы**
26. Адданьне сьвята Дабравешчаньня; Сабор арханёла Габрыэля
27. Мучаніцы Матроны Салунскай
28. Пачэсных Іларыёна Новага і Сьцяпана цудатворцы
29. Мучанікаў Марка, біскупа Арэтускага і Кірылы дыякана
30. Пачэснага Яна Лесьвічніка
31. Сьвятамучаніка Іпата, біскупа Гангрскага

## Красавік

1. Пачэснае Марыі Ягіпецкай
2. Пачэснага Ціта цудатворцы
3. Пачэснага Мікіты вызнаўцы, ігумена Мідзікійскага
4. Пачэснага Язэпа Песьняпісца, пачэснага Юр’я з Малеі
5. Мучанікаў Агатапода дыякана, Тэадула чытальніка і інш.
6. Сьвятаначальніка Мятода, арцыбіскупа Мараўскага, настаўніка славянаў
7. Пачэснага Юр’я, біск. Мелітэнскага, вызнаўцы
8. Апосталаў Ірадыёна, Агава, Асінкрыта, Руфа, Флягонта, Ерма і інш.; сьвятога Цэлестына, папы Рымскага
9. Мучаніка Яўпсіха
10. Мучанікаў Цярэнція, Помпа, Афрыкана, Максіма, Зянона, Аляксандра, Тодара і 33 інш.
11. Сьвятамучаніка Анціпы, біск. Пэргамскага
12. Пачэснага Базыля, біск. Парыйскага, вызнаўцы
13. Сьвятамучаніка Арцямона, біск. Ляодыкійскага
14. Сьвятаначальніка Мартына вызнаўцы, папы Рымскага
15. Апосталаў Арыстарха, Пуда і Трахіма з 70-ці
16. Мучаніц Агапы, Ірыны і Хіёніі
17. Сьвятамучаніка Сямёна, біск. Пэрсідзкага і інш.; сьвятаначальніка Агапіта, папы Рымскага
18. Пачэснага Яна, вучня сьв. Рыгора Дэкапаліта
19. Пачэснага Яна Старапячорніка
20. Пачэснага Тодара Трыхіны
21. Сьвятамучаніка Януара біскупа і інш.; мучаніка Тодара Пэргійскага і інш.
22. Пачэснага Тодара з Сікеі

23. Вялікамучаніка Юр’я Пераможцы
24. Мучаніка Савы Страцілата і інш. 70 вояў
25. Сьвятога апостала і евангеліста Марка
26. Сьвятамучаніка Базыля, біск. Амасійскага
27. Сьвятамучаніка Сямёна, біск. Ерусалімскага, сваяка Господняга
28. Сьвятаначальніка Кірылы, біск. Тураўскага
29. 9-ці мучанікаў Кізіцкіх
30. Сьвятога апостала Якуба Зэбэдэя

## Травень

1. Прарока Ярэмы
2. Сьвятаначальніка Апанаса Вялікага, арцыбіск. Александрыйскага
3. Пачэснага Хвядоса, ігумена Кіева-Пячэрскага
4. Мучаніцы Пелягеі Тарсійскай
5. Вялікамучаніцы Ірыны
6. Праведнага Ёва Шматпакутнага
7. Жыровіцкай іконы Маці Божай
8. Апостала і евангеліста Яна Багаслова
9. Перанясеньне ў Бары мошчаў сьвятаначальніка Міколы Мірлікійскага; сьв. прарока Ісаі; мучаніка Хрыстафора
10. Апостала Сымона Зілота
11. Сьвятых роўнаапостальных Кірылы і Мятода, настаўнікаў славянаў
12. Сьвятаначальніка Эпіфана, біск. Кіпрскага; сьвятаначальніка Германа, патр. Канстантынопальскага
13. Мучаніцы Луцэі і Ляўдыка, вартаўніка вязьніцы, з ей пацярпелага
14. Мучаніка Сідара

15. Пачэснага Пахома Вялікага
16. Пачэснага Тодара Асьвячонага
17. Апостала Андроніка і сьвятой Юніі
18. Мучаніка Тэадота Анкірскага і інш.
19. Сьвятамучаніка Патрыка, біск. Прускага і інш.
20. Мучанікаў Талалея, Аляксандра і Астэрыі
21. Сьвятых роўнаапостальных Канстантына і Алены
22. Мучаніка Базыліска
23. Пачэснае Еўфрасіньні Полацкай, асьветніцы Беларусі
24. Пачэснага Сямёна Дзіўнагорцы
25. 3-я знаходка галавы сьв. Яна Хрысьціцеля
26. Карпа і Аўпея, апосталаў з 70-ці
27. Сьвятамучаніка Тэрапонта, біск. Сардыйскага
28. Пачэснага Мікіты, біск. Халкідонскага, вызнаўцы
29. Мучаніцы Хвядосьсі
30. Пачэснага Ісака Далмацкага, вызнаўцы
31. Ермы, апостала з 70-ці; мучаніка Ерма

## Чэрвень

1. Мучаніка Юстына Філосафа і інш.
2. Сьвятаначальніка Нічыпара вызнаўцы, патр. Канстантынопальскага
3. Мучанікаў Лукіліяна, Клаўдзія, Іпата, Паўла, Дзяніса і Паўлы, дзевы
4. Сьвятаначальніка Мітрафана, патр. Канстантынопальскага
5. Сьвятамучаніка Даратэя, біск. Тырскага
6. Пачэснага Вісарыёна, Ягіпецкага цудатворцы і пачэснага Іларыёна Новага
7. Сьвятамучаніка Тэадота, біск. Анкірскага
8. Вялікамучаніка Тодара Страцілата

9. Сьвятаначальніка Кірылы, арцыбіск. Александрыйскага
10. Сьвятамучаніка Цімафея, біск. Прускага
11. Апосталаў Баўтрамея і Барнабы
12. Пачэснага Анупрэя Вялікага і пачэснага Пятра Афонскага
13. Мучаніцы Акуліны; сьвятаначальніка Трыхіля, біск. Ляўкусіі Кіпрскай
14. Прарока Алісея; сьвятаначальніка Мятода, патр. Канстантынопальскага
15. Прарока Амоса; сьв. Гераніма Стрыдонскага, празьбітара
16. Сьвятаначальніка Ціхана цудатворцы, біск. Аматунцкага
17. Мучанікаў Мануйлы, Савола, Ізмайлы
18. Мучанікаў Лявона, Іпата і Тэадула
19. Апостала Юды, сваяка Господняга
20. Сьвятамучаніка Мятода, біск. Патарскага
21. Мучаніка Ульляна Тарсійскага
22. Сьвятамучаніка Яўсея, біск. Самасацкага
23. Мучаніцы Агрыпіны
24. Нараджэньне сьв. Яна, Прадвесьніка і Хрысьціцеля Господняга
25. Пачэснамучаніцы Хаўроньні
26. Пачэснага Давіда Салунскага
27. Пачэснага Мартына Тураўскага, пачэснага Самсона
28. Перанясеньне мошчаў мучанікаў Кіра і Яна, бескарысьлівых лекараў і цудатворцаў
29. Сьвятых і годных пахвалы апосталаў Пятра і Паўла
30. Сабор 12-ці апосталаў

## Ліпень

1. Кузьмы і Дзямяна, бескарысьлівых лекараў, у Рыме пацярпелых
2. Пакладаньне рызы Найсьвяцейшай Багародзіцы ў Бляхэрне
3. Мучаніка Гіяцынта
4. Сьвятаначальніка Андрэя, арцыбіск. Крыцкага; пачэснае Марты, маці Сямена Дзіўнагорцы
5. Пачэснага Апанаса Афонскага
6. Пачэснага Сысоя Вялікага
7. Пачэснага Тамаша; пачэснага Акакія
8. Вялікамучаніка Пракопа
9. Сьвятамучаніка Панкрата, біск. Таўрамэнійскага
10. Пачэснага Антона Кіева-Пячэрскага; 45 мучанікаў з Нікопаля
11. Цуд вялікамучаніцы Яўхіміі
12. Мучанікаў Прокла і Гілярыя; пачэснага Міхала з Малеі
13. Сабор сьв. арханёла Габрыэля; пачэснага Сьцяпана Саваіта
14. Акілы, апостала з 70-ці
15. Мучанікаў Кірыка і Юліты
16. Сьвятамучаніка Атэнагена, біск. і 10-ці ягоных вучняў
17. Вялікамучаніцы Марыны
18. Мучанікаў Гіяцынта Амастрыдзкага і Амільляна
19. Пачэснае Макрыны, сястры сьв. Базыля Вялікага
20. Прарока Ільлі
21. Пачэсных Сямена і Яна; прарока Езэкіэля
22. Сьвятой роўнаапостальнай Марыі Магдалены
23. Мучанікаў Трахіма, Тэафіла і 13 інш.
24. Мучанікаў Барыса і Глеба; мучаніцы Хрысьціны

25. Усьпеньне сьв. Ганны, маці Найсьвяцейшае Багародзіцы
26. Мучанікаў Ермалая, Ярміпа і Ермакрата, сьвятароў Нікамідыйскіх; пачэснамучаніцы Параскевы
27. Вялікамучаніка Панцеляймона лекара
28. Прохара, Ніканора, Цімана і Пармэна, апосталаў з 70-ці
29. Мучаніка Калініка
30. Сілы, Сільвана, Крэсцэнта, Епанэта і Андроніка, апосталаў з 70-ці; праведнага Яна Воя, вызнаўцы
31. Перадсьвяцьце Працэсіі Пачэснага Крыжа Господняга, праведнага Еўдакіма Кападакійскага

## Жнівень

1. Працэсія Пачэснага Крыжа Господняга; сямі мучанікаў Макабэяў; пачатак Усьпенскага посту
2. Перанясеньне мошчаў першамучаніка архідыякана Сьцяпана; сьвятамучаніка Сьцяпана, папы Рымскага
3. Пачэсных Ісака, Доўмата і Фаўста
4. 7-мі мучанікаў юнакоў Эфескіх; пачэснамучаніцы Аўдоцьці; мучаніка Аліфера
5. Перадсьвяцьце Перамяненьня; мучаніка Яўсігнея
**6. Перамяненьне Госпада Бога і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста**
7. Пачэснамучаніка Дамэцыя і двух вучняў ягоных
8. Сьвятаначальніка Амільляна вызнаўцы, біск. Кізіцкага
9. Апостала Мацея
10. Мучанікаў Лаўрэна дыякана; Сікста, папы Рымскага, Фэліцыссіма і Агапіта дыяканаў, Рамана
11. Мучаніка дыякана Еўпла
12. Мучанікаў Фацея, Анікіты і многіх, з імі пацярпелых

13. Адданьне сьвята Перамяненьня; перанясеньне мошчаў пачэснага Максіма Вызнаўцы
14. Перадсьвяцьце Ўсьпеньня; прарока Міхея
**15. Усьпеньне Найсьвяцейшай Багародзіцы**
16. Нерукатворнага вобразу Госпада нашага Ісуса Хрыста
17. Мучаніка Мірона
18. Мучанікаў Флора і Лаўра
19. Мучаніка Андрэя Страцілата
20. Прарока Самуэля
21. Юды Тадэя, апостала з 70-ці; пачэснага Аўрама Смаленскага
22. Мучанікаў Агапоніка, Зоціка, Тэапрэпа, Акіндына, Севярына і інш.
23. Адданьне сьвята Ўсьпеньня; мучаніка Люпа; сьвятамучаніка Ірынэя, біск. Ліёнскага
24. Сьвятамучаніка Яўтыха біск., вучня апостала Яна Багаслова
25. Перанясеньне мошчаў апостала Баўтрамея; Ціта, апостала з 70-ці, біск. Крыцкага
26. Мучанікаў Адрыяна і Натальлі
27. Пачэснага Пімена; сьвятаначальніка Лібэрыя, папы Рымскага, вызнаўцы
28. Пачэснага Майсея Мурына
29. Адсячэньне галавы сьв. Яна, Прадвесьніка і Хрысьціцеля
30. Сьвятаначальнікаў Аляксандра, Яна і Паўла Новага, патрыярхаў Канстантынопальскіх
31. Пакладаньне пачэснага поясу Найсьвяцейшай Багародзіцы; сьвятамучаніка Кіпрыяна, біскупа Карфагенскага

# Зьмест

Пачатковыя малітвы і апрананьне................................5
Праскамідыя................................................................11
Літургія сьв. Яна Залатавуснага................................23
Водпусты на кожны дзень тыдня................................90
Малітвы, якія гаворыць сьвятар, калі здымае
сьвятую вопратку.............................................91
Малітвы пасьля прычасьця........................................94
Асаблівасьці Літургіі:
- у некаторыя сьвяты Гасподнія.........................97
- у Вялікдзень і Сьветлы Тыдзень..................102
- ад нядзелі Тамаша да Ўзьнясеньня.............105
Літургія сьв. Базыля Вялікага..................................107
Малітвы, якія гаворыць сьвятар, калі здымае
сьвятую вопратку...........................................173
Асаблівасьці Літургіі ў некаторыя сьвяты...............176
Літургія раней асьвячаных дароў............................179
Пракімены і алілуя нядзельныя васьмі тонаў........238
Пракімены, алілуя і прычасьнікі на кожны
дзень тыдня.....................................................241
Пракімены, алілуя і прычасьнікі
агульныя сьвятым..........................................244
Служба за памерлых................................................251
Служба на ўсякую патрэбу.........................................251
Месяцаслоў...............................................................253

На славу Божую
і дзеля карысьці верных
Беларускае грэка-каталіцкай Царквы над выданьнем
гэтае кнігі службаў Боскіх Літургіяў працавалі Сяргей
Стасевіч і Аляксандар Трафіменка